Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 43 (2934)
27 кастрычніка 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г
Цана 8 кап.

ЛЕНІНСКАМУ КАМСАМОЛУ—60



СТУДЭНТЫ.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС

Да 61-гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі

1. Няхай жыве 61-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі!

2. Няхай жыве Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя — галоўная падзея XX стагоддзя, пачатак сусветна-гістарычнага павароту чалавецтва ад капіталізму да сацыялізму!

3. Няхай жыве марксізм-ленінізм — магутная ідэйная зброя працоўных усіх краін у барацьбе супраць імперыялізму, за перамогу сацыялізму і камунізму!

4. Няхай жыве ленінская Камуністычная партыя Савецкага Саюза — натхніцель і арганізатар перамаганоснай Кастрычніцкай рэвалюцыі, кіруючая і накіроўваючая сіла савецкага грамадства!

Няхай жыве вялікае непарушнае адзінства партыі і народа!

5. Няхай жыве ў вяках імя і справа Уладзіміра Ільіча Леніна — правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі, стваральніка і кіраўніка Камуністычнай партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы!

6. Гонар і слава вялікаму савецкаму народу — будаўніку камунізму, паслядоўнаму барацьбіту за мір ва ўсім свеце!

7. Няхай жыве гераічны рабочы клас Краіны Саветаў — вядучая сіла ў будаўніцтве камунізму!

8. Няхай жыве слаўнае калгаснае сялянства — актыўны будаўнік камунізму!

9. Няхай жыве савецкая народная інтэлігенцыя — актыўны будаўнік камунізму!

10. Няхай жыве непарушны саюз рабочага класа, калгаснага сялянства і народнай інтэлігенцыі! Няхай мацнее сацыяльна-палітычнае і ідэйнае адзінства савецкага грамадства!

11. Няхай жыве брацкая дружба і непахіснае адзінства ўсіх нацый і народнасцей нашай сацыялістычнай Радзімы!

12. Няхай жыве Савецкая Канстытуцыя — Асноўны Закон першай у свеце агульнанароднай сацыялістычнай дзяржавы!

13. Няхай жывуць Саветы народных дэпутатаў! Няхай шырыцца ўдзел рабочых, сялян, інтэлігенцыі ў кіраванні справамі дзяржавы і грамадства!

14. Няхай жыве сацыялістычная дэмакратыя, якая забяспечвае сапраўднае народаўладдзе і сацыяльную справядлівасць!

15. Працоўныя Савецкага Саюза! Змагайцеся за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, імкніцеся поўнасцю рэалізаваць магчымасці развітога сацыялізму!

16. Камуністы! Будзьце ў авангардзе ўсенароднай барацьбы за выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС, за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы!

17. Савецкія прафсаюзы! Шырэй разгортвайце сацыялістычнае спаборніцтва і рух за камуністычныя адносіны да працы!

Няхай жывуць савецкія прафсаюзы — школа кіравання, школа гаспадарання, школа камунізму!

18. Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі, выхоўвайце ў сабе высокую ідэйнасць! Вучыцеся жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму!

19. Няхай жыве Ленінскі камсамол — надзейны памочнік і баявы рэзерв Камуністычнай партыі, перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!

20. Няхай жывуць савецкія жанчыны — палымяныя патрыёткі, актыўныя будаўнікі камунізму! Гонар і слава жанчыне-маці, якая аддае цяпло свайго сэрца выхаванню дзяцей — дастойных грамадзян сацыялістычнай Радзімы!

21. Савецкія воіны! Нястомна ўдасканальвайце сваю баявую і палітычную падрыхтоўку, будзьце заўсёды гатовы да абароны Радзімы, вялікіх заваёў сацыялізму!

Няхай жывуць доблесныя Узброеныя Сілы СССР— надзейны вартавы мірнай працы савецкага народа, апора ўсеагульнага міру!

22. Працоўныя Савецкага Саюза! Змагайцеся за выкананне і перавыкананне плана 1978 года! Настойліва дабівайцеся найвышэйшай прадукцыйнасці працы, эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы!

23. Слава перадавікам і наватарам вытворчасці — сцяганосцам сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана дзесятай пяцігодкі, за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы!

24. Работнікі прамысловасці! Змагайцеся за далейшае развіццё і ўмацаванне індустрыяльнай магутнасці нашай Радзімы! Хутчэй уводзьце і эфектыўна выкарыстоўвайце вытворчыя магутнасці!

Шырэй дарогу новай тэхніцы, прагрэсіўнай тэхналогіі і перадавому вопыту!

25. Работнікі прамысловасці! Павялічвайце вытворчасць, паляпшайце якасць і асартымент тавараў народнага спажывання! Паўней задавальняйце растучыя патрэбнасці савецкіх людзей!

26. Работнікі будаўніцтва! Настойліва дабівайцеся своечасовага ўводу ў дзеянне вытворчых магутнасцей і аб'ектаў! Будуйце дабротна, эканамічна, на сучаснай тэхнічнай аснове!

27. Работнікі транспарту і сувязі! Усямерна паляпшайце абслугоўванне народнай гаспадаркі, эфектыўна выкарыстоўвайце транспарт, паўней задавальняйце запатрабаванні савецкіх людзей!

28. Працоўныя Савецкага Саюза! Змагайцеся за ажыццяўленне рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК КПСС, за ўсебаковае і дынамічнае развіццё сельскай гаспадаркі! Паскарайце тэмпы яе механізацыі і хімізацыі, меліярацыі зямель, развівайце спецыялізацыю і канцэнтрацыю вытворчасці!

29. Работнікі сельскай гаспадаркі! Павышайце эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці! Лепш выкарыстоўвайце зямлю, тэхніку, угнаенні, усе матэрыяльныя рэсурсы, дабівайцеся максімальнай аддачы з кожнага рубля ўкладанняў!

Змагайцеся за паспяховае правядзенне зімоўкі жывёлы, закладвайце трывалую аснову высокага ўраджаю будучага года!

30. Гонар і слава працаўнікам вёскі, якія забяспечваюць самаадданай працай паспяховае выкананне і перавыкананне сацыялістычных абавязацельстваў па вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, мяса і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі!

31. Работнікі сельскай гаспадаркі, нарыхтоўчых, транспартных, перапрацоўчых, гандлёвых прадпрыемстваў і арганізацый! Настойліва дабівайцеся, каб кожны кілаграм прадукцыі палёў і ферм быў захаваны і выкарыстаны на карысць народа!

32. Работнікі гандлю, грамадскага харчавання, службы быту і жыллёва-камунальнай гаспадаркі! Змагайцеся за высокую культуру абслугоўвання савецкіх людзей!

33. Працоўныя Савецкага Саюза! Больш актыўна змагайцеся за павышэнне арганізаванасці, умацаванне парадку і дысцыпліны на кожным участку работы! Дабівайцеся эканоміі сыравіны, паліва, электраэнергіі, металу і іншых матэрыялаў!

34. Працоўныя Савецкага Саюза! Свята беражыце і прымнажайце сацыялістычную ўласнасць! Рацыянальна выкарыстоўвайце прыродныя багацці нашай Радзімы!

35. Работнікі народнай гаспадаркі! Настойліва павышайце сваё прафесіянальнае майстэрства, авалодвайце эканамічнымі ведамі, сучаснымі метадамі гаспадарання і кіравання!

36. Спецыялісты народнай гаспадаркі! Рацыяналізатары і вынаходнікі! Больш актыўна змагайцеся за найбольш поўнае выкарыстанне рэзерваў вытворчасці, за паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу!

37. Савецкія вучоныя! Павышайце эфектыўнасць навуковых даследаванняў, умацоўвайце сувязь навукі з вытворчасцю!

Слава савецкай навуцы!

38. Дзеячы літаратуры і мастацтва, работнікі культуры! Высока нясіце сцяг партыйнасці і народнасці савецкага мастацтва, стварайце творы, дастойныя нашай вялікай Радзімы!

39. Работнікі народнай асветы! Павышайце эфектыўнасць і якасць навучання! Выхоўвайце падрастаючае пакаленне ў духу камунізму, савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, свядомых адносін да вучобы і працы!

40. Работнікі аховы здароўя! Усямерна павышайце якасць і культуру медыцынскага абслугоўвання насельніцтва! Больш актыўна ўкараняйце ў практыку навейшыя дасягненні медыцынскай навукі!

41. Работнікі фізкультуры і спорту, спартсмены і спартсменкі! Больш актыўна ўкараняйце фізічную культуру ў штодзённае жыццё савецкіх людзей, шырэй разгортвайце падрыхтоўку да Маскоўскай Алімпіяды-80!

42. Ветэраны рэвалюцыі, вайны і працы! Настаўнікі моладзі! Актыўна ўдзельнічайце ў выхаванні маладога пакалення на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа!

43. Піянеры і школьнікі! Горача любіце Савецкую Радзіму, настойліва авалодвайце ведамі і працоўнымі навыкамі! Рыхтуйцеся стаць актыўнымі барацьбітамі за справу Леніна, за камунізм!

44. Брацкае прывітанне камуністычным і рабочым партыям — стойкім барацьбітам супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю, нацыянальную незалежнасць і сацыялізм!

Няхай мацнеюць адзінства і згуртаванасць камуністаў усяго свету на непахіснай аснове марксізму-ленінізму, пралетарскага інтэрнацыяналізму!

45. Няхай жыве пралетарскі інтэрнацыяналізм — выпрабаваная і магутная зброя міжнароднага рабочага класа!

46. Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

47. Брацкае прывітанне народам сацыялістычных краін! Няхай развіваецца і мацнее сусветная сістэма сацыялізму — рашаючая сіла антыімперыялістычнай барацьбы, апора міру, дэмакратыі і сацыяльнага прагрэсу!

48. Няхай жыве адзінства і згуртаванасць камуністычных партый і народаў краін сацыялістычнай садружнасці!

49. Брацкае прывітанне гераічнаму в'етнамскаму народу, які цвёрда адстайвае свой нацыянальны суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць, свабоду і незалежнасць!

Няхай мацнее і працвітае Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам — важны фарпост сіл міру і сацыялізму ў Паўднёва-Усходняй Азіі!

50. Брацкае прывітанне мужнаму лаоскаму народу! Няхай мацнее і працвітае Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка, якая стала на шлях будаўніцтва сацыялістычнага грамадства!

51. Брацкае прывітанне рабочаму класу капіталістычных краін — самаадданаму барацьбіту супраць эксплуатацыі, засілля манаполій, за правы працоўных, за мір, дэмакратыю і сацыялізм!

52. Брацкае прывітанне народам, якія дабіліся вызвалення ад каланіяльнага ярма і вядуць мужную барацьбу за ўмацаванне нацыянальнай незалежнасці і сацыяльны прагрэс!

53. Гарачае прывітанне народам Афрыкі, якія змагаюцца супраць імперыялізму, расізму і неакаланіялізму, за свабоду, нацыянальную незалежнасць і сацыяльны прагрэс!

Народы свету! Узмацняйце падтрымку барацьбы народаў Зімбабве, Намібіі, Паўднёвай Афрыкі за поўную ліквідацыю расісцкіх рэжымаў!

54. Гарачае прывітанне народам Лацінскай Амерыкі, якія вядуць мужную барацьбу супраць прыгнёту імперыялістычных манаполій, супраць рэакцыі і фашызму, за свабоднае, незалежнае, дэмакратычнае развіццё сваіх краін!

55. Няхай мацнее магутны неадольны саюз трох асноўных рэвалюцыйных сіл сучаснасці — сусветнага сацыялізму, міжнароднага пралетарыяту і нацыянальна-вызваленчага руху!

56. Брацкае прывітанне пакутуючым у турмах і фашысцкіх засценках мужным барацьбітам за свабоду народаў, дэмакратыю і сацыялізм!

Свабоду вязням імперыялізму і рэакцыі!

57. Брацкае прывітанне рабочаму класу, усім працоўным і дэмакратам Чылі, якія вядуць мужную барацьбу супраць фашысцкай рэакцыі!

Народы свету! Умацоўвайце салідарнасць з патрыётамі Чылі!

Свабоду вязням фашысцкай хунты!

58. Народы свету! Памнажайце намаганні ў барацьбе за поўную ліквідацыю вынікаў ізраільскай агрэсіі, за ўсталяванне справядлівага і трывалага міру для ўсіх дзяржаў і народаў Блізкага Усходу, супраць імперыялістычнага ўмяшання ва ўнутраныя справы арабскіх краін!

Няхай мацнеюць і развіваюцца дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і арабскіх краін!

59. Народы еўрапейскіх краін! Настойліва дабівайцеся поўнага ажыццяўлення Заключнага акта агульнаеўрапейскай нарады, ператварэння Еўропы ў кантынент міру, бяспекі, супрацоўніцтва і сацыяльнага прагрэсу!

60. Народы азіяцкіх краін! Змагайцеся за ўмацаванне міру, супрацоўніцтва і добрасуседскія адносіны, за забеспячэнне бяспекі ў Азіі!

61. Народы свету! Узмацняйце барацьбу за ліквідацыю пагрозы новай сусветнай вайны, за паглыбленне разрадкі міжнароднай напружанасці! Выкрывайце падкопы сіл рэакцыі і агрэсіі, мілітарызму і рэваншызму — ворагаў міру і бяспекі народаў!

62. Народы свету! Дабівайцеся, каб непрымяненне сілы стала законам у міжнародных адносінах, а ядзерная зброя была забаронена навечна! Больш актыўна змагайцеся за спыненне небяспечнай для свету гонкі ўзбраенняў, за пераход да раззбраення!

63. Народы свету! Патрабуйце забароны распрацоўкі і вытворчасці новых відаў і сістэм зброі масавага знішчэння! Рашуча выступайце супраць планаў вытворчасці нейтроннай бомбы!

64. Няхай жыве міралюбівая ленінская знешняя палітыка Савецкага Саюза!

Няхай поўнасцю ажыццёвіцца выпрацаваная XXV з'ездам КПСС праграма далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў!

65. Няхай жыве наша вялікая Радзіма — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

66. Пад сцягам марксізму-ленінізму, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад, да новых перамог у будаўніцтве камунізму!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

Пятрусь БРОЎКА

Магіла невядомага партызана

Гамоніць сям'я бяроз,
Гамоніць
І сінь нябёс,
Гамоняць дубы і клён,
Як тут супыніўся
Ён.

Бачыў хмызняк густы,
Бачылі
Ягад кусты,
Як у вайну партызан —
Тут паміраў
Ад ран.

Выканаў ён наказ,
Здзейсніў
Заданне ў час,
Выканаў так, як звык —
Паў пад адхон
Цягнік.

Як адпаўзаў адтуль,
Трапіў
Пад град ён куль,
Шмат ён згубіў крыві,
Думка ж казала,
— Жыві!

Толькі ўжо чэзнуў зрок,
Міг —
І навечна змоўк...
Дарма чакаў атрад —
Ён не прыйшоў
Назад.

Лес яго ўзяў на схоў,
Коўдрай прыкрыў
Лістоў.
Вецер спяваў — ён наш!
Граючы
Жальбы марш.

Высветліў кветак жар,
Росы абмылі
Твар,
Гоман жа, гоман хвой
Кажа, што ён —
Герой!

Рыгор БАРАДУЛІН

Да паходжання танца

Навошта крык,
Навошта свіст,
Навошта ўсё на суд несці.
Ён—камсамольскі танец
Твіст
Па непаседнай сутнасці.

Пасля дажджу, як бутэрброд,
Стэп:
Чарназём намазаны
На дол.
Шукай абход ці брод.
Буксуюць нервы МАЗамі.

З такоў ішлі,
Зямлі ўпаўне
Надзелы неслі ладныя —
На кожнае падэшвіне
Не менш як па Галандыі!

Перад сталоўкай нашай
Рас-
таптанымі памерамі
Сваіх кірзовікаў
Не раз
Абцас
На грук праверылі.

Звон лыжак нам гучаў,
Як джаз.
Падэшвы з выкрунтасамі
Мы церлі,
Бо за стол у час
Уціснуцца — не так сабе!

Не адчышчалася зямля
Укамянела-гучная.
Як высветлілася пасля —
Мы гэта
Твіст развучвалі.

Хай ходзіць хмуры мараліст
За пазухай з цаглінаю.
Ён—камсамольскі танец
Твіст
Паходжання цалінага!

ЗАПАВЕТАМ ЛЕНІНА ВЕРНЫЯ

Савецкі народ, яго слаўная моладзь урачыста адзначаюць радаснае свята камсамоліі — 60-годдзе ВЛКСМ.

У Мінску 25 кастрычніка адбылося сумеснае ўрачыстае пасяджэнне ЦК ЛКСМ Беларусі, мінскіх абкома і гаркома камсамола, прысвечанае 60-годдзю ВЛКСМ. У па-святочнаму ўпрыгожаны акруговы Дом афіцэраў прыйшлі члены і кандыдаты ў члены ЦК ЛКСМБ, члены рэвізійнай камісіі ЛКСМБ, ветэраны вайны і працы, члены мінскіх абкома і гаркома камсамола, важакі працоўных камсамольска-маладзёжных калектываў, маладыя перадавікі і наватары вытворчасці, героі бітвы за ўраджай трэцяга года пяцігодкі, прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў, грамадскасці горада-героя, воіны Савецкай Арміі, дзеячы навукі і мастацтва, студэнты і школьнікі.

Цёпла сустракаюць прысутныя з'яўленне ў прэзідыуме таварышаў І. Я. Палякова, Ц. Я. Кісялёва, А. Н. Аксёнава, М. М. Зайцава, Ю. Б. Колакалава, А. Т. Кузьміна, М. І. Лагіра, У. Ф. Міцкевіча, Я. П. Нікулкіна, М. Н. Полазава, В. С. Шавялухі, І. Ф. Якушава, К. М. Платонава, Н. Л. Сняжковай.

З вялікім уздымам удзельнікі ўрачыстага пасяджэння выбралі ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым.

Гарачымі апладысментамі бюро сустрэта прывітанне ЦК Кампартыі Беларусі камсамолу рэспублікі ў сувязі з 60-годдзем ВЛКСМ, якое зачытаў другі сакратар ЦК КПБ А. Н. Аксёнаў.

З дакладам «60 гадоў ВЛКСМ» выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў. Ён расказаў аб асноўных этапах гісторыі камсамола, выдатных працоўных справах юнакоў і дзяўчат, — сённяшняй камсамоліі рэспублікі.

Ад імя тых, хто стаяў ля вытокаў утварэння камсамола, хто здзяйсняў неўміручыя подзвігі на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узводзіў гіганты сацыялістычнай індустрыі і асвойваў новыя землі, да прысутных звярнуўся былы ўдзельнік падполля ў Заходняй Беларусі, сакратар Цэнтральнага Камітэта камсамола рэспублікі ў 1924 годзе М. С. Арэхва.

Перад удзельнікамі ўрачыстага пасяджэння выступілі рабочы Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт» В. Латушка, галоўны аграном калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна, член ЦК ВЛКСМ В. Гаўрыленка, паэтэса Я. Янішчыц. Яны гаварылі аб тым, з якімі дасягненнямі рабочы клас, калгаснае сялянства і творчая інтэлігенцыя рэспублікі прыйшлі да юбілею Ленінскага камсамола.

Прысутных віталі навучэнцы прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, воіны Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, прадстаўнікі студэнцкай і школьнай моладзі, піянеры.

Ад імя гасцей на ўрачыстым пасяджэнні выступіў намеснік начальніка аддзела па камсамольскай рабоце Палітупраўлення двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту І. Каменеў.

З вялікім натхненнем удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышу Л. І. Брэжневу.

Урачыстае пасяджэнне закончылася спяваннем партыйнага гімна «Інтэрнацыянал».

У заключэнне адбыўся святочны канцэрт.

БЕЛТА.

ВІНШУЕМ ЛАЎРЭАТАЎ!

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІЙ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА, ЖУРНАЛІСТЫКІ

Бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, разгледзеўшы прадстаўленні Камісіі ЦК ЛКСМБ па прэміях Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва і журналістыкі, пастанаўляе прысудзіць прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і прысвоіць ганаровае званне «Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі»:

1. **ЯНІШЧЫЦ Яўгеніі Іосіфаўне**, паэтэсе— за кнігу вершаў «Дзень вечаровы» (выд. «Мастацкая літаратура», 1974 г.)—аб маладым сучасніку—будаўніку камунізму.

ЖУКУ Аляксандру Аляксандравічу, пісьменніку—за кнігу прозы «Зоркі над палігонам» (выд. «Мастацкая літаратура», 1977 г.) — аб жыцці і баявой дзейнасці салдат і афіцэраў сучаснай Савецкай Арміі.

2. Брэсцкаму народнаму ансамблю танца **«РАДАСЦЬ»** (мастацкі кіраўнік—заслужаны работнік культуры БССР **А. ВАРАБ'ЁЎ**)—за развіццё самадзейнай мастацкай творчасці, канцэртныя праграмы 1976—1977 гг. і высокае выканаўчае майстэрства.

АНСАМБЛЮ песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі (мастацкі кіраўнік—народны артыст УзССР **В. СМЫСЛОЎ**)— за вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму і эстэтычнаму выхаванню моладзі.

3. **МАЗЫНСКАМУ Валерыю Яўгенавічу**, галоўнаму рэжысёру Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатра імя Я. Коласа — за пастаноўку, **ШУЛЬГУ Сяргею Мікалаевічу**, акцёру—за выкананне галоўнай ролі Сымона ў спектаклі «Сымон-музыка» Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатра імя Я. Коласа.

ІВАНОВУ Валерыю Кірылавічу, кампазітару—за стварэнне вакальна-сімфанічнай паэмы на вершы М. Танка «Элегія аб чацвёртай бярозе», песень аб камсамоле.

4. **НІКІФАРАВУ Вячаславу Аляксандравічу**, кінарэжысёру—за серыю кінастужак аб моладзі («Зімародак»—кінастудыя «Беларусьфільм», 1972 г.; «Хлеб пахне порахам»—кінастудыя «Беларусьфільм», 1974 г.; «Сын старшыні»—кінастудыя «Беларусьфільм», 1975 г.).

РУБІНЧЫКУ Валерыю Давідавічу, рэжысёру-пастаноўшчыку, **ЛОГІНАВАЙ Таццяне Дзмітрыеўне**, аператару-пастаноўшчыку, **ЧАРТОВІЧУ Аляксандру Іванавічу**, мастаку-пастаноўшчыку—за паэтычнае адлюстраванне тэмы ўдзелу юных патрыётаў у Вялікай Айчыннай вайне ў мастацкім фільме «Вянок санетаў» (кінастудыя «Беларусьфільм», 1976 г.).

5. **СЛУШНІКУ Васілю Уладзіміравічу, ЧАЙКА Ніне Цімафееўне, САДОЎСКАМУ Івану Іосіфавічу**, радыёжурналістам Галоўнай рэдакцыі вяшчання для моладзі Беларускага радыё—за стварэнне цыкла радыёперадач «Пульс БАМа» аб працоўных подзвігах будаўнікоў Байкала-Амурскай магістралі.

ГАЛОЎНЫ ПРЫЗ — БЕЛАРУСКАЙ СТУДЫІ

Нядаўна ў сталіцы Кузбаса Кемераве адбыўся фестываль тэлевізійных спектакляў, прысвечаны першай гадавіне Канстытуцыі СССР. Дванаццаць тэлестудый краіны прадставілі спектаклі, якія былі зроблены па творах нацыянальных драматургаў і аўтараў з братніх рэспублік.

Журы, якое ўзначальваў Герой Сацыялістычнай Працы шахцёр Г. П. Драздзецкі і ў склад якога ўваходзілі вядомыя крытыкі, пісьменнікі, мастакі, журналісты і акцёры, адзначыла галоўным прызам фестывалю спектакль Беларускай студыі тэлебачання «Крыло цішыні» паводле аповесці Янкі Сіпакова. Спецыяльнымі дыпломамі фестывалю ўзнагароджаны таксама аўтары інсцэніроўкі — Ванкарэм Нікіфаровіч і Уладзімір Забела, мастак Алена Шнаева за лепшае мастацкае афармленне спектакля.

В. САВІНА.

«ЁСЦЬ НА СВЕЦЕ МОЙ АЛЕНЬ...»

Выступае «гаспадар» паэтычнай пятніцы Аляксей Пысін. Фота У. КРУКА.

Нямала харошых сустрэч адбылося ў беларускага чытача ў юбілейным для рэспублікі і яе Камуністычнай партыі годзе з новымі важкімі набыткамі паэтычнага слова. Зборнікі, пазначаныя 1978-ым, шчодрыя на вершы глыбокіх пачуццяў і думак. «Абсяг» Рыгора Барадуліна, «Варта вернасці» Генадзя Бураўкіна, «Вышыні святла» Васіля Віткі, «Матчына жыта» Міколы Арочкі, «Альфа» Веры Вярбы, «Водсветы» Сцяпана Гаўрусёва, «Поле» Петруся Макаля, «Ясельда» Яўгеніі Янішчыц і многія іншыя зборнікі займелі гонар выйсці на перад'юбілейную паверку нашай паэзіі, яскрава даказаць, што не слабне яе сілавое поле.

А нядаўна паэтычная гасцёўня Дома літаратара сабрала прыхільнікаў таленту лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР паэта Аляксея Пысіна. Яшчэ не страцілі пах друкарскай фарбы старонкі новай кнігі Пысіна, любоўна выдадзенай выдавецтвам «Мастацкая літаратура». «Ёсць на свеце мой алень...» — радок з аднайменнага верша, поўнага трывогі за дзень будучы, даў назву кнізе — назву ўсхваляванаму паэтычнаму свету, які захапляе, паланіць, вабіць.

Ёсць на свеце мой алень,
Ёсць і гэткае маленне:
Вудзь заўсёды у аленя,
Цёмны мох і светлы дзень!
Вы, разумныя браты, —
Я і сам страляць умею —
Дайце жыць майму аленю
Пад галінкай дабраты...

У свеце, поўным трывог, жыве алень паэта — сумленне, боль, памяць. І гэтыя спалахі нараджаюць вершы вялікай любові і нянавісці. Паэзія Пысіна — жыццесцвярджальная. Яна не для сентыментальных чуллівых струн. Яна памнажае набыткі дабра ў чалавечых душах адкрытай, бескампраміснай праўдай. А пра такую паэзію кажуць, што служыць яна і розуму і сэрцу.

Выразная, акрэсленая пазіцыя паэта. Ён у адказе за лёс цэлай планеты, і таму ў голасе яго частая перасцярога:

Толькі б, толькі не
землетрасенне,
Што рыхтуюць людзям
людзі самі.

І чуючы гэтае, становіцца зразумелым, набывае самую чалавечную вагу і сілу яго жыццелюбівы заклік:

Ў істоце той, якою быць
не выпала,
Сябе адчуй хоць зрэдку,
чалавек!

Падзяліцца сваімі думкамі аб новай кнізе Аляксея Пысіна ў гасцёўню Дома літаратара прыйшлі Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Аляксей Зарыцкі, Станіслаў Шушкевіч, Таіса Бондар, Раіса Баравікова, Уладзімір Някляеў, сакратары праўлення СП БССР Анатоль Вярцінскі і Барыс Сачанка. Вершы паэта з новага зборніка прачыталі артысты-купалаўцы.

ПАД СЦЯГАМ МАЛАДОСЦІ

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі

КАМУ НЕВЯДОМЫ гэтыя пульсуючыя радкі Эдуарда Багрыцкага:

Нас водила молодость
В сабельный поход.
Нас бросала молодость
На кронштадтский лёд.
Боевые лошади
Уносили нас,
На широкой площади
Убивали нас.
Но в крови горячечной
Подымались мы,
Но глаза незрячие
Открывали мы...

А іх было параўнаўча нямнога, самых першых камсамольцаў — усяго дваццаць дзве тысячы на маладую Савецкую краіну. Але гэтыя дваццаць дзве тысячы былі сапраўднымі байцамі рэвалюцыі, адухоўленыя вялікімі ідэямі абнаўлення свету. Рукі іх трымалі разам з вінтоўкай рыдлёўку і кнігу, кельму і пяро. Яшчэ не раз дакументальныя кадры высвятляць нам, маладым будаўнікам дваццатага веку, вось такія плакаты: «Ты запісаўся добраахвотнікам?», «Райком зачынены. Усе пайшлі на фронт». Дзе толькі ні насіў парывісты вецер грамадзянскай нашу валявую маладосць! Яе подзвігі памятаюць шырокія стэпы Украіны, берагі ціхага Дона, пушчы і бальшакі Беларусі, суровыя снягі Сібіры, халодныя воды Урала. У адчайных і мужных баях рос і загартоўваўся камсамол. І жывуць у нашых сэрцах Мікалай Астроўскі і Уладзімір Азін, Віталій Банівур і Таццяна Саламаха...

Не менш мужным выпрабаваннем на экзамен стойкасці нашай слаўнай моладзі былі гады першых пяцігодак. А гарады, заводы, электранстанцыі, камбінаты, узнятыя на былой пустэчы, гавораць самі за сябе: Кузнецк і Магнітка, Днепрагэс і Камсамольск-на-Амуры.

Не лягчэй даводзілася юным паплечнікам камуністаў у вёсцы, дзе пачынаўся вялікі і карэнны пералом у жыцці селяніна. Якой жа неадольнай сілай трэба было валодаць вясковаму хлопцу, каб выступіць супроць прыватнай уласнасці, супроць кулакоў, першым запісацца ў калгас ці вывесці на поле трактар. Гэта аб іх з захапленнем пісаў Максім Горкі: «Я бачыў гэтую моладзь на месцы дзеяння ў 1928 годзе, калі сярод вялікага голага поля дзе-нідзе тырчалі жалезныя шкілеты будучага гіганта, які ствараўся энергіяй гэтай моладзі... Думалася, што, відаць, не хопіць жалеза, ды і сіл таксама не хопіць... Але вось — хапіла!..»

Хапіла такой жа, сапраўды жалезнай энергіі нашым камсамольцам і ў гады Вялікай Айчыннай, калі стаяла пытанне пра лёс усяго чалавецтва. Нават вораг здзіўляўся вялікай сіле волі камсамольцаў — байцоў, партызан і падпольшчыкаў Лізы Чайкінай, Мікалая Кедышкі, Міхаіла Сільніцкага, Аляксандра Матросава, Зоі Касмадзям'янскай, Ефрасінні Зяньковай... А подзвігі маладой гвардыі Краснадона, а мужнасць камсамольскіх падпольшчыкаў Обаля, Оршы, Гомеля, Віцебска, Хойнікаў!..

Праязджаючы пінскае Палессе, нельга абмінуць, напрыклад, вёску Плошчава. Тут, у глухой палескай вёсачцы, трыццаць пяць гадоў назад быў створаны і дзейнічаў Пінскі падпольны райком камсамола. Да восені 1943 года на тэрыторыі раёна помсцілі ворагу дваццаць шэсць падпольных і пяць антыфашысцкіх арганізацый. Колькі ж здзейснілі маладыя і гарачыя сэрцы, каб наблізіць жаданую Перамогу! Яны здабывалі звесткі пра варожыя засады, падрывалі фашысцкія эшалоны, танкі. Гэтыя хлопцы назаўсёды засталіся ляжаць тут у адной брацкай магіле:

Васіль Буката
Мікалай Янкавец
Яфім Уласюк
Аляксандр Колб
Піліп Туміловіч...

І кожнае імя — як выклік чорнай варожай навале! На сродкі камсамольцаў раёна ўзведзены на магіле абеліск. А колькі ж іх, незахаваных,— без магіл, без абеліскаў!..

Ды і ці не зараз славуты «Камсамольскі білет» Аркадзя Куляшова, напісаны ў 1943 годзе, загартоўвае самыя юныя характары, вучыць стойкасці і адданаму служэнню сваёй зямлі, сваёй Радзіме?!

У нялёгкія пасляваенныя гады савецкая моладзь паказала таксама прыклад самаадданага і працоўнага гераізму. Ці не ад Магніткі і Брацкай ГЭС, асваення цалінных зямель бяруць свой пачатак КамАЗ і БАМ?! Дружнымі і энергічнымі рукамі моладзі ўздымаліся нашы беларускія гарады Наваполацк і Салігорск, Белаазёрск і Светлагорск! Светлыя, новыя назвы ў гэтых гарадоў, як і само наша шчаслівае і рупнае жыццё.

Выступаючы на XVIII з'ездзе ВЛКСМ, Л. І. Брэжнеў сказаў: «У цэлым камуністы старэйшага пакалення могуць, я думаю, быць задаволены савецкай моладдзю нашых дзён... Мільёны юнакоў і дзяўчат паказваюць узоры мужнасці, стойкасці, вернасці ідэалам Кастрычніка. З вялікім энтузіязмам яны працуюць усюды, дзе праходзіць фронт камуністычнай будоўлі... Ва ўсякую справу яны ўносяць своеасаблівы рамантычны парыў і, я сказаў бы, маладую акрыленасць».

Кожнае пакаленне маладых ідзе сваім шляхам, выбірае свае нязведаныя дарогі і складае свае песні. Нам, маладым пісьменнікам, ёсць на каго раўняцца ў сваім жыцці, ёсць з каго браць прыклад нястомнай працавітасці, адданага служэння сваёй Радзіме і свайму народу. На гэты конт вельмі трапна сказаў калісьці Міхаіл Святлоў: «Глаза в глаза столкнулись поколенья и поздоровались, как старые друзья». Баявая маладосць нашых старэйшых пісьменнікаў упісана не толькі эпасам мастацкіх старонак у біяграфію Радзімы. Іх асабісты жыццёвы і грамадзянскі подзвіг дыктуе самаму маладому пакаленню гарачыя дарогі часу.

Ці не такой жа маладой энергіяй і пачуццём вялікай любві да свайго народа, запаветным ідэям партыі выкліканы творы найлепшых выхаванцаў камсамола, лаўрэатаў яго прэміі Алеся Савіцкага, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Васіля Зуёнка, Анатоля Грачанікава, Івана Навуменкі, Віктара Казько! Міма іх лёсу таксама не прайшлі вайна, цалінныя палаткі, першыя аб'екты новабудоўляў. Усё гэта па-сапраўднаму жыццёва адбілася ў творах. Нездарма ж у адным са сваіх вершаў Генадзь Бураўкін піша: «І марай свяшчэннаю самай у сэрцах надзея гарыць, што нас не ўпікнуць камісары —суровыя нашы сябры».

Пераемнасць найлепшых традыцый нашых ветэранаў, народных пісьменнікаў і паэтаў Беларусі Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Івана Шамякіна адчуваецца ў творах самага маладзейшага пісьменніцкага пакалення.

Хочацца асобна адзначыць, колькі нястомнай энергіі і свайго ўласнага вопыту аддаюць выхаванню маладзейшым таварышам па пяру паэты: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Я. Купалы Анатоль Вялюгін і Мікола Аўрамчык.

Пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю» яшчэ раз яскрава паказала, як клапоціцца пра нас партыя Леніна. І клопат гэты па-сяброўску падзяляе з ёй наш камсамол. Шматлікія дарогі па камандзіроўках Ленінскага камсамола ў самыя розныя куткі нашай неабсяжнай краіны нараджаюць і новыя творы. Так пісалася паэма Уладзіміра Някляева пра БАМ «Дарога дарог».

Гераічны і працоўны подзвіг нашага народа і нашага маладога сучасніка знойдзем у вершах і паэмах Казіміра Камейшы і Міколы Федзюковіча, Вольгі Іпатавай і Сяргея Законнікава, Таісы Бондар і Генадзя Пашкова, Алеся Разанава і Ніны Мацяш, Юркі Голуба і Раісы Баравіковай, Галіны Каржанеўскай і Паўла Марціновіча. Самыя маладыя, якія не зведалі чорнага пораху вайны, пішуць пра яе ў імя міру. Так з'явілася паэма Валянціны Коўтун «Чарацінка чакання».

Воблік маладога сучасніка, рысы яго характару знаходзім у апавяданнях Алеся Жука і Яўгена Лецкі, Васіля Гігевіча і Генрыха Далідовіча, Алеся Крыгі і Івана Шальманава. Бо варта толькі пільней прыгледзецца да жыцця —і адкрываюцца побач тэмы.

Наш малады камсамольскі сучаснік падобны і непадобны на сваіх папярэднікаў. Ён жыве ў больш шчаслівы час, калі партыя, Савецкая ўлада дала ўсе магчымасці для развіцця талентаў і здольнасцей, адкрыла ўсе дарогі для ажыццяўлення самых запаветных мар. Але з ранейшымі сваімі баявымі папярэднікамі нашу моладзь аб'ядноўвае нязгасны камсамольскі запал, вялікая сіла волі, спасціжэнне таемнай жыццёвай сутнасці, прага пазнання і адкрыцця, служэнне запаветам Леніна, Радзіме. Чарговы фестываль моладзі ў Гаване яшчэ раз прадэманстраваў сілу дэмакратыі і сацыялізму, упэўненую і нястомную рашучасць моладзі змагацца супраць імперыялізму і рэакцыі.

Выконваючы рашэнні XVIII з'езда ВЛКСМ, камсамол пабаявому выхоўвае падрастаючае пакаленне ў духу камуністычнай маралі. Ідэі камунізму служаць асновай духоўнага станаўлення моладзі. Малады сучаснік яскрава ўсведамляе, што камунізм — адзіны і верны шлях, на якім чалавек становіцца самым чалавечным.

Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі — 60. Ордэны Савецкага Саюза на пурпуровым сцягу Ленінскага камсамола яскрава гавораць аб тым, як высока ацанілі партыя, урад і народ баявы і працоўны ўклад савецкай моладзі ў вялікія дасягненні нашай Радзімы.

ЯГО ЖЫЦЦЁ—СЦЭНА

У гісторыі станаўлення і развіцця Беларускага нацыянальнага тэатра асаблівае месца займае шматгранная творчая дзейнасць Е. А. Міровіча. Ён стаяў ля калыскі Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, яго імя ўпісана ў біяграфію Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, Гомельскага абласнога тэатра і іншых калектываў.

Значны ўклад вядомага майстра сцэны ў беларускую драматургію. Ён аўтар многіх папулярных п'ес, сярод якіх вылучаюцца «Машэка», «Кастусь Каліноўскі», «Кар'ера таварыша Брызгаліна», «Перамога», «Запяюць верацёны» і іншыя. У яго ж выдатнай рэжысёрскай інтэрпрэтацыі яны сталі з'явай у культурным жыцці рэспублікі, прыкладам сапраўднага сцэнічнага майстэрства.

Аб творчай спадчыне вялікага майстра, аб яго запаветах, якія свята берагуць і выконваюць шматлікія вучні, ішла хвалюючая размова на ўрачыстым вечары, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння Е. А. Міровіча.

Намеснік міністра культуры БССР М. П. Шаўчук у сваім выступленні падкрэсліў непераходзячае значэнне творчасці таленавітага драматурга і рэжысёра, створанай ім сцэнічнай школы для сённяшніх маладых майстроў.

Аб творчым шляху аднаго з заснавальнікаў беларускага тэатральнага мастацтва гаварыў кандыдат мастацтвазнаўства С. А. Пятровіч. Аб сваіх сустрэчах з Е. А. Міровічам, аб сумеснай рабоце з ім у тэатры расказаў народны артыст СССР Л. Р. Рахленка.

Цёпла прынялі ўдзельнікі вечара спектакль «Графіня Эльвіра» па п'есе Е. Міровіча ў пастаноўцы калектыву народнага тэатра Палаца культуры Мінскага трактарнага завода.

На вечары прысутнічаў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

БЕЛТА.

ВЕЧАР І. ХАРЫКА

У Доме літаратара адбыўся вечар паэзіі, прысвечаны творчасці яўрэйскага паэта Ізі Харыка. Адкрыў вечар сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Анатоль Вярцінскі. Пра жыццёвы і творчы шлях Ізі Харыка расказаў прысутным вядомы беларускі крытык Рыгор Бярозкін.

На вечары выступілі пісьменнікі Мікола Хведаровіч, Юрка Гаўрук, Язэп Семяжон, Рыгор Рэлес, народны мастак СССР Заір Азгур.

У выкананні заслужанай артысткі БССР Юдзіф Арончык прагучалі вершы на яўрэйскай мове.

Творы І. Харыка ў перакладзе на беларускую мову, а таксама песні на яго вершы гучалі ў выкананні артыстаў мінскіх тэатраў.

ДАКУМЕНТЫ НАГАДАЛІ

Гэты малады калектыў першы з беларускіх тэатраў аднавіў дзейнасць на вызваленай зямлі: май 1944 года, Гомель. Мноства цікавых дакументаў, якія раскрываюць работу Дзяржаўнага тэатра лялек БССР у першыя пасляваенныя гады, ёсць у Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва рэспублікі. Захавалася, напрыклад, камандзіровачнае пасведчанне, выдадзенае 10 мая 1944 г. брыгадзіру канцэртнай групы тэатра, камандзіраванаму разам з артыстамі на раён для культурнага абслугоўвання працаўнікоў сяўбы. Пра тое, што тэатр не толькі выязджаў са спектаклямі ў аддаленыя куткі Беларусі, рыхтаваў новы рэпертуар, але і праводзіў вялікую работу з маладымі членамі свайго калектыву, сведчыць асобная даведка. У ёй — звесткі аб занятках, якія наладзіў мастацкі кіраўнік тэатра М. Бабушкін з акцёрамі ў жніўні-верасні 1947 г. Вось некаторыя тэмы: дылетантызм, сцэнічнае мастацтва і сцэнічнае рамяство; прапанаваныя абставіны; вызваленне мышцаў: эмацыянальная памяць і г. д. Дакумент нагадае нам прозвішчы: М. Бабушкін — дырэктар і мастацкі кіраўнік; С. Замоўскі, В. Чачыкаў, М. Давыдзенка — акцёры. Гэтая група работнікаў тэатра была ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК ЛКСМБ за паспяховую творчую дзейнасць па культурнаму абслугоўванню юнага гледача — у сувязі з 30-годдзем Беларусі і 10-годдзем Дзяржаўнага тэатра лялек БССР.

В. КАМЫШ,
навуковы супрацоўнік
Цэнтральнага дзяржаўнага
архіва літаратуры
і мастацтва БССР.

ЮНАЦТВА ІХ—КАМСАМОЛ

Жыццёвы шлях Уладзіміра Шульгі ў многім тыповы для сённяшняй савецкай моладзі. У шаснаццацігадовым узросце ён будаваў горад беларускіх шахцёраў Салігорск, а пасля авалодаў нялёгкай прафесіяй першапраходцы зямных нетраў. Сёння У. Шульга — кіраўнік камсамольска - маладзёжнай брыгады машыністаў горнага камбайна аб'яднання «Беларуськалій». Брыгада, якую ён узначальвае, не ўступае першынства ў сацыялістычным спаборніцтве камсамольска - маладзёжных калектываў Міністэрства хімічнай прамысловасці СССР, тры разы заваёўвала пераходны Чырвоны сцяг «Гвардзейцы пяцігодак, ветэраны працы — лепшаму камсамольска - маладзёжнаму калектыву».

У. Шульга ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола. Ён — кавалер знака шахцёрскай славы III ступені і залатога знака ЦК ВЛКСМ «Малады гвардзеец пяцігодкі».

Добра вядома ў рэспубліцы і імя кухара сталовай Мінскага аўтазавода, брыгадзіра на новай раздатачнай лініі «Эфект» Тамары Краўчанкі.

Партрэты У. Шульгі, Т. Краўчанкі, а таксама іншых лепшых прадстаўнікоў савецкай моладзі, сярод якіх чэмпіён свету па шахматах Анатоль Карпаў, спявачка Роза Рымбаева, актрыса Валянціна Цялічкіна — усяго трыццаці двух чалавек, — увайшлі ў набор паштовак «Моладзь Краіны Саветаў», выпушчаных выдавецтвам «Изобразительное искусство». Гэта ўжо другое аналагічнае выданне, якое расказвае пра правафланговых Ленінскага камсамола.

Партрэты героеў камсамола выканаў мастак І. Пчолка. Аўтар-складальнік Н. Яніна. Набор паштовак прысвячаецца 60-годдзю ВЛКСМ.

С. ВІРЗОЎСКІ.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую літаратурную і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў галоўнага рэдактара рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі, намесніка начальніка ўпраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры Беларускай ССР тав. БАЖКО Аляксандра Цімафеевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу па кафедрах:
струнных інструментаў—старшага выкладчыка (альт)—1.
Заявы і дакументы, згодна з палажэннем аб конкурсе, накіроўваць на імя рэктара па адрасу:
горад Мінск, вуліца Інтэрнацыянальная, 30.
Тэрмін падачы заяў—адзін месяц з дня апублікавання.
Даведкі па тэлефоне: 22-49-42, 22-96-71.

Васіль ЗУЁНАК,

лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі

Зялёная Пушча

Уладзіміру КАВАЛЕНКУ, лётчыку-касманаўту, земляку

Зялёная Пушча — калыска мая—
Галінкаю памяці ў сэрцы.
Пад шатамі звонкімі хлопчык стаяў,
Куванне збіраў у вядзерца.

Паляны — як Млечнага Шляху сляды—
Усе закіпалі ў суніцах,
Лічыла зязюля такія гады,
Што ў сне толькі могуць прысніцца!

Зялёнае лета планетай плыло,
У дол прарастала карэннем.
На сцежках лясных распраўляла крыло
Касмічнае пакаленне.

І час гэты выспеў, і год надышоў:
Ракета ўразаецца ў просінь!
А дома —Мядзведзіца зорным каўшом
Зноў мары камусьці прыносіць.

Пад небам лясным — Падбярэзе і Клён,
І Белае — воблачкам тае.
Загадкава кліча ў палёт Арыён,
Зялёная Пушча вяртае.

Мікола МІНЧАНКА

Радзіма

Мне ва ўсмешцы літоўкі — зноў усмешка матулі,
Бо яны дзве сяброўкі — ад вайны дзве зязюлі.

Колькі бед прашумела над Радзімай маёю,
Ды яна адалела беды дружнай сям'ёю.

Тут Расія, як песня — з ёй наш лёс назаўсёды:
Ў барацьбе былі побач вечна нашы народы.

Побач нашы паляны, жыта буйнага колас.
Чую плач Яраслаўны, Каліноўскага голас.

Як зямля і вада — неразлучны ніколі,
Так Радзіма і мы — наша неба і поле,

Нашы думкі, і мары, і наша любоў,
Бо чырвоны наш сцяг і чырвоная кроў.

Уладзімір ВАСЬКО

Я тут нарадзіўся і вырас...

Шыбуе аўтобус ля бору,
бялее смала на ствалах,
па дрэве вавёрку угору
пагнаў перабольшаны страх.
Сарока ад хвоі да хвоі
праносіць мянташку хваста.
Я бачу, як заяц падвоіў
свой слых і прысеў ля куста.
Бязгучна ірдзяцца праменні
у вочы затоеных соў,
а цені дубоў, як сумненні,
упалі ў агонь верасоў.
І вось паказалася вёска
у засені сціплых прысад.
Гамоніць антэна з бярозкай,
вада падступае да хат.
І сёння расказваюць людзі
пра дзеда майго—рыбака,
як ён для сям'і на палудзень
у печы злавіў шчупака.
Звісаюць над Нёманам вербы,
да берагу гусі плывуць.
Я гэтым малюнкам паверыў
і з імі нідзе не парву.
Я тут нарадзіўся і вырас,
да маці зрабіў першы крок,
і твару майго, мабыць, выраз
падобны на гэты куток.

СПАЧАТКУ БЫЛО ЗАХАПЛЕННЕ

Іван Якімавіч Міско, адзін з аўтараў помніка маці-патрыётцы ў Жодзіне, у складзе творчай групы стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР. Ён аўтар скульптурнага бюста першага беларускага касманаўта Пятра Клімука. У дзень нараджэння камсамола бюст будзе адкрыты ў Брэсце. І таму пытанні да Івана Якімавіча:

— Ленінскаму камсамолу спаўняецца шэсцьдзесят. Але гады належаць гісторыі, а камсамол — гэта маладосць кожнага з нас, маладосць, якая заўсёды з намі здзейсненым і няздзейсненым у жыцці. Што здзейснілася ў вас, Іван Якімавіч?

— Здзейснілася самае галоўнае — стаў мастаком. Дапамагла гэтаму не толькі вучоба ў вядомых беларускіх майстроў мастацтва — хоць я навек буду ўдзячны ім за іх карпатлівую працу! — дапамаглі гэтаму і спрэчкі на камсамольскіх сходах, і трывога за лёс сваіх равеснікаў у апаленым В'етнаме, і рамантычная ўзнёсласць песень, што гучаць над нашай зямлёй. Камсамол! — да самага светлага ў маім жыцці далучалі мяне камсамольскія будні.

Праца — калі рукі шукалі, ляпілі форму, вобраз, характар чалавека, а душа спасцігала вышыні чалавечай мужнасці і хараства. Калі ўпершыню адчуў сваю роднасць з зямлёй, такой блізкай і такой неспазнанай...

Песні, якія луналі над вечарамі, што збіралі творчую моладзь рэспублікі ў адно шырокае кола, — і за размовамі, за вершамі, уплеценымі ў мелодыі і малюнкі сяброў, прыходзіў роздум. Роздум пра сваё месца ў мастацтве, пра адказнасць, што ўсё расце і расце.

А планы абганяюць час, прыспешваюць, патрабуючы поўнай адданасці справе.

Камсамол... Першыя крокі на шляху ўдач і пралікаў, перамог і сумненняў. Гэта не забываецца!

— Малады герой нашых дзён — якім вы бачыце яго? Якое месца займае ён у вашай творчасці?

— Знайсці, увасобіць у творы мастацтва свайго сучасніка — хіба не задача кожнага мастака? Моладзі падуладна тое, што пасля не даецца ні вопытам, ні ўменнем, ні сталым майстэрствам. Унутранае гарэнне, узнёсласць думак, прага да гераічнага — гэта заўсёды прыцягвала, прываблівала мяне ў маладых.

І спачатку заўсёды было захапленне, захапленне чалавекам, яго духоўным светам, яго працай — работа над скульптурным партрэтам пачыналася пазней. Але тады гэта была безупынная работа, калі рукі не паспявалі за думкамі. Герой Мінскага падполля Іван Кабушкін, паэт Валянцін Таўлай, маладая ткачыха Лена Лазарэнка, актрыса Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Галіна Бальчэўская, сусветна вядомы барэц Аляксандр Мядзведзь — хіба, называючы імёны, перадасі тое хваляванне, тое шчаслівае пачуццё радасці, якое прыходзіла ў час работы над іх партрэтамі? Работа ўзбагачала мяне, як узбагачае і сёння. І, можа, таму, мне заўсёды бывае цяжка прызнаць твор завершаным, пагадзіцца, што гэта канчатковы варыянт, — работа над многімі скульптурамі працягваецца і пасля завяршэння.

— Так, камсамол можа ганарыцца сваімі выхаванцамі. З далёкіх часоў грамадзянскай вайны да сённяшніх грандыёзных будоўляў яны былі там, дзе цяжэй, там, дзе патрэбны іх гарачая вера, іх малады запал, іх дужыя рукі. Ці было ў вас так, Іван Якімавіч, што ўсе лепшыя рысы, усё самае прыцягальнае ў характары сучасніка спалучалася раптам для вас у кімсьці адным?

— Было. Лічу, пашанцавала. На сустрэчы ў ЦК камсамола Беларусі пазнаёміўся з Пятром Клімуком. Пазнаёміўся і вось ужо чацвёрты год жыву нібыта па іншых вымярэннях часу. Работа над партрэтам касманаўта захапіла настолькі, сустрэчы з ім далі так многа, што тэма космасу, тых, хто яго абжывае, выцесніла ўсё астатняе. Пётр Клімук — незвычайнай, вялікай душы чалавек. Ён нібы заражае ўсіх сваім аптымізмам, сваім ясным настроем, сваім жаданнем працаваць, працаваць, працаваць!

Разам з архітэктарам С. Баткоўскім завяршыў работу над бюстам касманаўта, які будзе ўстаноўлены ў Брэсце — адкрыццё адбудзецца днямі, а ні сэрца, ні рукі не вераць, што гады работы ззаду, што не вярнуся да яе... Канечне ж, вярнуся!

— Новая тэма, новыя пошукі... А яшчэ ж зусім нядаўна мы ўсе радаваліся вашаму вялікаму поспеху — атрыманню Дзяржаўнай прэміі СССР у складзе творчай групы за манумент у гонар подзвігу савецкай маці-патрыёткі і яе сыноў у Жодзіне. Хацелася б ведаць, як загучала ў вас гэтая балючая, шчымліва-балючая нота ўспамінаў пра далёкі, грозны час...

— Як загучала? Я добра помню трывожнае падрыгванне сталёвых рэек — мы жылі каля самай чыгункі ў час вайны — перад тым, як пракоціцца выбух: фашысцкія цягнікі ўзрываліся і ўдзень і ўначы. Помню цяжкую бацькаву руку—прыціскаў бацька мяне да сябе, не хаваючы погляду, налітага помслівым агнём. Помню спакутаваныя твары палонных...

Успаміны сталі тэмай дыпломнай работы ў інстытуце. Скульптурная кампазіцыя «Суровыя гады» — гэта не толькі пра маё маленства...

Шчаслівы, што ў садружнасці са скульптарамі А. Заспіцкім і М. Рыжанковым і архітэктарам А. Трафімчуком працаваў над помнікам беларускай маці. Няма хлопцаў, як воіны загінулі яны, пяцёра. Жыве старэнькая маці — Настасся Фамінічна Купрыянава. І хоць, працуючы над кампазіцыяй, мы думалі пра ўсіх мацярок савецкіх, якія аддалі Радзіме сваіх дзяцей, я знаю: жыве старэнькая маці Настасся Фамінічна і прыходзіць да сваіх сыноў пагаварыць. Знаю, што яшчэ можна паехаць да яе, пацалаваць сухія зморшчаныя рукі. І тым таксама шчаслівы.

— Іван Якімавіч, як склалася ваша творчая група? Як вы глядзіце на калектыўную працу скульптараў і архітэктараў?

— У час такіх велізарных сацыяльных і эканамічных пераўтварэнняў, грандыёзных забудоў і задач, што паўсядзённа паўстаюць перад мастакамі, відаць, і нельга падыходзіць па-іншаму да вырашэння іх. Мемарыяльныя комплексы, скульптурныя кампазіцыі, мазаічныя роспісы — як звычайна, гэта работа цэлых творчых калектываў: занадта вялікая адказнасць перад часам, перад будучыняй. Робім жа не на адзін дзень...

А наша творчая група? Сябруем, усе разам думаем над эскізамі помніка М. Горкаму для Мінска — вось і наступная сумесная работа!

— А што яшчэ ў вашых планах? Над чым працуеце зараз, якія задумы на бліжэйшыя гады?

— Тэма адна: космас! Пошукі разнапланавыя — і ў кампазіцыі, і ў партрэце, і ў матэрыяле. Да выстаўкі, прысвечанай 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, рыхтую скульптурную групу «Інтэркосмас» — Пётр Клімук і Міраслаў Гермашэўскі. Усе наступныя гады — працяг распачатай працы. Вы не ўяўляеце, якая цікавая гэта работа, колькі дае магчымасцей, колькі думак выклікае! Хочацца працаваць і працаваць.

Гэта будзе вялікая серыя твораў, прысвечаных космасу. І першае, з чаго калісьці пачынаў, над чым і цяпер працую, — партрэт маці Юрыя Аляксеевіча Гагарына. Гэта асноўная работа, работа, якая адкрые серыю...

Пакідаю майстэрню, жадаючы скульптару новых вялікіх здзяйсненняў. Але пакідаю са шкадаваннем, раз-пораз азіраючыся назад, нібы ўсё яшчэ бачу вялікі здымак на сцяне: Пётр Клімук каля свайго скульптурнага партрэта і надпіс на ім аўтару партрэта Івану Міско, зроблены рукою Клімука: «Прыемна, што ў тваіх руках гліна ператвараецца ў характар, якому я нават сам зайздрошчу».

Інтэрв'ю правяла Т. БОНДАР.

НА НЯСВІЖСКАЙ ЗЯМЛІ

Гэтага пасівелага чалавека з эцюднікам часта можна спаткаць у парку санаторыя «Нясвіж», каля люстраных азёр, каля будоўлі. Нетаропка, радасна ўзіраючыся ва ўсё, на чым спыняецца пагляд, ён ідзе, раз-пораз схіляючы голаў, калі гучаць прывітальныя словы.

— Добры дзень, Міхаіл Канстанцінавіч! Добры дзень!

Сорак гадоў жыве і працуе Міхаіл Канстанцінавіч Сяўрук на нясвіжскай зямлі. Сорак гадоў, якія ўвабралі ў сябе так шмат, што думкі не адразу вяртаюць тую памятную сустрэчу з Максімам Танкам, якая перайшла ў сяброўства. 1937 год, Вільня. Рэвалюцыйная паэзія Заходняй Беларусі...

— З хваляваннем трымаў у руках рукапісны зборнік Максіма Танка «На этапах», — успамінае мастак.— Я даўно чуў пра яго аўтара, чытаў яго творы. Згадзіўся ілюстраваць зборнік з радасцю. Зрабіў некалькі варыянтаў. Аўтар выбраў сёмы варыянт: штык на фоне беларускай прыроды і дарога, а на ёй сляды ног людзей, якіх гналі па этапу. Як вядома, гэты зборнік быў канфіскаваны польскімі ўладамі...

Пазней Міхаіл Канстанцінавіч робіць вокладку да зборніка Р. Р. Шырмы «Наша песня», ілюструе часопіс.

Маляваць ён пачаў з дзяцінства. Нарадзіўся ў Варшаве. Прага да ведаў прывяла яго ў Вільню, дзе ён вучыўся на мастацкім факультэце універсітэта. Тут паступова расце майстэрства мастака, ён пачынае пільней углядацца ў жыццё, глыбей яго асэнсоўваць. Прымае ўдзел у рэвалюцыйным руху.

У 1923 годзе завітаў ён у Сноў да дзядзькі ў час канікулаў. З ім былі лістоўкі рэвалюцыйнага зместу, раздаў іх сялянам. Праз некалькі дзён у хату ўварваліся паліцэйскія і зрабілі вобыск, некалькі лістовак знайшлі ў шуфлядзе.

Міхаіла Канстанцінавіча арыштавалі і пасадзілі ў Нясвіжскую турму...

Вышэйшай школай для мастака з'яўляецца само жыццё. Калі заходзіш у дом мастака, то думаеш, што трапіў у карцінную галерэю. На сценах мноства партрэтаў, пейзажаў нясвіжскай зямлі, жанравыя карціны.

Яго карціны экспанаваліся ў Беластоку, Вільнюсе, Варшаве, Мінску. У 1955 годзе ў сувязі з Дэкадай беларускага мастацтва ў Маскве Міхаіл Канстанцінавіч Сяўрук узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Мастаку — семдзесят. Гады наклалі свой адбітак — пасівелыя скроні, рухі павольныя, а ў вачах — зоркі радасці. Ён поўны новых творчых задум. Позна заседжваецца каля мальберта, абдумваючы новыя карціны.

— Да юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі хочацца зрабіць некалькі карцін, каб паказаць шлях, які прайшоў наш народ за 60 гадоў, —гаворыць мастак.

Паўлюк ПРАНУЗА.

А МАЙСТЭРСТВА ПРЫЙДЗЕ

ЗГУБІЦЦА, ЗАГУБІЦЦА ТАЯ РАКА, якой сцураюцца прытокі. І няхай вытокам у яе — наймагутнейшая з крыніц, але не данясе яна сябе да мора, калі не ўздужэе сілаю плыняў, што вымкнены з іншых пластоў зямлі, з новых, спадарожных мясцін. Так і кожная літаратура. Толькі тады яна дамкне да мора агульначалавечай духоўнай культуры, а дамкнуўшы, не згубіцца ў ім, калі пастаянна будзе напаўняцца новымі струменямі талентаў, жывіцца мастацкім вопытам новых пакаленняў. Прыход у літаратуру новых імёнаў зусім не ўскоснае сведчанне яе жыццяздольнасці. Вось чаму з такой цікавасцю прыглядаешся да кожнага літаратурнага навабранца. І не столькі да яго прафесійнага ўмельства (гэта з цягам часу прыйдзе), колькі да таго, што называецца прыроднай здатнасцю, асабова-індывідуальнай непаўторнасцю.

Год 1978 быў у гэтых адносінах дастаткова плённы. Асабліва ў жанры прозы: пад грыфам «Першая кніга празаіка» выйшлі адразу чатыры зборнікі.

Васіль Давыдзенка. Жывыя струны.

Іван Кананові́ч. Заводскія світанні.

Адольф Варановіч. Высокі падмурак.

Павел Саковіч. Калючы серпанцін.

Павіншуем жа новае літаратурнае папаўненне з... годам нараджэння!

А ўрэшце, выхад першай кнігі вельмі ўмоўна можна лічыць пачаткам творчай біяграфіі пісьменніка. Вось і ў нашым выпадку. Усіх чатырох аўтараў першых кніг чытач дастаткова добра ведае па публікацыях у перыядычным друку. Так што віншаваць можна было б значна раней. Раней нават таго моманту, вельмі шчаслівага для кожнага, калі з'яўляецца першы друкаваны радок: бо мастак нараджаецца не тады, калі друкуе свой твор, а калі яго стварае. Ісціна гэта не такая ўжо і трывіяльная. Прынамсі, яе не шкодзіць напомніць, калі маеш справу з пісьменнікамі, чыя першая кніжка выйшла не ў студэнцкія гады. Прага творчасці з'яўляецца заўсёды ў юначыя гады, і калі кожны з іх не астудзіўся да гэтага часу, не пагубляў творчага імпэту на шляху да першай кнігі, то можна, мусіць, гаварыць аб сталасці, сур'ёзнасці літаратурных намераў. Не пісаць яны, здаецца, не маглі, бо мы ведаем, як няпроста выстачыць час для творчасці, калі ты працуеш урачом-анколагам (В. Давыдзенка), на аўтазаводзе (І. Кананові́ч), на льнокамбінаце (А. Варановіч), у дзяржаўнай установе (П. Саковіч).

Вось мы і адзначылі тое асноўнае, што аб'ядноўвае ўсіх чатырох аўтараў. Вялікі жыццёвы, сацыяльны вопыт. Нелітаратурны характар штодзённай працоўнай дзейнасці. Адданасць літаратурнай справе. А ў астатнім—гэта вельмі розныя людзі: па манеры пісьма, па творчай арыентацыі...

КНІГУ В. ДАВЫДЗЕНКІ «ЖЫВЫЯ СТРУНЫ» склалі чатыры апавяданні («Сямейная тайна», «Кроўны брат», «Рыгоравы турботы», «Прагул») і дзве аповесці («Зямное свяціла», «Ціхая споведзь»). Адразу ж варта зазначыць, што аўтар у сваіх апавяданнях не вельмі арыгінальны. І тэмы і погляд на рэчаіснасць не вызначаюцца хоць бы якой непрывычнасцю, навізной. Такое, ці прыкладна такое ў беларускай літаратуры ўжо сустракалася. І тое, што апавяданні прачытваюцца не без цікавасці, гаворыць на карысць літаратурнага ўмельства аўтара, які ўсё ж змог перадаць нам захапленне лёсам сваіх герояў. Лёсам людзей звычайных, невыключных, але з душамі чыстымі і высакароднымі.

Вось і ў апавяданні «Сямейная тайна» В. Давыдзенка заняўся, на першы погляд, не вельмі плённай задачай — праілюстраваць вядомую здаўна ісціну: «Не той бацька, хто на свет пусціў, а той, хто выгадаваў, на ногі паставіў». Уражанню няплённасці садзейнічала і нейкая «праставатая» арганізацыя сюжэта твора. Фабула апавядання наступная. Аўтар аднойчы пабываў на могілках, дзе яго здзівіў надпіс на адным мармуровым надмагільніку: «Буторыну Васілю Іванавічу ад жонкі і роднага сына». Чаму «роднага»? Навошта гэта падкрэслена? У выніку спатолення аўтарскай цікаўнасці перад чытачом паўстае дастаткова няпростая гісторыя ўсынаўлення хлопчыка Віктара, які рос, вучыўся, стаў прафесарам і нават не падазраваў, што бацькі ў яго не кроўныя. Аж да смерці Васіля Іванавіча.

Апавяданне «Сямейная тайна» можа дастаткова вычарпальна характарызаваць творчую манеру аўтара. Іншы пісьменнік пастараўся б «закруціць» сюжэт патужэй, падпусціць таемнасці. А В. Давыдзенка нават пра надпіс на помніку гаворыць у канцы апавядання. І, здаецца, не ад нявопытнасці сваёй не паспрабаваў ён заінтрыгаваць чытача ў самым пачатку твора. Проста ён больш схільны да грунтоўнага, няспешнага апісання падзей з абавязковымі тлумачэннямі дэталей, пабуджальных прычын і г. д. Магчыма, каму-нікаму такая манера можа падацца не вельмі сучаснай, але, думаецца, і прыхільнікі ў яе будуць таксама. Адным словам, у літаратуры важна не толькі **як** паказваць, але і **што** паказваць. А вось тут да В. Давыдзенкі шмат прэтэнзій не можа быць, бо ў асноўным ён расказвае пра падзеі, якія звязаны з лёсам людзей, што ўразілі яго сваёй мужнасцю, стойкасцю перад знясільваючай хваробай, перад тварам смерці.

Мы так часта гаворым пра экстрэмальныя сітуацыі, пра праблему выбару. Гэта ўжо стала нейкай адзнакай «добрага тону» — ставіць героя ў сітуацыйныя тупікі, каб паназіраць за яго эмацыянальна-псіхалагічнымі рэакцыямі. Даводзіцца пашкадаваць, што нават у літаратуры попыт вызначае прапановы, скіроўвае творчыя намаганні. Больш таго, часам мы бачым, як не дужа патрабавальны пісьменнік спецыяльна высільваецца ў сачыненні перашкод на шляху героя, знаходзячы экстрэмальнасць там, дзе яна і не начавала, а праблему выбару, — дзе герою варта не выбіраць — проста следаваць за нормай элементарнай этыкі.

Нагадаўшы ўсё гэта, прыемна здзіўляешся творчаму такту аўтара «Жывых струнаў». Мекавіта яму, хто па характару сваёй прафесіі кожны дзень сутыкаецца з выключнымі, трагічнымі становішчамі, як кажуць, і пяро ў рукі. Ці ж мала людзей, чый лёс склаўся так, што і дадаваць нічога не трэба — адно запісвай, — прайшло перад пісьменнікам? І, думаецца, спакуса паднасыціць свае творы «сакраментальнымі» падрабязнасцямі, патузаць нервы чытачу неадночы паўставала перад ім. Аднак ён бачыў сваю задачу ў іншым: падзяліцца з чытачом уражаннямі ад сустрэч з людзьмі, якія мужна пераадольвалі няшчасці, хто ў самых складаных сітуацыях не губляў чалавечнасці і вытрымкі. Апавяданне «Сямейная тайна» ўтрымалася па-над узроўнем трывіяльнасці менавіта таму, што ў ім чытач мае магчымасць пазнаёміцца з адным з такіх людзей — старым, паміраючым Буторыным.

Астатнія апавяданні напісаны таксама ў прыкладна такім жа ключы. Нетаропка, дэталёва расказвае пісьменнік пра самаахвярнасць маладога ўрача і вучонага Барыса Краўчанкі («Кроўны брат»), пра працоўныя будні старога жывёлавода Рыгора («Рыгоравы турботы»), пра радасць навасёлаў («Прагул»), якія, нарэшце, вырваліся з пекла бескватэр'я.

З аповесцей, несумненна, мацней напісана «Зямное свяціла». Гэта і не дзіўна, бо матэрыял, пакладзены ў аснову твора, выдатна вядомы аўтару. Вядомы так, як можа быць вядома штодзённасць. Менавіта таму многія старонкі аповесці і ўражваюць такімі дэталямі, якія недасведчанцу не пад сілу. Характэрна, што В. Давыдзенка разам з тым усяляк пазбягае «прафесійнай» гаворкі.

Спрадвеку беларуская літаратура была нацэлена на вырашэнне зусім пэўных практычна-жыццёвых праблем. Іншымі словамі — пісьменнікі кожным сваім творам імкнуліся або сцвердзіць нешта станоўчае, або выкараніць пэўную загану, недахоп. І заўсёды — канкрэтна. В. Давыдзенка і за пісьменніцкім сталом заставаўся ўрачом-анколагам, выкарыстоўваючы яшчэ адну магчымасць папярэдзіць няшчасце. Перакананы, што кожны, хто прачытае аповесць, унікне памылкі Мірона Адамавіча, навуковага шэфа Антона, якая прывяла да трагічнага зыходу. «Антон з вялікім жалем пазіраў на яго і ніяк не мог прымірыцца з тым, што ён «ні за што ні пра што» трывае такія пакуты. І хутка зусім памрэ. А бязглузды касметолаг, які выпек яму радзімку і тым самым выклікаў каварную пухліну, жыве сабе прыпяваючы. І будзе жыць». Мірон Адамавіч памёр у страшэнных пакутах з-за неагледлівасці, неасцярожнасці, дык хаця ты, чытач дарагі, не паўтары жахлівую памылку,—усім ладам сваёй аповесці даводзіць пісьменнік.

Што ж, — гэта не так і мала —папярэдзіць некага, прадухіліць бяду. Дзеля гэтага варта было брацца за пяро.

Другая аповесць «Ціхая споведзь» таксама напісана не без «прапаведніцкіх» меркаванняў. Пабудавана яна ў выглядзе запісу размовы дзвюх жанчын, незнарок падслуханай аўтарам. І Ніна Аляксееўна, і Аня — адна пенсіянерка, а другая маладога яшчэ веку —засталіся бязмужнімі. Але лёс у іх быў вельмі розны. Сямейнае шчасце ў Ніны Аляксееўны адабрала вайна; столькі год сплыло пасля яго гібелі, а яна не можа забыцца, нахваліцца шчаслівымі гадамі сумеснага жыцця з Германам. У Ані з Сяргеем спачатку таксама ўсё ладзілася. Муж так кахаў сваю маладую жонку, што, здавалася, шчасцю не будзе канца. Але не ўтрымаўся знатны шахцёр, запіў, загуляў, пакуль не сканаў з прабітай галавою ў нейкай канаве. Без вайны, без хваробы, без землятрусу прапаў добры працаўнік, пакінуўшы няшчаснымі жонку і сына. «Але, перш чым скрануцца з месца, —гаворыцца ў самым канцы аповесці,— я зноў папрасіў у жанчын прабачэння за тое, што незнарок падслухаў іх успаміны. Ніна Аляксееўна і Аня ў адзін голас выгукнулі:— То ж чыстая праўда. Ды хіба яна каму пашкодзіць?»

Вядома ж, не пашкодзіць. Больш таго, трэба падкрэсліць: тое, што робіць у літаратуры В. Давыдзенка, варта ўвагі і падтрымкі. Хацелася б толькі параіць яму больш плённа выкарыстоўваць падтэкст, тады самі сабою адпалі б расцягнутыя мясціны, неабавязковыя эпізоды, не так выпіналася б дыдактыка паасобных аўтарскіх сентэнцый. І самае важнае —трэба больш уважліва ставіцца да слова, бо час ад часу пракідваюцца ў творах пісьменніка лексічныя няўклюднасці-недакладнасці, стылёва нявыверанымі словазлучэнні. Іншы раз В. Давыдзенка не ўяўляе свайго чытача, распаўсюджваючы свой вопыт на ўсіх. Вось адзін з прыкладаў: «У кабінет, не спяшаючыся, зайшоў пажылы, гэтак гадоў пад шэсцьдзесят, чалавек, які сваім аблічам быў падобны на Ільлю Эрэнбурга». Параўнанне з І. Эрэнбургам нічога не дае. Ды, зрэшты, усё гэта нажыўное — з цягам часу прыйдзе і чуццё мовы, і пачуццё меры. Важна, што ў літаратуру прыйшоў чалавек з багатым жыццёвым вопытам, з прагай на лепшы лад зыначыць свет.

ІВАН КАНАНОВІЧ таксама ставіцца вельмі сур'ёзна да сваёй творчасці, і жыццёвы вопыт у яго немаленькі: паспеў папрацаваць трактарыстам у МТС і на цаліне, адслужыць у арміі, паслясарнічаць на Мінскім аўтазаводзе...

«У першую кнігу маладога празаіка ўвайшлі апавяданні і аповесць, героямі якіх з'яўляюцца нашы сучаснікі: рабочыя, інжынеры, працаўнікі вёскі. Усіх іх яднаюць высокія маральныя і духоўныя якасці, імкненне пераадолець любыя нягоды, зрабіць жыццё па-сапраўднаму прыгожым»,— гаворыцца ў анатацыі да «Заводскіх світанняў». Справядліва гаворыцца, хіба за тым выключэннем, што далёка не ўсіх герояў «яднаюць высокія маральныя і духоўныя якасці», а тым больш —імкненне «зрабіць жыццё па-сапраўднаму прыгожым». Той жа Ігнат з апавядання «На скрыжаванні дарог» (дарэчы, аднаго з лепшых у зборніку) якраз імкнуўся зрабіць жыццё прыгожым, лёгкім для сябе за кошт здароўя, шчасця іншых. Толькі не пайшло на карысць прысвоенае дабро брата, не мінулася бясследна смерць пляменніцы Гэлькі, на лячэнне якой у Ігната прасілі вярнуць хоць палавіну ўкрадзеных грошай. Адрокся ад бацькі сын Алёшка, а пад асуджальнымі позіркамі аднавяскоўцаў усё больш згіналіся Ігнатавы плечы...

Тэматыка апавяданняў І. Кананові́ча непасрэдна абумоўлена яго жыццёвым вопытам. Ён з тых пісьменнікаў, хто не рызыкуе вадзіць сваіх герояў па сцежках, якіх дасканала не зведаў сам. Затое і апавяданні не папракнеш за хоць якую недакладнасць канкрэтыкі, за верагоднасныя пралікі. Чытаеш, напрыклад, апавяданне «На самане» і ледзь не фізічна адчуваеш сухмень спякотнага стэпу, бачыш трактар, які настырна коўзаецца па замесу, рупныя радочкі гатовых саманін... І стома, нечалавечая стомленасць...

Пазнаваўчай ёмістасцю вызначаюцца апавяданні І. Кананові́ча на так званую рабочую тэматыку. Ці варта паўтараць словы аб важнасці для беларускай літаратуры эстэтычнага асэнсавання такога значнага сацыяльнага мацерыка, якім з'яўляецца побыт індустрыяльных рабочых, маральны клімат горада? Само жыццё патрабуе ад пісьменнікаў часцей скіроўваць свой пагляд у гэты бок: Беларусь даўно перастала быць аграрнай рэспублікай, з кожным годам сельскага насельніцтва ў ёй становіцца ўсё менш і менш. Вядома ж, пераарыентацыя на праблемы, звязаныя са зменамі ў сацыяльнай структуры рэспублікі, павінна прынесці свой плён, і тады мы і на рабочую тэматыку будзем мець творы, роўныя па сваіх эстэтычных параметрах «Палескай хронікі» І. Мележа і інш. Напішуць жа такія творы пісьменнікі, для каго, як для І. Кананові́ча, заводскія світанні стануць штодзённасцю, а побыт рабочага — іх побытам — гэта раз. А па-другое, гэтым пісьменнікам неабходна арганічна ўспрыняць светапогляд, ідэйна-маральныя прынцыпы рабочага чалавека. Строга кажучы, героі «Заводскіх світанняў» заводскія толькі па месцу працы, а псіхалагічна, этычна — гэта сяльчане, якім больш прыемны, зразумелы пах раллі, скошанага сена, чым машыннага масла і металічнай стружкі. Што ж, гэтаму ёсць і лагічнае апраўданне, і тлумачэнне: большасць рабочых беларускіх заводаў выехалі ў горад параўнаўча нядаўна, у вёсцы прайшло іх маральнае і сацыяльнае сталенне, з ёю не парываюць яны самай цеснай сувязі. Так што і тут малады пісьменнік не грашыць супраць праўды жыцця, паказвае сваё асяроддзе такім, якое яно ёсць у сапраўднасці. У імкненні быць праўдзівым ён недзе, у нечым абмяжоўвае сваю творчую фантазію, не вельмі ахвотна карыстаецца мастацкімі абагульненнямі і г. д. Добрасумленнасць, жыццепадобнасць адлюстравання плённыя для пачынаючага пісьменніка, для першай кніжкі, у наступным павінны дапаўняцца смелымі творчымі пошукамі. Без гэтага значнага мастацкага адкрыцця не дасягнуць.

Свае «Заводскія світанні» пісьменнік дастаткова густа насяліў слесарамі, мантажнікамі, наладчыкамі, выпрабавальнікамі... І для кожнага змог знайсці нешта індывідуальнае, характэрнае, што не дае зблытаць іх. Асабліва ўдаюцца яму кароценькія «партрэтна-паводзінныя» характарыстыкі, накшталт: «З таго часу жыве ваўкавата, маўкліва, ходзіць паўз людзей, быццам з каменем за пазухай». Але асноўнае, чым адрозніваюцца героі адзін ад другога,— гэта адносінамі да працы. Для многіх з іх праца прыносіць асалоду, радасць. Але не кожны дзень ёсць маг-

чымасць гэтую радасць стварэння адчуць на поўную сілу: перашкоды з'яўляюцца самыя розныя — аб'ектыўныя, суб'ектыўныя. Метады і формы іх пераадолення, эмацыянальная рэакцыя на прычыны, якія перашкаджаюць ператварэнню працы ў свята, вызначаюць і адрозніваюць Станіслава Радзевіча («Цяжкі модуль») ад Зайкоўскага («Стары зваршчык»), Лявона Дземідовіча («Дзень пасля адпачынку») ад Ліды Красуцкай («Толькі адно мерапрыемства»).

Звяртаючыся да паказу чалавека на вытворчасці, І. Кананові́ч вялікае значэнне надае выяўленню яго духоўнага свету. Вялікі тэрмін знаходжання ў працоўных калектывах пераканаў пісьменніка, што адносіны да працы яшчэ не самы асноўны крытэрый ацэнкі таго ці іншага чалавека. Сустракаюцца часам выдатнейшыя працаўнікі, майстры з залатымі рукамі ды са зламанымі, а то і пачварнымі душамі. Такіх праца высакароднымі не рабіла, яна давала толькі грошы ды напаўсвядомую амбіцыю, самаапраўданне за маральную непаўнацэннасць. Янкоўскі з аповесці «Заводскія світанні» набыў шыкоўную кватэру, «Волгу», безліч каштоўных рэчаў не махлярствам, не круцельствам, а сваёй працай, сваімі рукамі. Толькі вось душа яго аказалася з трэшчынкай, падточанай шашалем эгаізму.

Такім чынам, І. Кананові́ч, запрасіўшы нас у госці да сваіх сяброў-заводчыкаў, не расчараваў: знаёміў не выбарачна, каб нешта прыхарошыць або штосьці прычарніць. Магчыма, шмат з кім не паспеў пазнаёміць. Ды не бяда, будзем чакаць новых запросін.

А ПАКУЛЬ ЗАВІТАЕМ да літаратурных герояў яшчэ аднаго дэбютанта — Адольфа Варановіча. «Высокі падмурак» малады пісьменнік склаў з адзінаццаці цаглінак — ёмістых, някепска апрацаваных апавяданняў. Першае, што кідаецца ў вочы пры знаёмстве з апавяданнямі А. Варановіча,— гэта яго ашчаднае, паважнае стаўленне да слова. Ён любіць тонкі, дакладны жывапіс словам. Гэта не метафара, якой мы нярэдка карыстаемся, каб адзначыць работу пісьменніка над словам. У А. Варановіча многія апісанні, асабліва пейзажнага плана, інакш і не назавеш. Вось, напрыклад, як пачынаецца апавяданне «Новая хата», якім пісьменнік адкрывае зборнік: «Жоўтымі абшарамі збажыны красавала наўкол блакітнае лета. Вятры прапахлі цветам ліпы, і калі вечарамі на травы ападалі празрыстыя росы, пах мёду разліваўся па ўсёй зямлі. А раніцай сонца сушыла расу, і лістота арэшніку і бяроз рабілася бліскучай і салодкай». А як хораша, з лубачнай яркасцю, з жывапіснай дэталёвасцю можа апісаць пісьменнік зварот статка з пашы! Чытаеш, і перад табою ўзнікае яскравы малюнак летняга вечара, з пераліваміі святла і ценю, з крыху прыглушаным, мляўкім багаццем гукаў, з пахам пылу, свежага малака, прывялых траў... Усё гэта высока цэніць чытач. Такія апісанні выклікаюць не менш асацыяцый, рэзаніруюць у нашай душы гэтак жа моцна, як сустрэча з нечым дарагім, блізкім, першародным, што знаходзіцца ў аснове чалавечага быцця. І паэзію іх несумненна адчуе не толькі вясковец або былы вясковец, але і карэнны гараджанін. Кожны з іх адчуе і яшчэ адно: так пісаць не можа чалавек з абыякавай душой, глухой да радасцей і болю сённяшняй беларускай вёскі. Так, для А. Варановіча ўсё, што звязана з сельскай рэчаіснасцю, мае своеасаблівае значэнне. Кожнае апавяданне—нават калі ў ім вёска непасрэдна не паказваецца — прасякнута нейкай сельскай настальгіяй. Пачуццё віны за адыход з вёскі, за пакінутыя бацькоўскія хаты стала эмацыянальным камертонам кнігі «Высокі падмурак». Разам з тым, кожнае апавяданне ўспрымаецца гімнам, одай людзям вёскі. Пісьменнік адкрыта любуецца імі, захапляецца цэльнасцю і чысцінёй, самабытнасцю і працавітасцю гэтых блізкіх яго сэрцу людзей.

Шмат дае для разумення аўтарскай пазіцыі апавяданне «Высокі падмурак», якое ўспрымаецца яўна аўтабіяграфічным. Апавяданне-ўспамін, апавяданне-споведзь ў вечнай любві роднаму краю, бацькоўскай хаце. Зямлю, якая столькі выпакутавала, зямлю, з якой звязана столькі дарагога, «хоць цяжка працавалася, хоць голадна жылося», нельга не любіць, а тым больш — забыць. Там карані. Памяці... Нашы войскі вызваляюць вёску. Танкі... Потым эскадрон кавалерыі. Малайцаваты камандзір не дайшоў да студні, падсечаны здрадніцкай чаргой з-за вугла... Зварот з вайны бацькі... Хлопчык-малалетак з адарванай рукой... Ён не ўтрымаў адной левай ручкай шчупака, якога падаравалі спагадлівыя рыбакі. Разам са шчупаком сплыла магчымасць хоць раз удосталь наесціся.

Родны кут... Там і свядомасці карані. Успамінаюцца бацькавы ўрокі жыцця, спасціжэння законаў чалавечай існасці, разумення дабра і зла. Ніколі не сатрэцца з памяці бацькаў запавет: «Калі хочаце зразумець жыццё і зведаць праўду, трымайцеся тых, хто хлеб мазалём здабывае. Мазоль — ён зманіць не дасць!» Але ўспамінаецца і бацькавы адмоўныя адносіны да перасялення ў горад. А тым не менш... «Я і мае браты пакінулі вёску. Так склалася, такі час. Дагэтуль і бацькі мае, і дзяды, і прадзеды працавалі на зямлі і іншай работы не ведалі. Мы аказаліся на пераломе». Што ж, няхай не здзіўляе чытача налёт фатальнасці ў прызнанні пісьменніка. Проста ён не ставіў перад сабою задачы ўсебакова даследаваць міграцыйныя працэсы. Яго больш турбуе, каб пры гэтым пераломе мы не пагублялі многага з таго святога, што вякамі выпрацавала для народа, для нацыі вёска.

Кніга «Высокі падмурак» выглядае на дзіва цэльнай. Не думаю, што яна такой атрымалася ад папярэдняй задумы: апавяданні пісаліся ў розныя гады і пабуджальныя для іх напісання імпульсы таксама неаднолькавыя. Цэльнасць жа кнігі абумоўлена неабыякавасцю пісьменніка, яго грамадзянскай трывогай за лёс і будучае беларускай вёскі. Адсюль і тэматычнае пастаянства, і тая неадступнасць, настойлівасць, з якой узіраецца ён у маладых уцекачоў з вёскі.

Аўтар не забыў дарогу дамоў, не спатыкаецца, адвыкнуўшы, аб парог бацькоўскай хаты. Таму не спатыкаецца ён і ў вытлумачэнні, разуменні імклівага бегу вёскі ў новае быццё. Добра бачыць малады пісьменнік, што не ўсё новае— лепшае. Але непазбежнае. Былога не вернеш, развіцця не спыніш (калі і мог бы спыніць, дык — навошта?), як ёсць — так ёсць. Толькі ж, што з таго, што розумам прымаеш,— у душу ўсё роўна закрадваецца трывога, непакой. І таму ў лірычныя, мяккія інтанацыі апавяданняў А. Варановіча вельмі часта ўліваецца густаватая плынь элегічнасці («Ажына», «Ластаўкі пакідаюць гнёзды», «Суседзі»). Асабліва прыкметная яна на фоне гумарыстычных баек-карцін, якімі нярэдка аздабляе пісьменнік свае апавяданні. А робіць гэта ён, дарэчы сказаць, не дзеля самамэтнага ажыўлення танальнасці твораў. Кожны бытавы анекдот добра служыць пісьменніку для характарыстыкі адметнасцей часу, сітуацыі і г. д.

У асобе А. Варановіча беларуская літаратура папоўнілася несумненна здольным пісьменнікам-бытапісальнікам, з вострай назіральнасцю, з дакладнай пластыкай пісьма.

ЁСЦЬ СВАЯ ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ у тым, што з чатырох зборнікаў серыі «Першая кніга празаіка» адзін аказаўся гумарыстычным: Павел Саковіч, «Калючы серпанцін». Як ніяк, а гумар у беларускім народзе здавён і шанаваўся і цаніўся. Не дзіўна, што ў нашай літаратуры самых ранніх часоў гумарыстыка займала прыкметнае месца (інтэрмедыі, К. Марашэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Абуховіч і інш.). У савецкі час таксама не знікла цікавасць да гумарыстычна-сатырычных жанраў. Больш з боку чытача, менш — з боку пісьменнікаў: цяжкаваты ўсё ж хлеб гумарыста. Высмейваць даводзіцца не толькі нешта, але і некага. А хто любіць, каб з яго смяяліся? Праўда, не гэта самае страшнае ў рабоце гумарыста - сатырыка. Ад гневу выкрытага прайдзісвета можа абараніць заканадаўства, але што абароніць ад небяспекі паўтарэння, запазычання сюжэтаў? Думаецца, не маюць рацыі тыя крытыкі, якія ў кожным выпадку сюжэтнага супадзення бачаць плагіят. Дастаткова часта паўтарэнні абумоўлены іншай прычынай — стэрэатыпнасцю мыслення. Ёсць такія ненаўмысныя паўтарэнні і ў «Калючым серпанціне», асабліва ў раздзелах «Карацелькі», «Мімаходзь». Ды і ў «Жартах» таксама не ўсё пабліскваe «свежай чаканкай».

«Адзін малады чалавек з групы турыстаў шэпча суседу:

— Прабач, чыя гэтая цудоўная незнаёмка?

— Як, чыя? Вядома ж, Крамскога!

— Шкада, шкада... А я другі дзень прыглядваюся да яе— усё адна ходзіць!».

Шанцуе ж гэтай «Незнаёмцы» — каторы раз абыгрываюць гумарысты падобны сюжэт! Можна было б указаць і яшчэ на некалькі твораў, якія не вызначаюцца навізной. Але не яны вызначаюць твар кнігі «Калючы серпанцін». У большасці выпадкаў аўтар дастаткова паспяхова пераадольвае «супраціўленне матэрыялу», выяўляе чуццё слова, здольнасць быць займальным. Яму яшчэ давядзецца нямала папрацаваць, каб лепш «паставіць свой голас», знайсці ўласную сатырычную каліграфію. Думаецца, поспех яго чакае на шляху творчага выкарыстання паэтыкі беларускай фальклорнай гумарыстыкі. Імпрэсія «Казачны дуэт» — добрае таму пацвярджэнне.

ПЕРШАЯ КНІГА ПРАЗАІКА... За гэтым стаіць вельмі многа: пераемнасць пакаленняў, найноўшыя звесткі з пярэдняга краю сучаснай рэчаіснасці, сведчанні аб маральным клімаце, аб клопатах народных. Прыход у літаратуру новага папаўнення — заўсёды свята. Яно не канчаецца, калі не канчаецца творчы рост маладога пісьменніка. А навабранцам 1978 года ёсць як расці, ёсць чаму вучыцца, ёсць што набываць. Магчыма, варта было б набыць больш задзірыстасці (надта ж яны ўсе чацвёра рахманыя). І ўжо не «магчыма», а абавязкова — неабходна працаваць над словам. Талент ёсць, вопыт — таксама, а праца прынясе майстэрства.

Сцяпан ЛАЎШУК.

З ПУЦЁЎКАЙ «ЧЫРВОНКІ»

Больш чым паўвека назад, на сваім пятым Усерасійскім з'ездзе камсамол заявіў, што адкрыццё і падтрымка маладых талентаў, падрыхтоўка і выхаванне літаратурнай моладзі стане пастаянным яго клопатам. Гартаючы за гэты час падшыўкі старэйшай рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена», яскрава бачыш, як практычна займалася і займаецца друкаваны орган камсамола выхаваннем творчай моладзі, клапатліва і чула росціць маладое папаўненне, якое ідзе ў літаратуру. З гісторыяй камсамола і «Чырвонкі» звязаны літаратурныя лёсы ўсіх беларускіх пісьменнікаў, у біяграфіях якіх мы заўсёды чытаем самыя цёплыя радкі пра свае дэбюты — першы верш ці першае апавяданне было надрукавана на старонках «Чырвонай змены», пуцёўку ў літаратуру дало літаб'яднанне пры газеце. Гэтая шчырая ўдзячнасць «Чырвонцы» не раз выказвалася і выказваецца з трыбун пісьменніцкіх з'ездаў і сходаў як старэйшымі майстрамі мастацкага слова, так і сённяшнімі маладымі літаратарамі.

Літаб'яднанне пры газеце, як і сама газета, адно са старэйшых у рэспубліцы. Ужо з першых месяцаў свайго існавання ў яго ўваходзілі нашы старэйшыны літаратуры, чые імёны і сёння гучаць па-камсамольску молада і натхнёна. Горкаўскі запавет: «Нам трэба выхоўваць маладых пісьменнікаў, так называемых пачынаючых пісьменнікаў... Мы павінны выпрацаваць цэлую армію выдатных літаратараў, — **павінны»** — свята ажыццяўляў адзін з першых рэдактараў газеты, сам вядомы пісьменнік Платон Галавач. У тыя далёкія дваццатыя гады на старонках «Чырвонай змены» друкавалі свае апавяданні і вершы Янка Купала і Якуб Колас, Міхась Лынькоў і Міхась Чарот, Змітрок Бядуля і Цішка Гартны, Янка Журба і Паўлюк Трус, Андрэй Александровіч і Анатоль Вольны... Спецыяльна з адзнакаю «Для газеты «Чырвоная змена» («Красная смена») пісалі свае цудоўныя камсамольскія вершы Уладзімір Маякоўскі, Аляксандр Безыменскі, Аляксандр Жараў... Ніколі не старэючы, нібы напісаны сёння падарунак юнацтву, гучыць са старонак «Чырвонкі» верш «Камсамолу» Янкі Купалы:

Гэй ты, моладзь, наша змена,
Камсамольцы, камсамолкі,
Яж жа светла, як адменна
Свеціш колерам вясёлкі!
Маладой юнацкай славай,
Ці то ўзімку, ці то летам,
Нібы сонца, цуднай з'явай
Прамянееш ты ў сусветах.

Больш за сорак гадоў гэтаму сонечнаму і маладому вершу, які ўпершыню ўбачыў свет са старонак «Чырвонай змены», у якім і рэвалюцыйная радасць, і гонар за маладое пакаленне — ленінскі камсамол, мужны і гераічны, верны і надзейны памочнік нашай партыі.

Свае першыя творы яны чыталі і абмяркоўвалі на пасяджэннях літаб'яднання пры «Чырвонцы», а пасля і друкавалі іх на старонках газеты або знаёмілі чытачоў з іх урыўкамі. Так, напрыклад, было ў першыя пасляваенныя гады з раманам «Глыбокая плынь» маладога настаўніка з Гомельшчыны Івана Шамякіна і з іншымі творамі сённяшніх майстроў мастацкага слова.

А гэта не адзінкавы прыклад з работы літаб'яднання. Іх можна прыводзіць і прыводзіць. Бо ў рабоце нашага літаб'яднання заўсёды працавалі і па сённяшні дзень прымаюць актыўны ўдзел вядомыя паэты і пісьменнікі. Доўгі час у «Чырвонцы» працавалі Якуб Усікаў, Алесь Асіпенка, Мікола Аўрамчык, Мікола Гамолка, Артур Вольскі. Гэта яны прыкмецілі такіх цікавых паэтаў і празаікаў, як Ніл Гілевіч і Сцяпан Гаўрусёў, Уладзіслаў Нядзведскі і Генадзь Кляўко, Мікола Арочка і Алег Лойка, а потым з пуцёўкай літаб'яднання «Чырвонкі» ў літаратуру ўступіла цэлая кагорта новых імён — Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Юрась Свірка, Сымон Блатун, Васіль Зуёнак, Уладзімір Паўлаў, Анатоль Грачанікаў, Мікола Гіль.

Паўнакроўным, кіпучым жыццём жыве наша літаб'яднанне і ў апошняе дзесяцігоддзе. Каля 50 актыўных членаў — маладых рабочых і студэнтаў, людзей самых розных прафесій — адзін раз у месяц збіраюцца на чарговае пасяджэнне, каб абмеркаваць свае творы, сустрэцца з цікавымі людзьмі. А яны ў нас бываюць на кожным пасяджэнні, дзеляцца сваімі думкамі аб літаратуры, прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаванні твораў маладых і пачынаючых аўтараў. Бюро літаб'яднання заўсёды ідзе насустрач пажаданням маладых літаратараў.

Цесную сувязь падтрымлівае наша літаб'яднанне з раённымі і гарадскімі літаб'яднаннямі. Мы практыкуем праводзіць выязныя пасяджэнні сумесна з літаб'яднаннямі, якія працуюць пры рэдакцыях раённых і шматтыражных газет, на месцы аказваць практычную дапамогу. Даволі часта свае літаратурныя выпускі «Чырвоная змена» поўнасцю дае мясцовым літаб'яднанням. Толькі за апошні час нашымі гасцямі былі маладыя і пачынаючыя літаратары Аршаншчыны, Брэстчыны, Маладзечна, паэты і празаікі з трактарнага завода.

Падтрымліваючы і працягваючы сваю даўнюю традыцыю — паўсядзённыя клопаты аб маладых літаратарах, — бюро нашага літаб'яднання дзякуючы цеснай сувязі з вядомымі пісьменнікамі адкрыла нямала новых, цікавых імёнаў. Гэта малады мастак Хведар Гурыновіч з Салігорска, аграном Змітро Марозаў з Бялыніцкага раёна, педагог Уладзімір Папковіч з Віцебска, прадавец кніжнага магазіна Святлана Каробкіна з Мінска, студэнт Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума Віктар Шніп, студэнты БДУ імя У. І. Леніна Уладзімір Мазго, Антаніна Хатэнка, маладая настаўніца з Чэрвеньскага раёна Яўгенія Мальчэўская. Яны робяць толькі свае першыя крокі ў літаратуры, яшчэ зусім нядаўна толькі дэбютавалі, але іх публікацыі — красамоўнае сведчанне таго, што ў беларускую літаратуру ідзе здольная моладзь, на якую трэба звярнуць увагу і Саюзу пісьменнікаў. Да гэтага нас абавязвае і пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю», і нашы агульныя клопаты аб літаратурнай змене. Нездарма Асноўны Закон нашай Радзімы ў артыкуле 27 гаворыць аб усялякім заахвочванні і прафесійнага мастацтва, і народнай мастацкай творчасці.

Яўген КРУПЕНЬКА,
літаратурны кансультант
газеты «Чырвоная змена».

Сёлетні год для ўдзельнікаў універсітэцкага аб'яднання «Узлёт» прайшоў як бы пад знакам іх новага калектыўнага зборніка «Вёсны», што з'явіўся ў канцы мінулага года і быў прысвечаны маладымі аўтарамі 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Але разам з тым і на новыя вершы займалася ў маладых. І хоць пакуль новых імёнаў у нас не з'явілася, далейшыя творчыя пошукі аўтараў «Вёснаў», мне здаецца, могуць пасведчыць вершы будучых філолагаў і журналістаў: Вольгі Русілкі, Тадэвуша Чарнавуса, Алеся Пісьмянкова Уладзіміра Мазго, Леаніда Пранчака.

Алег ЛОЙКА,
кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».

Вольга РУСІЛКА

●

Я не баюся паўтараць другіх,
Калі хачу падзякаваць Радзіме
За неба чыстае ў вачах маіх,
За гордасць, што да самых зор уздыме,
За ўпэўненасць працоўных дзён цяжкіх,
За асалоду жыць і ў шчасце — верыць:
Я радая, што паўтару другіх,
Што ў кожным сэрцы ўдзячнасці не змерыць.

Тадэвуш ЧАРНАВУС

Святое права

Ёсць у воіна
Такое права, людзі!
Нават недаросламу юнцу
Падстаўляць расхрыстаныя грудзі
І агню, і сцюжы, і свінцу...

А калі герою ўзносім славу,
Пахавальны марш нам
Не іграць —
Ёсць у воіна святое права:
Бессмяротным быць —
Не паміраць!

Ёсць у воіна такое права!

Леанід ПРАНЧАК

Дома

Смяецца, як пляменніца, рачулка,
П'яніць духмяны пах лясных суніц.
І сэрца б'ецца радасна і гулка
Святой неўтаймаванасцю крыніц!

З лугоў мурожных, нібы самалёты,
Буслы стартуюць ў неба сіняву...
О, колькі раз у сне туды я лётаў—
Там сны мае юначыя жывуць.

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

●

Калі ў вёсцы маёй
паміраюць дзяды,
У сэрцы маім
абрываюцца струны
І дні,
быццам чорныя труны,
Калі ў вёсцы маёй
паміраюць дзяды.
Тады замаўкаюць
птушыныя спевы
І сонца на момант
згасае тады,
Падаюць долу
пакутныя дрэвы,
Калі ў вёсцы маёй
паміраюць дзяды.
Апошняга маршу
жалобныя гукі,
Не гэткія маршы
ім гралі гады!..
Рана-рана
сталеюць унукі,
Калі
паміраюць дзяды.

Уладзімір МАЗГО

Зэльва

Яшчэ прабабкі, мусіць,
Шукалі лекі ў зеллі...
Лістотай захлынуся
У зеляніне:
— Зэль-ва!..

Размашыстая ўлада
Касы —
Не размінуцца...
На вербы азірнуцца, —
Сівая, як балада...

Не з руднямі, не з гутай,
Ты з ім,
З касцом вясёлым,
Святая ім, магутным,
А не старым касцёлам.

З чым ідзеш у прафесію?

ДВУХ РЭЖЫСЕРАЎ, так непадобных адзін да аднаго, я выбрала не дзеля нейкага параўнання. Яны прыцягнулі ўвагу як дзве розныя фігуры ў маладым беларускім кінематографе, якія прадстаўляюць, калі гаварыць высокім стылем, дзве тэндэнцыі ў развіцці гэтага кінематографа. Зрэшты, кінематограф спрадвеку вызначае шляхі свайго развіцця па двух напрамках: пошукі ў рэальным, бытавым плане, у плане праўдзівасці адлюстравання і пошукі ў галіне формы, дзе палёт фантазіі аўтара дазваляе пастаянна абнаўляць прыёмы і метады, дазваляе ашаламляць гледачоў феерверкам знаходак. Ля вытокаў беларускага кінематографа можна таксама заўважыць зараджэнне дзвюх гэтых тэндэнцый—у творчасці захопленага, заўзятага вынаходніка Юрыя Тарыча і рэжысёра, які імкнецца да дакладнасці, да больш рэальнай асновы,—Уладзіміра Корш-Сабліна. Аднак дзве гэтыя тэндэнцыі ніколі не супярэчылі адна адной, узаемна пранікаючы адна ў адну, абнаўляючы і дапаўняючы адна адну.

Сёння на «Беларусьфільме» многае робіцца для таго, каб моладзь, якая прыйшла ў кінематограф, змагла адчуць сябе ў творчай атмасферы. Ды гаварыць пра якія-небудзь поспехі рэжысёраў, якія год-другі працуюць на кінастудыі, яшчэ рана. Гаварыць можна, бадай, пра Валерыя Рубінчыка і Вячаслава Нікіфарава. Для іх асабліва знамянальны год юбілею ВЛКСМ, бо творы, над якімі яны працавалі, заўсёды адрасуюцца маладым пакаленням: стужкі В. Нікіфарава «Зімародак», «Хлеб пахне порахам», «Сын старшыні», фільм «Вянок санетаў» В. Рубінчыка.

Па фільмах В. Нікіфарава можна меркаваць пра яго творчасць як пра свет рэальных, жыццёвых паняццяў, добра знаёмых гледачу. Імкнучыся да праўдзівасці, ён, як мастак, і ў будзённым жыцці ўмее заўважыць і адцяніць пачатак гераічны. Як мастак, ён сцвярджае, што характар, народжаны ў барацьбе з коснасцю, руцінай, аджываючым бытам, у барацьбе чалавека за свае ідэалы,—характар сапраўдны, дастойны развіцця і прадаўжэння. Чалавек у яго фільмах канфліктуе з акалічнасцямі. Думаецца, ёсць у гэтага рэжысёра нейкая публіцыстычная «нотка», што не прагучала пакуль на поўны голас. Адсюль і форма яго твораў—рэалістычнае палатно з тонка падмечанымі дэталямі быту, акрэсленым, абжытым светам рэчаў,—не пазбаўлены, аднак, унутранай метафарычнасці. Рэжысёр-рэаліст, ён даследуе чалавека ў складаных жыццёвых сітуацыях, выпрабоўваючы яго «на надрыў», беручы за аснову моманты, калі абуджаюцца скрытыя рэзервы асобы. Такі Зімародак, матрос Івашчанка, Якаў Русак і яго сын. Асабліва адчувальная гэта тэндэнцыя ў «Сыне старшыні», якая мне здаецца лепшай сярод трох карцін рэжысёра, хаця, думаецца, сцэнарныя хады маглі б быць больш пераканаўчымі і праўдзівымі.

Расказ пра сучасную вёску прыцягвае рэжысёра вастрынёю моманту (сітуацыя змены старшыні ўскладняецца тым, што пераемнікам становіцца старшынёўскі сын, які зусім не падтрымлівае стыль кіраўніцтва бацькі). Фільм мог бы стаць яшчэ адным з кагорты так званых «вытворчых», калі б не ўменне рэжысёра захаваць вакол чалавека атмасферу маральнага пошуку. Рэжысёр нібы прыадчыняе асаблівую заслону, якая дазваляе нам зазірнуць у душу чалавека.

Нікіфараў—мастак з ярка выражанай сацыяльнай скіраванасцю, ён даследуе жыццё, выяўляе напластаванні, якія закрываюць ад няўважлівага гледача карціну быцця. Для яго, як для сацыёлага, патрэбны факты і факты, на аснове якіх ён будуе сваю ўласную канцэпцыю мастацкага выказвання. Таму літаратурная аснова для Нікіфарава мае прынцыпова важнае значэнне. Іншая справа—не заўсёды шанцуе яму са сцэнарным матэрыялам.

Зусім іншую пазіцыю займае В. Рубінчык. Можна, верагодна, сказаць, што сцэнарый для яго—покліч да дзеяння—свайго ўласнага, нечаканага вырашэння. Думаецца, сцэнарыст В. Муратаў з цяжкасцю пазнаў сваё дзецішча ў «Вянку санетаў», таму што гэта быў просты, звычайны расказ пра тое, як два хлопцы едуць па дарогах вайны на фронт і якія з імі адбываюцца прыгоды. Калі б здымкі вёў рэжысёр-рамеснік, фільм стаў бы «яшчэ адным з многіх». Але Рубінчык пайшоў сваім шляхам і выйграў! На аснове сцэнарыя ён стварыў паэтычнае палатно, якое ўвабрала ў сябе столькі выдатных знаходак, творчых адкрыццяў, што яно ўжо не ўмяшчалася ў рамкі расказу-першакрыніцы. Элегія аб мінулым дзяцінстве, сталасці і ўзмужненні юнага чалавека пранізана духам страчанага і набытага свету. Свету паэзіі і крыху загадкавай, зашыфраванай вобразнасці. Рэжысёр стварае на нашых вачах уласную сістэму формаў выразнасці, дзякуючы своеасаблівай экранізацыі свядомасці. Ён паглыбляе змест, уводзячы ў расказ паэтычныя радкі Ахмадулінай... Вынаходлівасць і строгі адбор—рысы немалаважныя ў творчасці В. Рубінчыка. У кожным фільме ён шукае тую зачэпку, якая падкажа яму развіццё дзеяння. Вынаходлівую дэталь, якая падкажа пластычнае вырашэнне. У «Вянку санетаў»—гэта паэзія Ахмадулінай, якая ўзнавіла карціны ўласнага дзяцінства, у «Гамлеце Шчыгроўскага павета»—начны расказ героя, звернуты да спячага суседа, няздольнага на маральныя пакуты Васіля Васільевіча. У «Апошнім леце дзяцінства» (стыль «рэтра»)—тонкая стылізацыя пад кінематограф 20-х гадоў, прастата паказу падзей, менш рухомая камера; у фільме «Чырвоны агітатар Трафім Глушкоў»—дакументальныя кадры адлюстраванага часу і г. д. (Я абмінаю карціну «Магіла льва», якую мне проста не давялося ўбачыць).

Рубінчык спрабаваў сябе ў розных жанрах, і кожны раз адкрываў у кінамове нешта новае для сябе і для нас. Так, у «авантурным» жанры—у фільме «Апошняе лета дзяцінства», палатне, насычаным падзеямі, прыгодамі, мудрагелістымі паваротамі сюжэта,—аўтар як бы ўтаймоўвае сваю фантазію, прыглушае вобразнае вырашэнне фільма: кадр тут прасцейшы, больш паглыблены, засяроджаны на ўзаемадзеяннях герояў, іх адносінах. Ужо неаднаразова паказвалася па тэлеэкрану гэта карціна: зроблена яна з пачуццём гумару, з заўзятым маладым запалам. І ўсё ж аўтар нібы вяртае нашу памяць да памяці пакалення рэвалюцыйных гадоў—гэта момант, калі з-за высокага брукаванага пагорка з'яўляецца чырвонаармейскі атрад, які быццам выплывае з далечыні часу: усё выразней становяцца сілуэты коннікаў, усё бліжэй, бліжэй... І нас разам з героямі фільма зачароўвае гэтае стройнае і гарманічнае відовішча...

Рубінчык—майстар, якому хочацца давяраць, яго кінематаграфічны «шыфр» хочацца разгадваць і разважаць над ім, таму што заўсёды ў кадрах, разлічаных на разуменне гледачоў, заключаны значны сэнс. Яго фільмы не падобныя адзін на адзін, і менавіта ў гэтай непадобнасці—галоўная яго сіла як рэжысёра: ён пастаянна ў пошуку новых рэзерваў сваёй прафесіі.

Для сапраўднага мастака пошук—гэта і авалоданне формай, гэта і плён увасаблення тэмы на экране. Гэта стварэнне свайго метаду, які выражаў бы індывідуальнасць мастака, яго настрой, яго жыццёвую пазіцыю. Вячаслаў Нікіфараў і Валерый Рубінчык—рэжысёры-шукальнікі—імкнуцца сцвердзіць вобразны лад свайго творчага метаду.

М. ПУШКІНА.

ІМКЛІВАЯ МЕЛОДЫЯ КРЫЛ

Пасля яго засталася новая — пад старой бярозай —хата, пабудаваная і яго рукамі.

Застаўся малады сад, пасаджаны ім пад вокнамі гэтай хаты.

Засталася зусім адна яго матуля.

Засталіся сябры, якіх любіў ён і якія любілі яго.

Засталіся сабраныя ім кнігі.

Засталіся напісаныя ім вершы.

А сярод чарнавікоў, паэтычных варыянтаў і занатовак — чысцюткі тонкі сшытак у лінейку. Новенькі, некрануты...

Балюча гаварыць пра чалавека ў мінулым часе.

Тым пакутней, што гэты чалавек — Леанід Якубовіч — быў маім блізкім другам.

Захаваліся здымкі яго — высокага хударлявага юнака з летуценна-засяроджаным позіркам.

Леаніда Якубовіча не стала ясным летнім ранкам 1970 года. Ён працаваў на Салігорскім камбінаце — побач з роднай вёскай Радкава. У той дзень — 8-га чэрвеня — Леанід выйшаў на працу раніцай: першая змена пачыналася а шостай гадзіне. Калі спускаўся з клеццю ў шахту — здарылася бяда. На паверхню ён не вярнуўся. Яму ледзь споўнілася 22... Сёлета было б трыццаць.

Нам, жывым, суджана ўшаноўваць памяць паэта. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» падпісана да друку кніга вершаў Леаніда Якубовіча «Я з вамі, вёсны...» Гэты зборнік — спадчына. Ведаючы, які патрабавальны Леанід у сваёй творчасці, вырашана было сабраць найбольш адметныя, спелыя вершы.

Кідаюцца ў вочы ўлюбёныя паэтычныя вобразы Л. Якубовіча: сонца, раніца, сцежка, птушка, вясна («прыйдзе яна, і чалавек адчуе ўсю сваю светласць»). Ён да самазабыцця любіў родную Беларусь, любіў жыццё, умеў радавацца добрым натхнёным праявам яго, і сам, як лозунг, нёс сонца ў вачах (кажу адным з яго паэтычных выслоўяў).

Цікава, што пасля дзесяцігодкі Леанід працаваў паштавіком. Потым, адчуваючы патрэбу як мага хутчэй авалодаць сталымі літаратурнымі навыкамі, удасканаліць тэхніку творчасці, і спадзеючыся навучыцца гэтаму ў журналісцкай дзейнасці, ён уладкаваўся ў рэдакцыю газеты «Шахцёр». Але неўзабаве не вытрываў, пайшоў на шахту. Л. Якубовіч не проста летуценіў пра дабро і шчасце людзей, ён прагнуў поўнай мерай сваіх магчымасцей памнажаць іх набыткі, — і ў такім жыццёвым вопыце ўзбагачаць вопыт літаратурны.

Няцяжка заўважыць, як няўтомна і шматабяцальна пачынала сталець пяро маладога паэта. Пакрысе знікаюць з радкоў залішне прыгожыя словы, сузіральнасць і дыдактызм. З кожным новым вершам усё напружаней і паэтычна дакладней афармляецца думка. «Жыта заўсёды жнуць, калі яно добра выспее, калі зярняты, здаецца, звоняць пад жнівеньскім ветрыкам. Так павінна быць і ў пісьменніках: бярыся за пяро толькі тады, калі адчуваеш, што ўжо ўсё выспела ў душы для новага твора — так і звоніць добрымі вобразамі, добрымі думкамі...» Усё вастрэй узнімаюцца праблемы, якія хвалююць нашага сучасніка. Усё ўдумлівей пошук сэнсу жыцця, усё глыбей адчуванне ўласнай адказнасці перад Радзімай, перад гісторыяй, перад будучыняй. «А паэзія — гэта тая ж рака, у якой уся свежасць, уся чысціня яе — у глыбіні». Л. Якубовіч спасцігаў гэта і — прагнуў настаўніка, прагнуў вучобы. І як жа быў удзячны ўсім, хто асвятляў яму дарогу сваёй уважлівасцю, зацікаўленасцю ў яго паэтычным лёсе!

«Як мала я пішу! Аж страшна... І ўсё гэта нявыкрутка з часам». Рабіць усё, што трэба, каб не пуставала матчына поле, будаваць новую хату, бо ў старой жыць не было ўжо як, працаваць і вучыцца завочна ў Веддзяржуніверсітэце... У яго хапала сіл, хапала вытрымкі. А вершы пачынаюць дыхаць яшчэ большай напорыстасцю, баявітасцю, бескампраміснасцю да ўсяго нізкага, пачварнага, што засціць нам сонца.

...Аднойчы пачуў ён
Імклівую мелодыю крыл,
Светлыя гукі сонечных промняў,
Велічныя акорды лесу, —
Аднойчы спасціг чалавек музыку...

Ніна МАЦЯШ.

БАЛАДА ПРА КАМІСАРА

Хутка гледачы пазнаёмяцца з новай стужкай кінастудыі «Беларусьфільм» — тэлевізійным мастацкім фільмам «Побач з камісарам». Падзеі адбываюцца ў 20-я гады. Малы пісарчук камбеда вёскі Селішчы Федзька са сваім сябрам камісарам Будаем наладжваюць новае жыццё. А на шляху да яго паўстаюць змрочныя сілы. Федзька і яго сябры пераадольваюць цяжкасці, свята і самааддана вераць у справу, за якую аддаў жыццё камісар...

Няўдзячная гэта справа — пераказваць сюжэт фільма. Атрымліваецца зусім звычайная гісторыя. Аўтары ж фільма зрабілі яе незвычайнай. І гэта, ўпэўнена, заўважыць глядач. Заўважыць вясновы блакіт, празрысты і неабсяжны, бурлівую раку, як сімвал жыцця — новага і бясконцага, адчуе вось гэтае трыадзінства — мара, вясна, жыццё.

Фільм створаны маладым калектывам. Яшчэ нядаўна імя Аляксандра Чакмянёва, рэжысёра-пастаноўшчыка, стаяла ў цітрах невялічкай навелы або навукова-папулярнага фільма — гэта былі толькі спробы перад выхадам у мастацкі кінематограф. Сцэнарыст Вера Ганчарова зусім нядаўна скончыла інстытут кінематаграфіі. Сцэнарый да гэтага фільма напісаны ёю па апавяданнях народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Можна зразумець яе хваляванне і пачуццё адказнасці перад такой работай. І тым не менш маладому сцэнарысту ўдалося грунтоўна выявіць характары Федзькі і камісара, прычым, у арыгінальным баладна-паэтычным стылі. Аператар — Ігар Рамішэўскі. Гледачу знаёмы почырк гэтага мастака па фільмах «Бацька», «Факт біяграфіі», «Крушэнне імперыі». Калектыў, як бачым, цікавы. Аляксандр Чакмянёў гаворыць:

— У час працы мы пастаянна звярталіся да Пятра Усцінавіча Броўкі. Яго каштоўныя, мудрыя парады спатрэбіліся не толькі для гэтага фільма, але, я ўпэўнены, увайшлі ў душу кожнага з нас на будучае. Я не магу сцвярджаць, што фільм да канца атрымаўся, але ёсць рэчы, за якія нам не сорамна. Ідэя фільма — вера ў жыццё, сапраўдная і непахісная, у наш сённяшні і будучы дзень. Фільм разлічаны на дзяцей. А гэты глядач, як вы ведаеце, патрабавальны. Таму мы ўвялі ў фільм «пружынную» дынаміку, ледзь не дэтэктыўнае разгортванне падзей. Але пры ўсім гэтым мы імкнуліся перадаць паэтычнасць і непасрэднасць, эмацыянальнае, вобразнае ўспрыманне свету. У фільме ёсць нешта ад дзіцячых малюнкаў, не заўважылі?

...У казачна-дзівосным хараство ляжыць вясновая зямля. Імкліва нясе свае воды рака. Тут, на рачным узбярэжжы, нараджаецца мара. Дзеці мараць, каб была новая школа, каб была свая зямля і каб было шмат цукру. Сёння дзеці мараць зусім пра іншае. Але аб такім жа сонцы — жоўтым, з вясёлым і ўсмешлівым тварам, аб такім жа небе (абавязкова сіне-блакітным без ніводнай хмарачкі) мараць і будуць марыць яны заўсёды. Вось гэты непасрэдны, чысты колер дзіцячых малюнкаў прысутнічае ў карціне як элемент эмацыянальнай выразнасці.

У фільме няма выразна акрэсленай двухпартрэтнай кампазіцыі. Унутраная сувязь, пераемнасць поглядаў, думак, учынкаў — усё гэта перадаецца позіркам, жэстам, пачуццём удзячнасці ад камісара (С. Прысялкоў) да Федзькі (Валодзя Станкевіч). Тут няма аднаго галоўнага героя. Тут ёсць дзеці — шчырыя і непасрэдныя, гарэзлівыя і сур'ёзныя (дарэчы, дзіцячыя ролі сыграны па-сапраўднаму таленавіта). Тут ёсць дарослыя, моцныя ў сваёй адказнасці, слабыя ў сваёй нерашучасці. А ўсё разам — гэта народ, адзіны і непахісны. Не, гэта не масоўка ў прынятым сэнсе слова. Тут кожны чалавек індывідуальны, кожны значны, кожны са сваім лёсам, сваёй гісторыяй. Але яны зліваюцца ў адзіны вобраз — у нейкім агульным парыве, у адчуванні, што цяпер адбываецца вялікае і значнае для ўсіх. Усё помнім падзел зямлі. Дарэчы, колькі стужак захавалі для нас падзеі тых суровых 20-х гадоў! Але тут у адным, зусім невялічкім вобразе Міхаліны (Г. Макарава) так поўна і аб'ёмна паўстае ўвесь боль і смутак мільёнаў прыгнечаных, іх працавітасць і святая любоў. Гэта як крык, як усплёск адчаю, а колькі ў ім веры і надзеі: «Зямелька мая!» І побач маленькі камісар Федзька. Вось яна— надзея і сіла. Напэўна, гэта і ёсць галоўная тэма фільма. Вось гэта агульная мэта, якая яднае людзей, і складае пачуццёвую напоўненасць кадра: маўклівыя твары на сходцы; некалькі пар вачэй, якія глядзяць на спаленую школу; а вось ужо людзі ў працоўным запале на будаўніцтве новай школы, моцныя ў сваёй праўдзе. Альбо светлыя і ўрачыстыя твары Федзькі і камісара: «Зразумеў?» — «Усё будзе добра, дзядзечка камісар». Апантаная вера ў рэвалюцыю і гатоўнасць служыць ёй да канца перададзена акцёрамі ў вобразах камісара і Федзькі не ў аскетычнай адлучанасці, а ў прасветленай духоўнасці. Адухоўленыя твары і перш за ўсё вочы. Яны зняты буйным планам. Ці не таму буйныя планы, якіх нямала ў карціне, не здаюцца статычнымі? Насуперак традыцыйным уяўленням аб тым, што акцёру нельга глядзець у аб'ектыў апарата, глянулі на нас вочы камісара дваццатых гадоў. І ў гэтым — прамы зварот пакалення да пакалення.

Не бяда, што ў фільме бачыцца просталінейнасць вобразаў. Асноўны глядач — дзеці. А для іх павінна быць ясна, што вось гэта «нашы», а вось гэта «белякі», тут — дабро, а там зло. А вось тое, што не хапае ўнутранай дынамікі, больш яркага, каларытнага асвятлення — гэта ўжо пралікі. Характары хутчэй пададзены ў знешнім праяўленні.

А як думае сам Сяргей Прысялкоў, акцёр Маскоўскага тэатра імя М. М. Ярмолавай?

— Як вы заўважылі, амаль на працягу ўсяго фільма я вяду роль-мітынг. У фільме няма ніводнага кадра, дзе б камісар вёў маналог або дыялог. Камісар увесь час звяртаецца да народа. Вось гэта, мабыць, і абумовіла нейкую ўрачыстасць і ўзнёсласць вобраза. Іншы раз за гэтым губляецца індывідуальнасць, непаўторнасць асобы. Але мая задача— акцэнтаваць увагу на нюансах інтанацыі. Роля ў сваёй першаснове задумана як прамалінейная...

Трэба заўважыць, што акцёр адышоў ад шаблону, стандартнага вырашэння ролі. Яго камісар — не сама катэгарычнасць у скуранай тужурцы, а чалавек адной ідэі. Артыст удала выяўляе сацыяльны характар вобраза. Можа, праз гэта і паўстае буйны план часу.

Фільм вырашаны ў адзінай колеравай поліфаніі. Напэўна, гэта вымушае ўспомніць цудоўныя ўзоры жывапісу — саўрасаўскія светацені, павольнае і імклівае абуджэнне прыроды. Празрыстае, бялёсае, веснавое паветра. Колер адроджанай, узаранай зямлі не шэры, а з просінню. Такі колер усёй стужкі. На фоне празрыста-акварэльнага паветра бадзёра і ўпэўнена лунае чырвоны сцяг, які набывае сімвалічную асэнсаванасць. Ззяючая чырвань маленькага сцяжка ў першых кадрах потым запоўніць увесь экран. І недзе там, за танюсенькімі парасткамі маладняку, па веснавой пашы ўзнімаецца гурт дзяцей. Спачатку як шэранькі камочак, а потым бліжэй і бліжэй. І вось ужо над усёй зямлёй узнялі яны чырвоны сцяг. Гэты кадр, мне здаецца, набывае пранізлівую адухоўленасць. Тут майстэрства рэжысёра, аператара і мастака злілося ў адно і ўтварыла трыадзіны вобраз — маладосці, вясны, адраджэння жыцця. Вобраз-сімвал, вобраз-ідэя. Тут кожны план прадуманы, пабудаваны, асэнсаваны. ...«Дзядзечка камісар! Таварыш камісар!» — надрыўна гучыць голас Федзькі. Вясна ўпэўнена ўбіраецца ў зеляніну, а камісара няма. Кроплі крыві чырванеюць на гімнасцёрцы. «Дзядзечка! Не дам!» Федзька засланяе ад куль цела загінуўшага таварыша. У сцэне скарыстаны буйны план. Вельмі доўгі і эмацыянальна напружаны — ён чыста тэлевізійны. Тут, у развязцы фільма, прадумана ўсё да дробязей: кампазіцыя, колер, музыка (кампазітар І. Лучанок).

Фільм па жанравых прыкметах нагадвае баладу, дзе рамантычная ўзнёсласць зліваецца з лірычнай апавядальнасцю. Кожны кадр пабудаваны менавіта ў такой стылістыцы. Вось дзеці ў начной цемры сядзяць ля вогнішча. Сама атмасфера напружаная і таямнічая. «І ўстаў тады камісар, дужы і смелы. Сцены рассоўвае, горы варочае» — расказвае Федзька. Альбо яшчэ... І сказаў камісар: «Глядзі, Фёдар... сама вясна, акурат, да нас у госці завітала». Федзька цэпнуў плячамі. «Дык гэта ж цётка Сымоніха». А. Сымоніха (артыстка Н. Разанцава) стаіць і неяк прыгожа і горда глядзіць ўдалячынь. Глядзіш на яе і ўяўляеш сабе вобраз жанчыны 20-х гадоў.

Так гістарычная праўда броўкаўскіх апавяданняў набыла новае, тэлевізійнае аблічча. Ішло нібы выпрабаванне іх на тэлевізійную моцнасць. А ўрэшце — у выніку ўзаемнага ўзбагачэння — нарадзіўся новы мастацкі твор, які набыў самастойнае жыццё.

Дададзім толькі, што ў фільме сюжэтныя лініі літаратурнага твора не вычарпаны да канца. Але ў яго стваральнікаў ёсць задума яшчэ раз звярнуцца да апавяданняў П. Броўкі і прадоўжыць работу. Пакуль гэтая задума толькі выношваецца, але будзем спадзявацца, што глядач яшчэ сустрэнецца са знаёмымі героямі.

Л. САЯНКОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

Леанід ЯКУБОВІЧ

●

Нараджаемся не для смерці,
Нараджаемся мы, каб жыць,
Ды страла нацэлена ў сэрца,
Праз вякі ўжо страла ляціць.

Чорны продак не быў прарокам
(Лук ды стрэлы — залог жыцця),
Ён не думаў, што так глыбока
Гэты свет зялёны працяў.

Быў суседства закон трывожны,
Быў давер, як напяты лук.
Рух адчайны вопыт памножыў
На свядомасць мільёнаў рук.

Шлях стралы дарогі намеціў,
Кроў, як вехі вякоў, гарыць...
Нараджаемся ж не для смерці,
Нараджаемся мы, каб жыць.

●

Між ціхіх ліп, між звонкіх сосен,
У зялёны май пайшлі ўдваіх.
Ім травы ногі шчодра росяць,
І ноч для іх, для іх адных.

Не трэба сцежак пратаптаных —
Вясна гасцінцам пралягла.
Прыкрыла ночка закаханых
Пяшчотай сіняга крыла.

Вянок вянчальны — неба ў зорах,
А маладзік — вясёлы сват.
Ім падарункі — кветак мора,
І пошум дрэў, як спеў дзяўчат.

Рука ў руцэ... І сэрца к сэрцу...
І шчасце вусны п'юць і п'юць...
Вясельным май у нас завецца,
Шчаслівым май у нас завуць!

Іду ў жыццё

Адным — каб вецер, каб дарогі,
Каб неба шыр над галавой,
І не бяда, што шмат трывогі,
Што вечна ў сэрцы неспакой.

Любую плынь бяруць іх вёслы, —
Плывуць і не клянуць раку...
Люблю людзей з падобным лёсам,
Люблю, хто з сонцам — за руку.

Другім жа трэба ціш, утульнасць,
Надзьмуты ветразь — не для іх;
Жывуць, дрымотаю атулены,
У бярлогах модненькіх сваіх.

А я — не так... А мне — каб сонца
Ды песень радасны прыбой!..
Не для мяне затокі сонныя;
Я з вамі, вёсны, вам я свой!

●

Кроў, кажуць, не дыміцца,
Не ўспыхвае агнём...
З свянцонае крыніцы
Ваду не п'ём.

Плады апалых ісцін —
Міззярны плён.
Яны цяпер — не выйсце,
Яны — палон.

Няма граніц адкрыццям
Крынічных жыл.
Нам нельга паўтарыцца
У тых, хто жыў.

Шукаць сваю крыніцу,
Пакуль жывём!
...Кроў наша задыміцца
І выбухне агнём.

●

Кастусю КАЛІНОЎСКАМУ

Вяртаюся ў даўнасць. Прыходжу, як на суд.
Нясу свае учынкі, ўсе клопаты нясу.
Трывожныя эпохі... Гарачыя крыжы...
Ці горача я верыў і ці трывожна жыў?
Распятыя за сёння, узнятыя, як сцяг,—
Вы верылі да скону у сонечны працяг.
Ішлі гады, мінулі, ды велічны парыў
Неслі ў сэрцах мужных другія бунтары.
Агнём палае неба і водбліск — у вачах.
Магчыма, дзень пачаўся; магчыма, дзень зачах?
Заве у даль дарога, да строгай вышыні,
Пачатак ёй пакладзен ва учарашнім дні.
...Вяртаюся у даўнасць. Прыходжу, як на суд.
Нясу сваю трывогу, сумненні ўсе нясу.

●

Аднойчы да чалавека прыйшло свята...
Неспадзяванае, як першы снег,
Шчаслівае, як адчуванне палёту,
Урачыстае, як узыход сонца,
Прыйшло да чалавека свята.

І вочы яго засвяціліся,
Як свецяцца яны ў сляпых,
Якія пачынаюць бачыць;
І спыніўся ён засяроджана,
Як спыняюцца глухія,
Адкрываючы першы гук.

Аднойчы да чалавека прыйшло свята...
Аднойчы пачуў ён
Імклівую мелодыю крыл,
Светлыя гукі сонечных промняў,
Велічныя акорды лесу, —
Аднойчы спасціг чалавек музыку...

Публікацыя Н. Н. ПОНТУС.

ІХ СПЕЦЫФІКА — ТВОРЧАСЦЬ

Многае тут—як у пакоі студэнцкага інтэрната: на сцяне — мудрагелісты калаж самаробных плакатаў; там-сям па кутках — гітара, тэнісныя ракеткі, папка з паперамі, спартыўная вопратка. Радыёпрыёмнік «складае кампанію» сваім гаспадарам у іх кароткую вольную часіну, а пад іх гарэзлівы настрой ажывае зялёнае поле настольнага футбола — акурат хлапечае хобі! Перад гэтымі люстэркамі рыфмуецца, часам, дасціпны калектыўны верш... Ды хіба мог не стаць для іх гэты пакой, як кажуць, другім домам? Раніца і частка дня аддадзены артыстычнай «кухні». Вечар заняты «прыёмам гасцей»: спектакль для гледача. І толькі рэшткі закуліснага часу—на ўсё іншае. А іншае — гэта і сям'я, і грамадскія справы.

Той жа пакой («грымёшка» групы артыстаў балета)—яшчэ і пост сакратара камсамольскай арганізацыі Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра БССР... Камсамолец-школьнік, камсамолец-студэнт, камсамолец на вытворчасці, камсамолец-воін — «аб'екты асвоеныя» і для перыёдыкі, і для мастацкай літаратуры. Больш загадкавыя словы «камсамольскі калектыў тэатра оперы і балета». Шчыра прызнацца, казыча ў думках вузельчык пытанняў: ці ёсць рэзервы грамадскай дзейнасці, калі творчы графік паглынае шмат часу? Наколькі рэальнае існаванне адзінай мэтанакіраванай работы, калі артыст балета амаль і да пенсіі падпадае пад камсамольскі ўзрост, а спевакам, хаця і пачаткоўцам, пераважна —пад трыццаць? Якім чынам наладзіць сацыялістычнае спаборніцтва, скажам, паміж музыкантамі аркестра, харыстамі і мастакамі-бутафорамі?..

Мы размаўляем з камсамольскім сакратаром тэатра А. Няцветавым. Эмацыянальная логіка майго субяседніка дапамагае паверыць, што за яго вытанчана-рамантычным абліччам не толькі праца да самазабыцця, але і клопат пра сваіх маленькіх дзяцей, цікавасць да падзей у краіне і за мяжой, моцныя захапленні джазавай музыкай, аўтамабілямі, падарожжамі... І што ён такі — не адзін тут.

Больш чым 70 работнікаў розных катэгорый аб'яднаны ў камсамольскай арганізацыі тэатра. З іх каля паловы — у балеце, астатнія ў аркестры і хоры, у пастановачнай частцы, сярод оперных салістаў. Увогуле, пра тутэйшую артыстычную моладзь вядома нямала. Мы памятаем самы першы цудоўны вечар, наладжаны перад спектаклем у тэатральным фае энтузіястамі камернага аркестра. Мы ведаем той арэол захаплення і спрэчак, якім ахінута імя самага маладога галоўнага балетмайстра краіны В. Елізар'ева. У нашым бачанні жывуць вострыя, гратэскавыя характары з нядаўніх пастановак — удава кніжнага гандляра з «Джардана Бруна» ў выкананні В. Цішынай, Рыбнік з «Ціля Уленшпігеля», сыграны С. Манзалеўскім. Мы аддаём належнае самастойнай працы хормайстра Н. Ламановіч у спектаклях «Дон Паскуале», «Ціль Уленшпігель». Для нас дарагія радкі саюзнага друку, дзе добразычлівай рукою выведзены імёны А. Дзедзіка, А. Рудкоўскага, Л. Колас, Л. Сінельнікавай, Т. Яршовай... І мы не забываемся, што ўжо не першы сезон тэатр за работу з творчай моладдзю займае вядучае месца ва Усесаюзным аглядзе-конкурсе.

Наўрад ці варта браць у разлік, хто з іх трымае чырвоную кніжачку члена ВЛКСМ толькі трэці-пяты год, а хто фармальна «перарос» ужо свой камсамольскі білет. Тым больш, што са слоў А. Няцветава відаць, якая цэласная супольнасць партыйных, камсамольскіх, адміністрацыйных органаў уплывае на дзейнасць савета творчай моладзі тэатра. Камсамольцы наведваюць Ленінскія ўрокі, вывучаюць найважнейшыя палітычныя дакументы. Паняцце «акцёр» напоўнена для іх высокім сэнсам: пры палітычнай непісьменнасці, ідэйнай беднасці ты «пусты» як творчая асоба. З чым, акцёр, выйдзеш на сцэну, да гледача?

За тры гады работы на камсамольскім пасту А. Няцветаў заўважыў па сваіх таварышах пераканальную залежнасць актыўнасці творчай ад актыўнасці грамадскай. Больш абгрунтаванымі робяцца асабістыя комплексныя планы, заяўкі ролі; пашыраецца «вытворчы» кантроль: ад якасці рэпетыцый да арганізацыі прымерак абутку. А шэфская работа ўвогуле — прывілея моладзі: 18 маладзёжных канцэртаў у леташнім сезоне ды больш чым 60 выездаў моладзі ў складзе змешаных брыгад. Іх многа, вартых увагі, ухвалы. Хіба што задаволіцца некалькімі «свежымі» прозвішчамі: М. Жылюк, В. Скарабагатаў, Н. Філіпава, Л. Логвінава, І. Моўчан...

Увесь калектыў жыве яшчэ цеплынёю маскоўскага прыёму, поспехам, які спадарожнічаў на сталічнай сцэне новым беларускім творам; цудоўнымі ўрокамі мужнасці, чалавечнасці і хараства, якімі стала паездка ў Зорны Гарадок. Тры працаёмкія гастрольныя тыдні былі асаблівай загартоўкай для тых, хто прыйшоў на сцэну нядаўна. З новым імпэтам пачнуць яны рыхтаваць юбілейныя шэфскія канцэрты для мінчан і вяскоўцаў, а для сябе — арганізоўваць сустрэчы з ветэранамі працы і арміі, наладжваць сяброўства з моладдзю іншых сфер мастацтва, спаборнічаць паміж сабой у спорце, сачыняць вясёлыя лібрэта тэатральных «капуснікаў». Мабыць, давядзецца ім зрабіць першыя крокі на эксперыментальнай сцэне: паставіць для дзяцей оперу паводле пушкінскай «Казкі пра Папа...» Мабыць, давядзецца наладзіць і эксперыментальную сцэну для харэаграфічнага цэха, з якім, дарэчы,— ад пастаноўшчыка да кардэбалету — стасавалася б імя камсамольска-маладзёжнай трупы.

А пакуль — чарговая прэм'ера: балет К. Хачатурана «Чыпаліна», удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. З калектывам працуе вядомы балетмайстар Г. Маёраў. Незнаёмы рэжысёрскі почырк — гэта для акцёраў заўсёды нова, нечакана, цікава. Як пра спектакль і для дарослых гаворыць пра «Чыпаліна» А. Няцветаў, адзін са шматлікіх удзельнікаў пастаноўкі. Маладыя захоплены здаровай, аптымістычнай мараллю светлых вобразаў казкі Дж. Радары. Яны хацелі б, каб іх акцёрскую веру ў матэрыял падзялілі па той бок рампы.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

НА ПОКЛІЧ ТРУБЫ, ПА ЗАГАДУ СЭРЦА

ГАВОРАЦЬ ВЫКАНАЎЦЫ РОЛЯЎ І СТВАРАЛЬНІКІ СПЕКТАКЛЯЎ ПРА КАМСАМОЛІЮ

Тыя, хто бачыў спектакль «Гута» па п'есе Р. Кобеца, як і яго ўдзельнікі, і сёння помняць тое ўзрушанае прызнанне, якое зрываецца з вуснаў маладога рабочага Сцяпана Цыганка. У адказ на забарону расказваць каму-небудзь пра новую машыну, бо яна раптам і «не пойдзе», ён горача гаворыць:

— Машына — вярняк! Пойдзе! Усіх здзівім. А вось тут (паказвае на мадэль машыны) і дошчачка такая медная будзе: «Шкловыдзімальная бутэлечная машына канструкцыі каваля Змітрака Іванавіча Мароза. Дапамагаў яго памочнік С. Цыганок — член ЛКСМ з дваццаць восьмага года...»

Цыганка іграў У. Уладамірскі. Прамовіўшы гэты маналог, ён дадаваў апошні вокліч радаснага здзіўлення: «Ух ты! Ажно галава кругам ідзе!» І зала сустракала гэты маніфест маладога рабочага выбухам апладысментаў. Камсамолец з дваццаць восьмага адчуваў сябе гаспадаром жыцця, гаспадаром свайго лёсу і з гонарам ставіў сваё імя побач з імем кадравага майстра, сцвярджаючы тым самым высокую годнасць чалавечай асобы.

Падлетак, юнак, малады чалавек у віры рэвалюцыйнай перабудовы грамадства — вось галоўны прадмет мастацкага даследавання і сцэнічнага ўвасаблення з першых гадоў існавання беларускага савецкага тэатральнага мастацтва. «Што ты зрабіў для рэвалюцыі?» — пытанне, якое задавалі сабе і сваім равеснікам героі адной з самых першых п'ес на сучасную тэматыку, якой была драма «Чырвоныя кветкі Беларусі» В. Гарбацэвіча. Станаўленню характара маладога грамадзяніна Краіны Саветаў прысвячаліся пастаноўкі твораў К. Крапівы, У. Біль-Белацаркоўскага, А. Карнейчука, А. Афінагенава, дзе ролі падлеткаў выконвала народная артыстка БССР Ірына Фларыянаўна Ждановіч. Потым яе гераіні ў п'есах «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «Маладая гвардыя» паводле рамана А. Фадзеева, «Гэта было ў Мінску» А. Кучара трымалі экзамен на грамадзянскую сталасць перад пагрозай смерці ад фашысцкай кулі — і перамагалі.

Карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» спытаў Ждановіч: што акрыляла і спрыяла найбольш глыбокаму паказу вобраза маладога сучасніка першымі пакаленнямі купалаўцаў?

— Рамантыка рэвалюцыі, — сказала Ірына Фларыянаўна.— Мы былі ўдзельнікамі стварэння новага грамадства і новай культуры. Нас захапляла рамантыка штодзённых будняў, якія непазнавальна змянялі аблічча краіны і аблічча людзей. Мастацтва вучыла нас з безлічы назіранняў і ўражанняў мітуслівых дзён здабываць праўду жыцця, якая магла б захапіць людзей харастворм змагання і перамог. Мы вучыліся перадаваць зычнасць мітынговых натоўпаў і цішыню падпольных нарад. Калі ў 1957 годзе я ставіла драматычную паэму М. Святлова «Праз дваццаць гадоў», то мяне і маладых тады выканаўцаў надзвычай усхвалявалі словы адной з дзейных асоб: «Гэта ў часы французскай рэвалюцыі гаварылі з бочкі або з барыкады. А ў Кастрычніцкую рэвалюцыю можна сядзець на крэсле і размаўляць, і ўсё роўна гэта будзе ўзрушальна...» Раскрыццё рамантыкі, сугучнай часу, і аддае тэатр свае творчыя намаганні...

Сапраўды, немагчыма назваць імя беларускага акцёра, які не меў бы ў сваім рэпертуары роляў маладых людзей, камсамольцаў, для якіх вышэйшай мэтай было і застаецца жаданне быць вартымі нашчадкамі гераічнай славы бацькоў і дзядоў. Рэвалюцыя называе сваіх герояў, бо адкрывае чалавеку прастору для дзейнасці на карысць грамадства, якое шануе кожны ўклад у агульную справу. Рамантыка працягвалася, і гэта адчуваў рабочы гуты Сцяпан Цыганок. Гэта адчулі і персанажы спектакля «Хлопец з нашага горада» па п'есе К. Сіманава, адзін з якіх так прадэкламаваў: «А ведаеш, усё ж такі здорава гэта прыдумана, дарагі, што будуць ставіць бюст героя там, дзе ён нарадзіўся. У тым гарадку, дзе гуляў у «казакі-разбойнікі» і ганяў галубоў, — стаіць твой бронзавы бюст, і ўсе хлапчукі горада хочуць быць падобнымі на цябе. Яны ідуць міма твайго бронзавага партрэта і гавораць: «Гэта ж — хлопец з нашага горада!» А пра саміх сябе думаюць: «А чым мы горшыя?»

Купалаўцы іграли сіманаўскага «Хлопца з нашага горада» ў цяжкія гады вайны. І вера ў нашу перамогу працінала гэты маніфест маладога чалавека саракавых гадоў, які ганарыўся сваім найцяжэйшым і такім высакародным абавязкам: асабістым подзвігам наблізіць перамогу...

На творчым рахунку галоўнага рэжысёра Брэсцкага драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі народнага артыста БССР Георгія Волкава шмат пастановак, дзе па-мастацку раскрываецца маральнае аблічча маладога патрыёта, дзе сцэна далучае гледачоў да складанага працэсу самапазнання і пошуку свайго месца ў жыцці маладым чалавекам нашых дзён. І вось што ён сказаў:

— Немагчыма ўявіць сабе тэатр такога кірунку, як наш, без п'ес К. Сіманава, А. Арбузава, Б. Гарбатава, В. Розава, без інсцэніровак раманаў А. Фадзеева і М. Астроўскага. Сцэна актыўна сцвярджае ідэал маладога патрыёта. І мы прыкладаем шмат сіл, каб на падмостках былі героі, якіх глядач пазнае, якім ён верыць, прыклад з якіх яму хочацца браць. Без надакучлівага і прасталінейнага маралізатарства камсамольскі тэатр закліканы выхоўваць тых, хто сёння запоўніў партэр і балконы. Таму мы не гартаем старонкі былога і не робім здымкі з сённяшняга дня, а паглыбляемся ў матывы паводзін маладога чалавека на вайне і ў мірныя будні. Тэатр — не стэнаграфіст. Праўда сцэнічнага вобраза ўбірае ў сябе і высокую праўду мастацкага абагульнення, арганічнай узнёсласці, рамантыкі. Працуючы з драматургамі К. Губарэвічам, чыя «Брэсцкая крэпасць» ідзе на сцэне дваццаць пяць гадоў, А. Дзялендзікам, І. Козелам, А. Гутковічам і Ф. Казоўскай, А. Маўзонам, П. Васілеўскім, А. Пінчуком, Я. Шабаном, Я. Пасавым, тэатр у Брэсце свядома шукаў розныя аспекты творчага ўвасаблення вобраза маладога чалавека, каб і ў арыгінальным рэпертуары даследаваць неадназначны характар сучасніка. Наш клопат — каб гераізм не ператварыўся ў святле рампы ў хадульную патэтыку, а натуральнасць паводзін не выглядала шэрым падабенствам да аматарскага фотаздымка. Адным словам, калі ідзе размова пра камсамолію і яе справы, зала павінна перажываць разам з акцёрамі. Інакш ніякага выхавання не будзе...

Гледачы могуць прыгадаць мноства работ беларускіх тэатраў, якія выклікалі і выклікаюць сапраўднае суперажыванне залы таму, што адбываецца на падмостках з героямі спектакляў. Напрыклад, коласаўцы так ставілі і іграліі «Алазанскую даліну» К. Губарэвіча і І. Дорскага, «Андрэя Лабанава» паводле рамана Д. Граніна «Шукальнікі», «Крыніцы» і «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна, «Вайну пад стрэхамі» паводле А. Адамовіча, «Чатыры крыжы на сонцы» А. Дзялендзіка, «Сталявараў» Г. Бокарава, «Не трывожся, мама!» Н. Думбадзе, «А досвіткі тут ціхія...» Б. Васільева, «Салаўіную ноч» В. Яжова, «Разгром» паводле А. Фадзеева, што ў сталага наведвальніка складвалася поўнае ўяўленне аб унутрана-дыялектычным і пэўна акрэсленым працэсе крышталізацыі чалавечага «я» ў розных гістарычных умовах. Тое ж і афіша Рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі, дзе, зноў жа, як і ў брастаўчан, на адным з першых месц пазначана яшчэ на начатку шляху інсцэніроўка рамана «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага. «Жыццё табе даецца аднойчы...» — гэты маналог, вядомы кожнаму савецкаму падлетку са школьных гадоў, стаў як бы эпіграфам да дзейнасці цяперашняга тэатра. Заслужаны артыст БССР Барыс Барысёнак сказаў карэспандэнту «ЛіМа»:

— Мабыць, ні адна сцэна не ахоплівае такую ўзроставую амплітуду, як наша. Хлопчыкі і дзяўчынкі — абавязковыя персанажы нашых спектакляў. І ў лепшых пастаноўках мы заўсёды імкнёмся прагназіраваць будучыню вось гэтай маленькай чалавечай асобы. Іграем так, каб арыентаваць і яго аднагодкаў у зале на добрыя пачуцці і добрыя справы. Схематычна кажучы, тлумачым на мове свайго мастацтва, што такое «добра» і што такое «дрэнна». З сумы яркіх эмацыянальных уражанняў, якія атрымлівае наведвальнік нашага тэатра, ён фарміруе свой ідэал. Вядома, не толькі з сумы тэатральных уражанняў: тут мы — саюзнікі і спадарожнікі школы, бацькоў, камсамола. Шчаслівыя тыя спектаклі, якія могуць узрушаць юнага гледача так, быццам ён толькі сёння і толькі пад уздзеяннем нашага сцэнічнага відовішча штосьці важнае для сябе адкрыў, зразумеў глыбей, адчуў сэрцам... Якая гэта дарагая для нас з'ява — прасвятленне пачуццяў і думак гледача!..

Амаль дваццаць гадоў назад І. Мележ напісаў, а купалаўцы паставілі п'есу «Пакуль вы маладыя». Вуснамі непаўторнага артыста Б. Платонава прафесар Грачоў даваў там наказ маладым вучням і прадаўжальнікам:

— Не спыняйцеся! Не растрачвайце сябе ўпустую!.. Працуйце дзень за днём! Пакуль маладыя!...

Святкуючы юбілей камсамола, наша грамадства адчувае і такі наказ як эстафету першых пакаленняў юных бальшавікоў. Эстафету прымаюць маладыя!

ВЕСНАВОЕ РЭХА

Думаю, не памылюся, калі скажу, што сярод тых, хто вызначае якасна новы этап у развіцці сучаснага маладога (а не маладзёжнага!) выяўленчага мастацтва рэспублікі, пачэснае месца належыць яркай постаці на дзіва здольнага, творча-актыўнага мастака Алеся Марачкіна. Тое здаровае, па-сапраўднаму творчае ажыўленне ў колах мастацкай моладзі рэспублікі, што назіраецца ў апошнія гады, звязана і з пільнай увагай да творчай моладзі з боку партыі і ўрада і з актыўнай творчай і грамадскай дзейнасцю яе найбольш таленавітых прадстаўнікоў — такіх, як Алесь Марачкін, Віктар Маркавец, Уладзімір Савіч, Уладзімір Тоўсцік, Мікола Купава, Мікола Ісаёнак, Аляксандр Пашкевіч. У кожнага з іх выявілася сваё творчае аблічча, іх яднаюць змястоўныя вобразна-пластычныя прынцыпы мастацтва, любоў да сваёй зямлі, да багатых нацыянальных традыцый, назапашаных беларускім народам на працягу доўгага і ў многім супярэчлівага развіцця. Ва ўсіх маладых праступае імкненне да стварэння духоўна-філасофскіх, новых па змястоўнасці вобразаў. Яны адзіныя ў стратэгічным накірунку творчасці — зрабіць свет лепшым, вартым чалавека, берагчы мігатлівы ліхтар духоўнасці, маральнай чысціні асобы. Да іх з поўным правам адносяцца словы вядомага ўкраінскага паэта Барыса Алейніка: «Яны ўсведамляюць сваю адказнасць не толькі за ачаг продкаў, але і за агонь вялікага нашага брацтва, за ўсю планету, яе сённяшняе і надыходзячае».

Алесь Марачкін, ці проста Мара (так падпісваецца мастак пад сваімі працамі), паюнацку зухавата расчыніў дзверы, літаральна ўварваўся ў мастацтва кампазіцыямі, прысвечанымі беларускім народным абрадам, тэме вёскі. Адбылося гэта ў 1975—76 гадах. Працы «Гуканне вясны», «Нас кавалі ў полымі», «Нацюрморт з дранікамі», «Бабка Марыля», «Мара пра палёт» выклікалі спрэчкі, прыцягнулі ўвагу і, як любая сапраўдная з'ява, былі неаднаразова адзначаны ў друку. А палатно «Гуканне вясны» знайшло месца ў пастаяннай экспазіцыі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

Канечне, нельга не сказаць і пра тое, што гэтаму паспяховаму ўваходу папярэднічала і пэўнае «шумавое афармленне». На пачатку мастак свавольнічаў у форме, спрабаваў запазычваць форму модных еўрапейскіх жывапісцаў. Палотны «Касі каса, пакуль раса», «Чэроўная казка» не вызначаліся індывідуальнасцю, гэта былі хутчэй «фармалістычныя практыкаванні» са спробай адкрыцця ўласных формаў і тэматыкі. Усё гэта ішло не ад беднасці, а ад шчодрасці таленту, які з прыходам вопыту раскрыўся ў цікавых, філасофска-алегарычных кампазіцыях, цесна звязаных з традыцыямі беларускага народнага жыцця, асаблівасцямі нацыянальнага светаўспрымання, з фальклорам.

«Гуканне вясны» — першае веснавое свята беларусаў; яна ж, карціна, — першая ўдача мастака. Паводле традыцыі нашых продкаў, пачынаючы з 2 лютага і па самы Купальскі дзень, вясковыя дзяўчаты спявалі «вяснянкі», якія суправаджаліся кліканнем («гуканнем») вясны. Амаль кожны вечар дзяўчаты групамі выходзілі на бераг ракі ці возера або ў поле і спявалі пяшчотныя, крыху сумныя і задуменныя песні-прашэнні, песні-спадзяванні на хуткае сонечнае цяпло, на шчодрасць зямлі, на шчаслівы лёс.

Менавіта гэтую важную ў жыцці кожнага земляроба падзею-абрад раскрыў мастак у карціне «Гуканне вясны». Гэта не жанравая сцэна, не апавяданне, урэшце, не ўспамін пра забыты абрад—гэта светаўспрыманне мастака, занатаваная ў жывапісе ідэаграма вечнасці Жыцця, разумення чалавекам прыроды свайго існавання, сувязі з сусветам.

Кампазіцыя твора простая. За вёску ўрачыстыя і велічныя выйшлі чатыры маладзіцы клікаць вясну. Маладзейшая, відаць, спрытнейшая жанчына паспела нарваць букецік пралесак. Папарна ідучы з двух бакоў карціны, яны нібы сустракаюцца пад шатамі вярбы, утворанымі арнаментальна ўкладзеным веццем і бурштынам перасыпаных пушыстых коцікаў. Па-веснавому апранутыя ў народнае адзенне, устрывожаныя магічнасцю заклінання, яны нібы зліліся з прыродай, застылі ў песні, чакаюць ад жыватворных сіл рэха-адказу. Іх галасы перадаліся вербам, вытканым з рытмічна рухомых сілуэтаў веццяя, якія вібрыруюць, як струны прастору, дзе лунаюць птушкі і плывуць аблокі.

Адухоўленыя, пранікнёныя твары жанчын адкрыты ветру і сонцу. Вобразы поўныя значнасці, авеяныя паэтычнай фантазіяй. Белыя веснавыя кветкі, птушкі, нізкае веснавое сонца ўзвышаюць драматызм дзеяння, падкрэсліваюць чысціню чалавечых пачуццяў і жаданняў.

Неспакойнаму, узрушана-напружанаму дзеянню абраду дапамагае і халодная блакітна-срабрыстая гама твора, ускладнёная тэхніка пісьма. Ва ўсім разліта высакародная строгая прыгажосць — сведчанне багатай духоўнай культуры беларускага народа.

Прадаўжэннем тэмы абрадаў з'яўляецца арыгінальнае і багатае на асацыяцыі палатно «Птушкі», якое экспануецца зараз на маладзёжнай выстаўцы.

Птушкі, што кінулі гнёзды з недаседжанымі яйкамі ў спадзяванні на большае святло і цяпло чужой неспазнанай планеты, у нечым нагадваюць мне людзей, што калісьці ў пошуках лепшага кавалка хлеба адарваліся ад родных гнёздаў і апынуліся на чужыне ў варожым і жорсткім свеце капіталу. Параўноўваючы лёс птушак з лёсам людзей, А. Марачкін заклікае яшчэ мацней любіць сваю Радзіму, шанаваць сваіх бацькоў, трымаць непарыўную сувязь з народам, на крылах якога мы падняліся. Інтэрпрэтацыя даўніх абрадаў у палотнах Марачкіна заўжды пранікнута духам сённяшняга дня.

Нарадзіўся Алесь Марачкін у 1940 годзе ў вёсцы Язёры Чэрыкаўскага раёна, тут правёў дзіцячыя і юнацкія гады. Менавіта ўражанні і ўспаміны тых год сёння знаходзяць водгук у лепшых творах мастака. «Нацюрморт з дранікамі», «Мара пра палёт», «Бабка Марыля» вызначаюцца народнасцю, паэтычнай умоўнасцю, экспрэсіяй формы. Гэтыя якасці шмат у чым вызначаюць характар яго творчасці і даюць падставу гаварыць пра ўнутранае ўздзеянне культуры і побыту вёскі на мастацкую індывідуальнасць аўтара. Амаль у кожнай працы мастака мы адчуваем хваляванні за лёс чалавека, за яго сувязь з прыродай. Гэтыя хваляванні, адказнасць сугучны сёння нашаму агульнаму непакою за лёс чалавека на зямлі, за лёс усяго жывога на ёй. Якраз у светаадчуванні, светаўспрыманні вясковага жыхара, лічыць мастак, найярчэй прасочваецца гэтая сувязь чалавека з прыродай, зямлёй.

Мастак шмат ездзіць па Беларусі, малюе і вывучае культурную спадчыну, адкрывае новыя пласты ў творчай дзейнасці народнага мастака Язэпа Драздовіча. Прайшоўшы яго сцежкамі, Марачкін сабраў унікальныя працы Драздовіча, успаміны людзей, з якімі ён сустракаўся. Адначасова была сабрана цікавая калекцыя народных маляваных дываноў, якія дзякуючы дапамозе яго сяброў, мастакоў Віктара Маркаўца і Яўгена Куліка, адроджаны да новага жыцця і экспанаваліся на першай рэспубліканскай выстаўцы народнага малявання. Пад уражаннем яркіх, мажорных дываноў, пасвойму іх інтэрпрэтуючы, А. Марачкін стварае паэтычны вобраз беларускай дзяўчыны ў партрэце «Алена з Прошчыц».

Яшчэ адна тэма вабіць Алеся Марачкіна — вобразы нацыянальных паэтаў і мастакоў. Партрэт (дакладная назва «Нас кавалі ў полымі») палымянай рэвалюцыянеркі-дэмакраткі, паэтэсы Алаізы Пашкевіч (Цёткі) напісаны да 100-годдзя з дня яе нараджэння,— значнае дасягненне беларускага партрэта 70-х гадоў.

У творы перададзены не толькі знешні воблік выдатнай паэтэсы сам па сабе, але і вобраз яе, як чалавека, трыбуна і творцы ў хвіліну глыбокага роздуму. У паглядзе, звернутым удалячынь, у характэрных рысах твару, у строгай паставе і руху прыгожых рук, што трымаюць «Нашу ніву»,— ва ўсім крыху рамантызаваным вобліку Цёткі мастак падкрэслівае высокі інтэлект, багацце ўнутранага свету.

Пры ўсёй сучаснай манеры пісьма характар мастацтва А. Марачкіна выразна нацыянальны. Праяўляецца гэта не ў непасрэдным запазычанні, тым больш паўтарэнні ці капіраванні элементаў народнага мастацтва, якое семантычна звязана з багатым абрадавым фальклорам, а ў далучэнні да духоўнай, культурнай традыцыі Беларусі мінулага і сённяшняга. Мастак захапляецца беларускай літаратурай (пільна сочыць за ўсімі навінкамі), цікавіцца музыкай, народнай песняй і харэаграфіяй. Як выкладчык тэатральна-мастацкага інстытута, ён плённа ўплывае на фарміраванне будучага пакалення мастакоў. Ён не проста таленавіты малады жывапісец, ён сапраўдны паэт у мастацтве, летуценнік. Мастацтва яго глыбокае па эмоцыях, высокае па думцы і трапяткое па сумленню. Яно змушае задумацца пра жыццё тых, да каго звернута.

Міхась РАМАНЮК.

Партрэт Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

Валерый ШКУРЫН

Перон

Засталася частка сэрца на пероне,
Мне памяццю яго ніяк не абысці.
О, колькі раз праводзілі ў жыцці
Мяне сцяжынкі роднага раёна.
Цяпер ён ад мяне ўдалечыні,
У гарадку нафтавікоў і рання
Перон той самы, што адлічваў дні
Майго жыцця і першага кахання,
І першых вершаў тых, што ў белы свет
Паклікалі з бацькоўскага парога...
Карэліі лясы, Украйны жаркі стэп,
Прыбалтыкі пятлястыя дарогі,
Я зведаў вас;
Шмат бачыў, шмат шукаў,
І недарэмна траціў намаганні...
Ды дзе б ні быў, заўсёды ўспамінаў
Перон у гарадку нафтавікоў і ранне...

●

Заўжды зайздрошчу мастаку —
Уладару і знаўцу светацені.
...Вясновым ранкам маці на калені
Ўзяла маленькую дачку.
А ў небе ластавак мільготкія чароды,
І сонца абуджае ўсё наўкола,
Глядзіць шчасліва маці і вясёла,
Яна з дачкой — часцінка прыроды:

«Ах, ты, мая любосная дачушка!» —
Малую маці падымае, гушкае.
Здзіўленне, радасць у вачах дзіцяці,
Няма людзей шчаслівейшых за маці...
Спыні, мастак, імгненне на паперы,
І занатуй надзею, праўду, веру!

Таццяна ДЗМІТРУСЁВА

●

Зноў неба разгараецца,
Каб сонцам дзень напоўніць.
Такою светлай раніцай
Я пра цябе не помню.
І днём, калі гарачыя
Прамені льюцца долу,
Не, па табе не плачу я,
Сваю не ганю долю.
А вечарам завешваю
Акно фіранкай сіняй.
Адчую: сіл не меншае,
Не ўспомніць хопіць сілы.
А ноччу непрабуднаю
Не ўберагу спакою,
Шукаць дарэмна буду я
Тваё плячо шчакою.

Віктар ШНІП

На адкрыцці абеліска

Сасняк вартуе цішыню паляны,
Дзе ў кумачах заблытаўся вятрыска.
І ў ганаровай варце ветэраны,
Як абеліскі побач абеліска.
І я гляджу на бронзавыя твары,
І сэрца, зашчымеўшы, замірае.
...І чалавек, апалены ў пажары,
Гарэць агонь навекі бласлаўляе.
І слёзы шчодра коцяцца ў маршчыны,
Бы ў рэчышчы, размытыя з гадамі.
І абеліск, як нітка пуцявіны,
Даў сувязь мёртвым для жыцця
між намі.

У пошуках аформулы

Шчаслівы, хто здолеў спасцігнуць сябе, адшукаць сваю, уласную каляіну на шырокай дарозе мастацтва. Формула творчасці... Пошукі яе займаюць людзей, якія прысвяцілі сябе любімай справе, усё жыццё. А ці шукаюць гэтую формулу кампазітары, якія толькі-толькі распачалі свой творчы шлях? Дый ці магчыма акрэсліць для сябе гэтае дакладнае матэматычнае паняцце, такое, здаецца, далёкае ад стыхіі музыкі?..

Чатыры кампазітары, што нядаўна скончылі кансерваторыю і летась былі прыняты ў творчы саюз: Уладзімір Дарохін, Валерый Іваноў, Уладзімір Буднік і Уладзімір Прохараў. Чатыры імёны — чатыры ў нечым падобныя музыканцкія лёсы. У нечым—бо ў кожнага ж было ў жыцці штосьці сваё, што зрабіла адметнай іх творчую работу.

●

Чысты, да болю хвалюючы голас флейты нараджае пачуццё напружанага пошуку думкі, неакрэсленыя вобразы... Гучыць саната для флейты Уладзіміра Дарохіна. У гэтым невялікім, але вельмі цікавым творы аўтар, тады яшчэ студэнт Ленінградскай кансерваторыі, вучань В. Успенскага, прымяніў самыя новыя сродкі музычнай выразнасці. Партытура для недасведчаных складаная: незразумелыя знакі, квадраты, зігзагі, цёмныя плямы. А паслухаць — уся гэтая «незразумеласць» забываецца, узнікае музыка, якая вабіць свежасцю і глыбінёй. Яшчэ сачыненне студэнцкага часу — аднаактовы балет «Аполон і Марсій». На жаль, сцэны гэты балет не ўбачыў, але сам выбар тэмы, выбар формы — буйной, цяжкай для напісання студэнту трэцяга курса — сведчаць аб вялікай рабоце, аб сур'ёзнасці аўтара.

— Цэнтральную музычную школу пры беларускай кансерваторыі я заканчваў адразу па двух класах, — успамінае Уладзімір. — Тры гады заняткаў у гуртку кампазіцыі ў І. Лучанка дапамаглі мне знайсці сябе. І хоць я прадаўжаў заставацца і піяністам, і тэарэтыкам, але цвёрда вырашыў прысвяціць сябе сачыненню музыкі...

Добрае веданне тэорыі, выдатнае валоданне інструментам вельмі дапамагалі Дарохіну ў гады вучобы, ды і цяпер свае фартэпіянныя творы ён часта выконвае сам.

Вярнуўшыся пасля заканчэння вучобы ў Мінск, Уладзімір стаў выкладаць у роднай школе, не перапыняючы творчай работы: з'явіўся струнны секстэт, рамансы на словы А. Блока, І. Буніна, З. Бядулі. Для дзяцей напісаў цыкл п'ес для скрыпкі і фартэпіяна, дзе ёсць «Таптыгін» і «Вясёлка», «Дзве плаксы» і «Калыханка». Самым жа «галоўным» творам стала Першая сімфонія. У гэтым двухчасткавым цыкле перад намі аўтар, які глыбока засвоіў усе тэхнічныя сродкі выражэння музычнай думкі. Сімфонія гучыць бы на адным дыханні, а звонкі тэмбр трубы, якая вядзе асноўную тэму, нагадвае нам такія ж яркія і чыстыя фарбы палотнаў А. Маціса, мастака, творчасць якога вабіць маладога кампазітара.

Захоплены родным беларускім фальклорам, ён напісаў фантазію для цымбалаў і фартэпіяна, выкарыстаўшы дзве беларускія тэмы, струнны секстэт, заснаваны таксама на народнай песні; працуе над араторыяй «Беларусь» (вершы П. Броўкі). Да таго ж, у творчай лабараторыі Дарохіна нараджаюцца ўжо радкі Другой сімфоніі. І—прадаўжаецца паглыбленае вывучэнне творчасці любімых майстроў: І. Брамса і А. Веберна, Р. Штрауса і В. Лютаслаўскага, І. Стравінскага і Д. Шастаковіча.

●

У дні святкавання 25-й гадавіны ўтварэння ГДР нямецкае радыё трансліравала канцэрт беларускай музыкі. Побач з творамі М. Аладава, А. Багатырова, Я. Глебава прагучаў твор невядомага яшчэ маладога кампазітара, студэнта чацвёртага курса Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Валерыя Іванова. «Настроі»—музыка для струнных, флейты і ўдарных.

Пачыналася ў Валерыя любоў да музыкі з задушэўных беларускіх народных песень, якія ён чуў на Палессі. У сем гадоў сам навучыўся іграць на гармоніку, па слыху падбіраў любую мелодыю, быў незаменным на школьных святах і вясковых вечарынках. Потым музычная школа ў Глуску і першае сачыненне — песня «Нас шчасце чакае наперадзе», да якой сам напісаў і словы. Гродзенскае музычнае вучылішча, кансерваторыя, якую Валерый закончыў па класу П. Падкавырава — прыступкі да прафесіі кампазітара. Нарэшце — адметная вяха ў творчай біяграфіі Іванова: вакальна-сімфанічная паэма «Элегія аб чацвёртай бярозе» (словы М. Танка), прасякнутая невычэрпнай горыччу страт у гады вайны. Засяроджана-суровы рэчытатыў, харавыя рэплікі і распеўныя фразы, узрушаны голас чытальніка — усё стварае атмасферу трывожна-ўсхваляваную, поўную смутку і пафасу.

«Я люблю пісаць песні», — гэтыя словы Валерыя Іванова пацвярджаюцца вялікай колькасцю сачыненняў, якія не проста створаны і застаюцца на паперы, а ўвайшлі ў рэпертуар вакальных ансамбляў і асобных спевакоў, часта гучаць з эстрады, па радыё і тэлебачанні, набываюць шырокую аўдыторыю слухачоў. Яго песні вылучаюцца пластычнасцю меладычнай лініі, насычанасцю пачуцця, пранікнёнасцю і незвычайнай маляўнічасцю. Дастаткова прыгадаць песню «Пахне чабор» на вершы П. Броўкі, якая ў выкананні беларускіх «Верасоў» вядомая і замежнаму слухачу. А такія, як створаныя ў садружнасці з маладым паэтам Уладзімірам Някляевым «Асенняя песня» і «Я веру ў каханне», сведчаць, што вельмі блізкая Іванову форма лірычнай песні-балады.

Цікавіць яго і тэатр — напісана музыка да лялечных спектакляў «Шукай ветру ў полі» і «Тры таўстуны», дзіцячыя песні да навагодняга спектакля ў Палацы спорту. Калі ж глянуць на кола інтарэсаў маладога кампазітара з другога боку — яго цікавіць сучасная архітэктура, савецкая паэзія, жывапіс. Самааддана займаецца Валерый спортам і фатаграфіяй. Але, безумоўна, на першым плане — работа, работа і вучоба: ён асістэнт-стажор літоўскага кампазітара Ю. Юзелюнаса. Напісаў нядаўна Іваноў паэму-фрэску для народнага аркестра «Зямля бацькоў», скарыстаўшы інтанацыі далёкага мінулага, са старажытнага пласту народнай музыкі, увёўшы ў партытуру старадаўнія народныя музычныя інструменты: дудкі, жалейку, ліру. Працягвае пісаць песні — светлыя, лірычныя, прасякнутыя сардэчнай цеплынёй і высакародным густам.

●

Уладзімір Буднік, аднакурснік Іванова па кансерваторыі, ішоў да творчасці з той жа паслядоўнасцю: музычная школа, гомельскае вучылішча, першыя спробы ў сачыненні, кансерваторыя. Асноўны курс праходзіў з вопытным, чулым педагогам—прафесарам А. Багатыровым. У пошуках свайго творчага амплуа Уладзіміру дапамог семінар савецкай масавай песні, які праводзіў У. Алоўнікаў. Буднік захапіўся песняй і стаў мэтанакіравана працаваць у гэтым жанры. Хутка на конкурсе ў кансерваторыі яго «Крэпасць мужнасці» стала лаўрэатам. Абараніўшы дыплом (сімфонія і кантата для дзіцячага хору і аркестра «На магіле партызана»), ён атрымаў рэкамендацыю ў аспірантуру. Але выпускніка ВНУ чакала армейская служба. Яна, дарэчы, не перашкодзіла Будніку напісаць шэраг патрыятычных песень для вайсковага ансамбля «Пунсовыя пагоны». Вярнуўся ён у кансерваторыю, зноў сустрэўся з А. Багатыровым — як асістэнт-стажор.

«Сваёй творчай задачай, — гаворыць малады кампазітар,— лічу пошук правільнага шляху ў мастацтве, шляху, на якім прыносіш больш карысці...» Адсюль і спробы ў розных жанрах, і заўважальны плён гэтых спроб. «Калі табе бывае сумна» (словы П. Броўкі) стала лаўрэатам Рэспубліканскага радыёконкурсу «Песня-77», карыстаюцца любоўю слухачоў песні «Дні прыгожыя» (словы У. Карызны), «Аднакласніцы» (словы А. Вавілава). Жаданне больш пісаць пра родны беларускі край спарадзіла заснаваныя на фальклорных традыцыях сімфанічную паэму, фартэпіянную сюіту, струнны квартэт, п'есы і сюіту для баяна.

●

Прайшло ўжо два гады, як Уладзімір Прохараў закончыў кансерваторыю, але па-ранейшаму прыходзіць ён у аўдыторыю, дзе невялікая згуртаваная група маладых, «клас Глебава», спасцігае вялікія і простыя ісціны творчасці. Яўген Глебаў для Прохарава не проста колішні педагог, а «настаўнік жыцця», да якога можна прыйсці з усімі сваімі турботамі і радасцямі.

За гады вучобы Уладзімірам, акрамя разнастайных і шматлікіх «рабочых» п'ес, напісаны два буйныя сачыненні: сімфанічная паэма і араторыя паводле казкі А. Пушкіна «Пра Папа і работніка яго Балду». У сімфанічнай паэме ён раскрыўся як кампазітар, які авалодаў сакрэтамі прафесіі, здольны глыбока адчуваць і думаць. Да араторыі Прохараў вярнуўся пазней, зрабіў другую рэдакцыю. Гэта трохчасткавае харавое палатно з адзіным сімфанічным развіццём, насычанае яркімі характарыстыкамі дзейных асоб, іграўымі момантамі. Іронія, гратэск, сарказм пранізваюць усё сачыненне. Захапленне аркестрам яшчэ з часоў вучобы ў гомельскім вучылішчы, выдатнае веданне аркестра, набытае ў кансерваторыі, дазваляюць маладому кампазітару ствараць партытуры па-майстэрску.

Па расказах удзельнікаў вялікай бітвы, па кнігах, кінафільмах, карцінах ведае Вялікую Айчынную наша пасляваеннае пакаленне. Але ад гэтага ўспрыняцце не прытупляецца, не згладжваецца: чым больш дасканалы твор пра вайну, тым больш дакладна і востра працуе наша ўяўленне, выклікаючы ў душы боль і гонар за нашу Радзіму. Так, для Уладзіміра Прохарава вытокам глыбокіх творчых перажыванняў стаў мемарыяльны комплекс Брэсцкай крэпасці. І ўзнік песенны цыкл для барытону «Манумент «Смага» ў Брэсце». Адзіная драматургічная задума, адзіная лінія развіцця пранізваюць увесь твор, які адрозніваецца пранікнёнай драматычнай рэчытацыяй, багаццем гарманічнай мовы, глыбінёй пачуццяў.

Уладзімір імкнецца спазнаць тайны аркестравай палітры, шукае новыя гукавыя эфекты. Ён верны свайму прафесійнаму дэвізу: «Работа з самымі жорсткімі патрабаваннямі да сябе, работа па самых высокіх нормах».

●

«Хто гаворыць пра пакуты творчасці — не мае рацыі, трэба гаварыць пра радасць творчасці». Гэта — словы М. Горкага. А К. Станіслаўскі літаральна прадоўжыў думку пісьменніка: «Радасць творчасці» існуе і прыходзіць да сапраўдных мастакоў пасля велізарнай працы».

Праца, талент, жаданне як мага больш спазнаць і зрабіць, поўная самааддача ў рабоце — відаць, гэта і складае сёння «формулу творчасці» чатырох маладых аўтараў? Зразумела, не ўсё ёсць і будзе ў іх гладка і бясхмарна. Але як важна верыць і спадзявацца, што іх не пакіне тая «радасць творчасці», якая даецца толькі натурам разумным, добрым і даравітым.

Іна ГУРАРЫЙ.

«Памяць Хатыні»

Цікавасць аматараў музыкі да прэм'еры араторыі Віктара Войціка «Дзень Радзімы» — не толькі звычайная ўвага, з якой мы сочым за навінкамі беларускай музычнай культуры. Афіша прывабіла і своеасаблівым спалучэннем маладых імёнаў: садружнасць кампазітара Віктара Войціка і паэта Уладзіміра Карызны. Кожны з іх вядомы адметнасцю свайго творчага амплуа. Карызна — паэт-лірык, аўтар тэкстаў шэрагу шчырых песень, у якіх лірычнае светаўспрыманне спалучаецца з высокай грамадзянскасцю. Індывідуальнасць Войціка як удумлівага, дапытлівага музыканта раскрылася ў араторыі «Памяць Хатыні» (1973 г.). Гэта быў дэбют кампазітара ў аратарыяльным жанры.

Пошук новых выразных сродкаў — неабходны для больш пераканальнага ўвасаблення творчай задумы. А рэальная аснова гэтага пошуку — традыцыя глыбока асвоеная, прапушчаная праз індывідуальнае мастацкае бачанне. Па-рознаму суадносяцца традыцыйныя і наватарскія рысы ў абедзвюх араторыях Войціка. У «Памяці Хатыні» задача ўвасаблення драматычнай экспрэсіі вымагала ад яго актыўнага пошуку ва ўсіх сферах музычнай выразнасці. У араторыі «Дзень Радзімы» кампазітар абраў іншы стылістычны ракурс, наблізіўшы характар музычнага выказвання да народнай традыцыі—як эпічнай, так і лірычнай. Магчыма, схільнасць да лірыкі абумоўлена ўплывам паэтычнага лібрэта, авеянага сердэчнай цеплынёй, шчырасцю тэксту.

Прывабная якасць музыкі араторыі — апора на песенныя і танцавальныя жанры, шматпланавасць і бачная яскравасць вобразаў, то задуменна-лірычных, то гарэзліва-хітраватых, а часам і сурова-змрочных. Дэмакратычнасць музычнай мовы, жанравая канкрэтнасць, куплетная форма некаторых нумароў — усё гэта традыцыі савецкай масавай песні, якія пад кампазітарскай рукою Войціка даволі арганічна зліваюцца з асаблівасцямі аратарыяльнага жанру.

Звычайна для кампазітара, які імкнецца да абнаўлення традыцыі, існуе небяспека абнаўлення меладычнага ці драматургічнага вырашэння. Даводзіцца старанна падбіраць аптымальныя прапорцыі даўно знаёмага і свежага, каб звыклыя інтанацыі набывалі новае жыццё і неаднойчы апетыя вобразы ўліліся ў новую плоць. Войцік, думаецца, не ўсюды здолеў пазбегнуць стэрэатыпнасці, узняць традыцыйныя сродкі на новы эстэтычна значны ўзровень. Асабліва гэта адчуваецца ў драматургіі твора, якая грунтуецца на кананізаванай схеме: «ад святла—скрозь азмрочванне — да апофеозу». У выніку — тая інерцыя ўспрымання падобнага тыпу драматургіі, што склалася ў слухацкай свядомасці, не пераадольваецца. А гэта зніжае камунікатыўную каштоўнасць музыкі, аслабляе ўвагу залы.

Увогуле ж прэм'ера прайшла паспяхова. Захоплена выканалі «Дзень Радзімы» Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР імя Р. Шырмы, А. Падгайскі (вакал), В. Анісенка (чытанне) — пад кіраўніцтвам дырыжора Ю. Яфімава. Араторыя прагучала ў дзень адкрыцця канцэртнага сезона Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Н. ЛІНКОЎСКАЯ.

Ў кадры і за кадрам

ІЗНОЎ — ярка асветлена студыя, і зноў — гучыць каманда на рэжысёрскім пульце: «Увага! Мы — у эфіры!» І зноў—цітр: «Праграма маладзёжнага вяшчання»...

Двойчы тэлегледачы рэспублікі бачылі на сваіх экранах эмблему маладзёжнага эксперыментальнага вяшчання Беларускага тэлебачання. Адбыліся абмеркаванні на лятучках, падшыты газетныя рэцэнзіі, апрацавана і прааналізавана чытацкая пошта. Можна падвесці першыя, самыя першыя вынікі, узважыць усе «за» і «супраць», падумаць пра бліжэйшыя планы.

Што ж гэта такое — праграмы маладзёжнага вяшчання, які іх сэнс, мэты і перспектывы?

Цяжка зараз сказаць, хто з камсамольцаў нашай студыі першы выказаў ідэю аб арганізацыі такіх праграм. Ідэя насілася ў паветры, патрабавала ўдакладнення. На камсамольскіх сходах, у гутарках, у жывым, зацікаўленым абмене думкамі высветлілася, што большасць творчай моладзі студыі марыць пра самастойную творчую работу. Нават супрацоўнікі тэхнічных службаў выказалі жаданне праявіць сябе ў пошуку. Справа ў тым, што маладым спецыялістам цяжка заявіць аб сабе на поўны голас у калектыве, які ўжо склаўся. А маладому чалавеку гэта неабходна з першых крокаў працоўнай біяграфіі.

Спачатку ідэя падрыхтоўкі праграм маладзёжнага вяшчання была чыста арганізацыйнай—стварыць умовы маладым журналістам і рэжысёрам, аператарам і гукаафарміцелям, мантажніцам і работнікам дырэкцыі праграм падрыхтаваць самастойныя работы, пашырыць кола прыкладання сваіх сіл, набыць (што вельмі важна на студыі) навыкі ў сумежных спецыяльнасцях. Былі распрацаваны арганізацыйныя формы падрыхтоўкі праграм (асобнай жа рэдакцыі няма), вызначаны таварышы, адказныя за кожны яе этап. Зараз ужо можна сказаць, што ідэя спалучэння вопыту старэйшых і энтузіязму маладых аказалася ўдалай.

Па-першае, узрасла эфектыўнасць усёй выхаваўчай работы ў маладзёжным калектыве студыі тэлебачання. «Доўгі шлях праз павучанні, але кароткі—праз прыклады»,—у гэтай ісціне мы ўвачавідкі пераканаліся, назіраючы, як маладыя людзі, якія прыходзяць да нас працаваць, з першых дзён прывыкаюць да самадысцыпліны, становяцца паўнапраўнымі членамі калектыву. На новай, больш якаснай аснове запрацавалі ўсе сектары камсамольскага бюро. Палепшылася наведванне камсамольскага семінара — заняткаў «Школа прафесійнага майстэрства», арганізаванай паўтара года назад. На занятках выступалі запрошаныя намі каментатар Цэнтральнага тэлебачання Леанід Залатарэўскі, старшы рэдактар ЦТ Мар'яна Краснянская, кінакрытык Сяргей Муратаў, сцэнарыст, рэжысёр і аператар ЦТ Марына Галдоўская, вучоны-псіхолаг Якаў Каламінскі. Сувязь з майстрамі тэлеэкрана і вучонымі была вельмі важнай для кожнага, неабходнай у самастойнай рабоце. Актыўна пачаў працаваць гурток «Абітурыент»: многія зразумелі, што сённяшніх ведаў не хапае, і трэба паступіць у ВНУ, у вучылішча, атрымаць адпаведную тэарэтычную падрыхтоўку. Пра тое, што пачын стаў для многіх камсамольцаў сваёй асабістай, кроўнай справай, паказала чарговая грамадска-палітычная атэстацыя. У асабістых комплексных планах многія запісалі: «Буду ўдзельнічаць у падрыхтоўцы праграм маладзёжнага вяшчання». Ва ўсёй атмасферы маладзёжнага калектыву пачаў адчувацца вясёлы дух спаборніцтва і імкнення праявіць сябе.

І вось 26 лістапада мінулага года — першы выхад у эфір. На суд гледачоў было прадстаўлена дзесяць перадач: нарыс пра народнага ўмельца, рэпартаж з Ленінграда пра лёс беларусаў — удзельнікаў кастрычніцкіх падзей 1917 года, праграма для працаўнікоў сельскай гаспадаркі, музычная перадача для дзяцей, паэтычная кампазіцыя, творчы партрэт артысткі, фільм-балет. Зразумела, не ўсё ў гэтай праграме было раўнацэнна, але ў цэлым яна атрымалася змястоўнай і разнастайнай па жанрах. Аб гэтым сведчыла ацэнка партыйнай арганізацыі, кіраўніцтва студыі тэлебачання, водгукі тэлегледачоў. Маладыя рабочыя «Гомсельмаша» напісалі нам: «Рады вітаць ваш пачын, віншуем з першым самастойным эфірам. З цікавасцю будзем сачыць за новымі работамі камсамольцаў і моладзі Беларускага тэлебачання».

А мы прадумвалі ўжо тэмы перадач для новай праграмы. Вопыт першай паказаў, што аўтары перадач рыхтавалі свае работы не толькі пра моладзь і для моладзі. Гэта і зразумела — маладыя спецыялісты студыі не могуць быць у баку ад вялікіх праблем сучаснасці, не могуць не бачыць усёй шматстайнасці жыцця. Але гэта азначае таксама і тое, што ў нашых праграмах не павінна быць скідак на маладосць аўтараў. Задумаўшыся над гэтым, мы сталі больш строга падыходзіць да адбору сцэнарнага матэрыялу, да «вёрсткі» ўсёй праграмы. Што неабходна мець у паўнацэннай тэлевізійнай праграме, якая прапаноўваецца тэлегледачу на вечар? Грамадска-палітычную перадачу? Безумоўна. Рэпартаж? Канечне. Затым—публіцыстычную перадачу, якая даследуе важныя сацыяльныя праблемы, музычны нарыс, дзіцячы спектакль, мультфільм, літаратурна-драматычную перадачу. Для кожнай з іх важны час выхаду ў эфір, а для ўсіх разам — аптымальнасць суіснавання ў адной праграме. Пакуль камсамольцы дырэкцыі праграм прадумвалі ўсе гэтыя пытанні, маладзёжная сцэнарная калегія рэдагавала сцэнарыі, і галоўнымі крытэрыямі адбору былі: уменне аўтараў заявіць цікавую тэму, глыбока распрацаваць яе, свежа і з выдумкай увасобіць у экранных вобразах. Па кожным сцэнарыі адбываліся бурныя абмеркаванні, прапаноўваліся варыянты, папраўкі, словам, ішла звычайная творчая работа. Шэраг сцэнарыяў давялося адхіліць. І вось, нарэшце, праграма падрыхтавана, запісана, аб'яўлена ў газетах. 9-га ліпеня мы прапанавалі тэлегледачам праграму на чатыры з паловай гадзіны.

З нецярпеннем чакалі мы першых рэцэнзій, водгукаў гледачоў. Глядач заўважыў наш пачын, дзяліўся думкамі, прапаноўваў новыя тэмы, адрасы герояў.

«...Прачытала незвычайны радок: «Вечар маладзёжнага вяшчання». Мяне гэта зацікавіла. Тое, што ўбачыла, прынесла задавальненне. Вельмі парадаваў спектакль «Хачу Месяц!» Спадабаўся расказ пра маладых акцёраў беларускіх тэатраў. Зацікавіў нарыс «Не трэба сумаваць!» Але пераўзышоў усе мае чаканні тэлевізійны расказ пра Гіёма Апалінэра...»

«Хочацца падзякаваць за дастаўленую радасць: не часта даводзіцца ўбачыць за адзін вечар столькі разумнага, цікавага і патрэбнага. Асабліва спадабаліся перадачы пра самадзейнага кампазітара М. Валодзіна і тэлеспектакль пра Апалінэра».

Нямала добрых слоў было сказана аўтарам перадачы аб праблемах выхавання «цяжкіх» падлеткаў — «Дазвольце быць дарослым!» — Алене Шынкевіч і Любе Егарэнкавай; Аляксандры Калінінай і Юрыю Савіну — аўтарам музычнага спектакля для дзяцей «Хачу Месяц!»; Веры Савінай і Галіне Хвашчэўскай, якія стварылі творчыя партрэты маладых акцёраў мінскіх тэатраў—А. Ткачэнкі, С. Жураўля і Т. Пузіноўскай.

У цэлым можна сказаць, што праграма вылучалася пошукам новых формаў тэлевізійнага вяшчання. У працэсе падрыхтоўкі праграмы былі знойдзены арыгінальныя журналісцкія, рэжысёрскія, аператарскія рашэнні.

На кожным буйным заводзе ёсць канструктарскае бюро, якое распрацоўвае новыя мадэлі прадукцыі на перспектыву. І хоць, як кажуць, усякае параўнанне кульгае, мы маем права задумацца: а чаму на тэлебачанні няма такой перспектыўнай лабараторыі? Можа быць, праграмы маладзёжнага вяшчання могуць выконваць гэтую ролю? Каму ж, як не моладзі, з яе здольнасцямі эксперыментаваць, з яе энтузіязмам і энергіяй пачаць гэтую карысную справу? Знойдзеныя ў працэсе пошукаў, апрабаваныя ў ходзе падрыхтоўкі праграм новыя формы тэлевізійных перадач могуць з поспехам выкарыстоўвацца ў «шырокім» эфіры.

На XXV з'ездзе КПСС была пастаўлена задача павышэння эфектыўнасці і якасці ідэалагічнай работы, і творчая моладзь не можа быць у баку ад яе вырашэння.

Над гэтым мы думалі, рыхтуючы чарговую праграму маладзёжнага вяшчання. Прысвечана яна 60-годдзю Ленінскага камсамола. Мяркуем правесці канферэнцыі гледачоў на заводах, у калгасах, у інстытутах, ва ўстановах. Каб зверыць свае пошукі з запатрабаваннямі тэлегледача, неабходна пастаянная сувязь з ім.

Эдуард МЕЛЬНІКАЎ,
сакратар камсамольскай арганізацыі Беларускага тэлебачання.

ПАЧАТАК

У белым святле сафітаў—галава мікеланджэлаўскага Давіда. Побач—мудры старац Вальтэр. Гэта работа Гудона. Дакладней, копія вядомай работы славутага скульптара... Тут, у вялікім пакоі, дзе мы знаходзімся, мноства скульптурных копій — па іх студыйцы выяўленчай студыі Барысаўскага гарадскога Дома культуры спэсцігаюць прыгажосць.

Але прыгажосць увасабляюць у сабе не толькі антычныя статуі. Звычайная бутэлька, якая стаіць на ўзвышэнні, на падстаўцы, на фоне карычневага аксаміту, уражвае дасканаласцю формы, загаднава свеціцца зеленаватым святлом, нібы запрашаючы пранікнуць у таямніцу геаметрычных ліній, у таямніцу спалучэння колеру, рэфлексаў і валёр... І зусім не проста намаляваць гэтую бутэльку!..

Сёння ў выяўленчай студыі пры Барысаўскім Доме культуры заняткі па акадэмічнаму малюнку.

Пры словах «акадэмічны малюнак» па асацыяцыі прыгадваецца нешта велічнае і вялізнае: гмах акадэміі навук, палотны Энгра, статуі тытанаў ля Эрмітажа. А тут нейкія кубікі, шары, конусы... Аднак гэтыя конусы і шары—азбука малюнка, тое самае, што ў пачатковай школе—алфавіт. Не авалодаеш гэтай азбукай—не намалюеш нават звычайнай бутэлькі.

І вось на падлогу кладзецца малюнак за малюнкам. Шар. Конус. Паралелепіпед. Але не думайце, што яны аднолькавыя. Двух, цалкам падобных адзін на другога, малюнкаў няма, як няма цалкам падобных адзін на аднаго дзяцей. Адны шары і конусы намаляваны лепш, іншыя горш. Пакуль што цяжка сказаць, хто з юных наведвальнікаў студыі будзе мастаком. Можа, Валодзя, які запісаўся ў студыю зусім нядаўна? Вось яго малюнкі, зробленыя дома, ракавіна, змешчаная нібы ў бясконцай прасторы, фантастычныя фарбы кветак (кветкі гэтыя стаяць не ў графіне, а ў корпусе ручной гранаты). А яшчэ Валодзя намаляваў барвоважоўтыя яблыкі восені... Малюнкі выяўляюць фантазію і адчуванне колеру. А задача студыі заключаецца ў тым, каб навучыць Валодзю і такіх, як ён, здольных дзяцей тэхніцы малюнка, тэхніцы жывапісу, прывіць ім асноўныя графічныя навыкі, а галоўнае, выхаваць добры густ.

Заняткі ў студыі з 1973 года вядзе Віктар Аляксандравіч Зефіраў. Расказваючы пра кантынгент студыйцаў, які складаюць не толькі дзеці, але і многія дарослы, Віктар Аляксандравіч называе сям'ю Вугловых, разьбяра па дрэве Я. Нэймана, вядомага самадзейнага мастака А. Барышава, гаворыць пра здольных навічкоў студыі, такіх, як слесар В. Алейнік, як настройшчыца піяніна Л. Багрыч. Але першым Віктар Аляксандравіч называе імя Сурэна Мірзаяна, з ім раіць пазнаёміцца ў першую чаргу.

Сурэн Аганесавіч не проста былы студыец: трыццаць гадоў назад, калі Барысаў яшчэ залечваў раны вайны, Мірзаян быў арганізатарам студыі і потым ажно пятнаццаць гадоў кіраваў ёю. Студыя і вызначыла яго лёс, бо тут ён знайшоў сваё прызванне, абраў прафесію, якая назаўсёды звязала яго жыццё з мастацтвам: Сурэн Аганесавіч скончыў завочны Народны універсітэт мастацтваў у Маскве, працуе загадчыкам бюро тэхнічнай эстэтыкі Барысаўскага завода аўтатрактарнага электраабсталявання, — тэхнічная эстэтыка мае прамое дачыненне да мастацтва!..

Сурэн Аганесавіч расказвае:

— Так, я пятнаццаць гадоў кіраваў студыяй. Але калі вучыш іншых, вучышся і сам. Не толькі як мастак, але і як чалавек. Шмат дае агульная справа, агульны занятак з людзьмі самых розных прафесій і ўзростаў. Таму студыя была для мяне школай жыцця, жыццёвага вопыту. Але школай радаснай, рамантычнай, бо ўсіх нас — самых розных людзей — аб'ядноўвала любоў да прыгажосці, да мастацтва і роднай прыроды. Ніколі не забыць нашы выезды на пленэр, проста кажучы, на натуру, не забыць тыя зорныя ночы, кастры, спрэчкі ля тых кастроў—пра мастацтва, пра творчасць вядомых майстроў... Ёсць што ўспомніць. І як рабілі першыя крокі, і як стваралі першыя дэкарацыі для вядомага сёння ў рэспубліцы народнага тэатра Барысаўскага Дома культуры, як сустракаліся з Міхаілам Савіцкім, з Маем Данцыгам, з іншымі вядомымі беларускімі мастакамі. А яшчэ былі экскурсіі. Шмат экскурсій па мастацкіх музеях і выставачных залах. Потым іх абмяркоўвалі. Гэта было школай... Не забыць і выстаўкі нашых студыйцаў — у Слуцку, Маладзечне, Салігорску, нарэшце — у Мінску, Вільнюсе. Добра сустракалі людзі нашы выстаўкі, прыхільна, з цікавасцю... Сапраўды, ёсць што ўспомніць!

Але не толькі ўспаміны звязваюць Мірзаяна са студыяй. Сёння ён узначальвае гарадскі клуб самадзейнай творчасці, усе члены якога—былыя студыйцы. І, натуральна, дзейнасць клуба не можа не мець сувязей з дзейнасцю студыі. Яна—крыніца ўсё новых талентаў, якія потым прыходзяць у розныя галіны гарадскога жыцця.

Цяпер у студыі займаюцца 64 чалавекі. Магчыма, некаторыя з іх праз некаторы час пакінуць яе. Так бывае. Выпадковыя людзі сустракаюцца ў любой справе. Некаторыя —наадварот—застануцца наведвальнікамі студыі і тады, калі скончыцца для іх трохгадовы курс навучання. Яны заўсёды будуць прыходзіць сюды маляваць, займацца жывапісам, бо не могуць інакш. Але такіх студыйцаў усё ж нямнога, асноўны кантынгент — школьнікі, тыя, хто марыць паступіць у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Летась, напрыклад, на мастацкі факультэт інстытута паступіла пяцёра студыйцаў.

Са студыі пайшлі ў шырокі свет мастацтва народны мастак БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР А. Анікейчык, мастакі А. Ісаёнак і У. Паўлавец, адзін з вядучых архітэктараў Рыгі М. Свістуноў і некаторыя іншыя. Але самае галоўнае ў тым, што ўсе студыйцы застануцца людзьмі, блізкімі да сапраўднага мастацтва, да сапраўднай прыгажосці.

А хіба не студыя дапамагла Георгію Сафончыку, Наталлі Ганчаровай, Валерыю Гінцу, Габілю Гусейнаву, Віктару Бураку і многім іншым стаць мастакамі - афарміцелямі на прадпрыемствах горада?!

З кожным годам усё больш жадаючых запісацца ў студыю. Гэта, вядома, добра, але тут узнікае і праблема: студыі не хапае ўжо толькі аднаго выкладчыка (ён вядзе і малюнак, і жывапіс, і чаканку, і разьбу па дрэве, і інкрустацыю).

Ёсць і іншыя праблемы. Няма, напрыклад, мальбертаў. Студыйцы, як і ў першыя гады існавання студыі, карыстаюцца замест іх звычайнымі дошкамі, якія прымацоўваюць да крэсла альбо трымаюць на каленях. А сапраўдных мальбертаў чамусьці не прадаюць па безнаяўнаму разліку. Таксама, як не прадаюцца пэндзлі, фарбы...

Трыццаць гадоў працуе выяўленчая студыя — адзін з лепшых калектываў Дома культуры. Трыццаць гадоў няспыннага ўвасаблення лозунга «Мастацтва павінна належаць народу».

Віталь ТАРАС.

ІМЯ ГОРДАЕ— КУЛЬТАСВЕТНІК

У Магілёве гэты пятачок на рагу вуліц Камсамольскай і Ленінскай называюць дзявочым. Чаму? Падыдзіце сюды, і ўсё стане зразумелым. Мабыць, нідзе больш у горадзе вы не сустрэнеце адразу столькі дзявочых твараў. Знаходзіцца тут культасветвучылішча імя Н. К. Крупскай. Займаюцца ў ім пераважна дзяўчаты. Не ведаю, ці то традыцыя такая, ці мо яшчэ якая прычына, але хлопцаў, на вялікі жаль, тут мала. Затое акружаны яны ўвагай і клопатам сяброўак.

Мне давялося пабыць на ўроку, які вёў выкладчык рэжысуры і майстэрства акцёра Юрый Пятровіч Сінялюбаў. Ішло застольнае чытанне п'есы А. Кузняцова «За спробу не б'юць». За сталом сядзелі дзевяць ці дзесяць сімпатычных дзяўчат і адзін хлопец. Мы разгаварыліся. Дзяўчаты трошкі расказалі пра сябе, чаму пайшлі менавіта на гэтае аддзяленне, з якім настроем чакаюць самастойнай работы ў клубе (група — выпускная). І раптам усе, як па камандзе, загаварылі пра хлопца, які дагэтуль сціпла маўчаў.

— Вы лепш з Анатолем пагутарце, ён у нас і круглы выдатнік, і камсорг, і камісар будаўнічага атрада...

Анатоль Рагачоў — хударлявы, чарнявы хлопец — толькі ўсміхаўся і чырванеў. А потым усё ж разгаварыўся. Ён з Лоеўшчыны, вельмі любіць сцэнічнае мастацтва, марыць пасля заканчэння вучылішча паехаць у родныя мясціны кіраваць драматычным калектывам...

Але я трошкі забег наперад. Перш чым пазнаёміць вас з самім вучылішчам, варта сказаць некалькі слоў пра будынак, у якім яно знаходзіцца. А будынак адметны, можна сказаць, славуты на ўвесь Магілёў. Па-першае, яму мала не дзвесце гадоў. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі тут была гасцініца «Брыстоль». Па-другое, у 1820 годзе, калі Аляксандр Сяргеевіч Пушкін ехаў з Пецярбурга ў паўднёвую ссылку, ён спыняўся менавіта ў гэтым будынку, дзе, па ўспамінах сучаснікаў, чытаў вершы сваім сябрам.

Не ведаю, як сталых насельнікаў гэтага дома (да ўсяго прызвычайваешся), але свежага чалавека тут не пакідае нейкае дзіўнае адчуванне: ты ж ідзеш па тых самых прыступках, тымі ж калідорамі, дзе некалі ступала нага самога Пушкіна. Мо не мая справа даваць парады кіраўнікам вучылішча, але я на самым відным месцы вывесіў бы славуты пушкінскі радок: «Здравствуй, племя младое, незнакомое...» Ён так дапасуецца да гэтых жыццярадасных, маладых і прыгожых твараў, да смеху, гукаў музыкі, што перапаўняюць стары дом.

Цяпер — пра вучылішча. Сёлетняй вясной яно адзначала сваё пяцідзесяцігоддзе. Вучылішча — самае старэйшае ў рэспубліцы. На ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным залатому юбілею, называлася лічба 9 тысяч. Столькі чалавек скончыла вучылішча за гады яго існавання.

На двух аддзяленнях — дзённым і завочным — навучаецца каля тысячы юнакоў і дзяўчат: будучых клубных работнікаў, хормайстраў і харэграфаў, рэжысёраў драматычных калектываў, дырыжораў аркестраў народных інструментаў.

Разам з загадчыцай навучальнай часткі Ірынай Навумаўнай Бярозкінай мы зайшлі ў танцклас у самы разгар заняткаў. Харэограф Людміла Іванаўна Клімянкова (дарэчы, яна сама не так даўно скончыла гэтае вучылішча) «праходзіла» з навучэнкамі трэцяга курса ўкраінскі «Гапак». Дзяўчаты ў чорных трыко і кароценькіх спаднічках яшчэ і яшчэ раз паўтаралі адно і тое ж па. Нялёгка ж даецца складаная навука танца! А яны павінны авалодаць ёю так, каб вучыць неўзабаве нявопытных самадзейных танцораў.

Пасля заняткаў адной групы ў клас заходзіць другая — у іх будзе ўрок грыміравання. Аказваецца, гэта таксама трэба ведаць будучаму кіраўніку самадзейнасці.

Ідзеш па калідоры, і з-за кожных дзвярэй чуюцца свае гукі: тут развучваюць сальфеджыо, там нехта іграе на фартэпіяна, у трэцім пакоі гучыць аркестр. Адчыняем дзверы — тут кабінет харавога дырыжыравання. Да паслуг будучых хормайстраў вялікі набор разнастайных пласцінак і магнітафонных запісаў з лепшымі творамі айчыннай і замежнай музычнай класікі.

Наогул, у вучылішчы — 10 вучэбных кабінетаў, 7 лабараторый, 50 аўдыторый, 4 спецыяльныя класы, бібліятэка, чытальная, актавая і спартыўная залы. Натуральна, у распараджэнні навучэнцаў — шмат разнастайных музычных інструментаў, тэатральных касцюмаў, ёсць свая грымёрная.

Само сабой, будучыя культасветнікі маюць сваю выдатную мастацкую самадзейнасць. Гэта не толькі справа прэстыжу, але і своеасаблівая лабараторыя, дзе шліфуюцца, удасканальваюцца таленты ўдзельнікаў. Тут вельмі ганарацца сваімі самадзейнымі акадэмічнымі хорамі, ансамблем песні і танца «Крыніца», вакальнымі ансамблямі «Вясёлка» і «Бярозка». Іх выступленні заўсёды карыстаюцца поспехам сярод насельніцтва. Акадэмічны хор настаўнікаў— лаўрэат абласнога агляду мастацкай самадзейнасці, вакальны ансамбль «Бярозка» не раз выязджаў на гастролі за мяжу.

Шмат цікавага можна расказаць пра тэатр-студыю, якому ўжо 10 гадоў. У яго такія спектаклі, як «Машанька» А. Афінагенава, «Дом Бернарды Альбы» Г. Лоркі, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «А досвіткі тут ціхія...» Б. Васільева і інш.

Тут, у культасветвучылішчы, ганарацца многімі сваімі выпускнікамі. Некаторыя з іх сталі драматычнымі артыстамі, спяваюць у прафесійных калектывах. Але большасць працуе ў клубах і дамах культуры рэспублікі, кіруе народнымі тэатрамі, танцавальнымі, харавымі калектывамі.

Кожны год настае тут дзень і сумны, і радасны. Сумны таму, што шкада расставацца з роднымі сценамі вучылішча. Радасны, бо ты ідзеш у самастойнае жыццё.

Вось праходзяць яны, усхваляваныя юнакі і дзяўчаты, перапаясаныя стужкамі з надпісам «культасветработнік», праз актавую залу, дзе адбываецца ўрачыстае пасвячэнне ў прафесію. А наперадзе — шлях, які яны выбралі.

М. ЗАМСКІ.

Яны дорагаць радасць

Пра гэты ансамбль мне даводзілася пісаць яшчэ каля пятнаццаці гадоў назад, пасля таго, як ён упершыню выступіў на аглядзе мастацкай самадзейнасці рэспублікі і атрымаў званне лаўрэата, а потым і народнага. Ён здзівіў тады ўсіх прысутных раннім, можна нават сказаць — скараспелым выканаўчым майстэрствам удзельнікаў. З часу арганізацыі калектыву мінула ўсяго толькі крыху больш чым паўтара года, а самадзейныя артысты валодалі ўжо выразнасцю, тэхнічнай упэўненасцю і нават пэўнай франтаватасцю манеры. Я паехала ў Брэст, каб бліжэй пазнаёміцца з новым харэаграфічным калектывам-лаўрэатам, з людзьмі, якія далучыліся да мастацтва танца. Памятаю, што самае вялікае ўражанне зрабіла тады на мяне захопленасць артыстаў-аматараў сваёй справай. Радасць, якую яны атрымлівалі ад самай звычайнай, чарнавой работы. «Радасць»—гэтае слова, натуральна, стала загалоўкам артыкула, прысвечанага брэсцкім танцорам, гэтым жа словам пазней быў названы і сам ансамбль.

Мінулыя пятнаццаць гадоў пераканалі ў тым, што калектыў носіць гэта імя не дарэмна. Яго ўдзельнікі па-ранейшаму захоплены сваім мастацтвам і па-ранейшаму атрымліваюць радасць не толькі ад канцэртных выступленняў, але і ад будзённай рэпетыцыйнай работы, ад сяброўскай сувязі адзін з адным, ад творчай атмасферы, што пануе ў танцавальнай зале.

Сюды часта прыходзяць у госці ветэраны калектыву — прыгадаць мінулыя дні, паглядзець цяперашнюю праграму, пабалець за маладых калег. Многіх былых і сённяшніх удзельнікаў «Радасці» звязваюць цёплыя сяброўскія адносіны, нездарма яны гавораць, што калектыў з'яўляецца як бы іх другой сям'ёю. І сапраўды, гэта вялікая танцавальная сям'я, са сваімі традыцыямі, правіламі, абавязкамі. Новенькія ўваходзяць у яе паступова, далучаючыся да своеасаблівага ненапісанага, але тым не менш строгага харэаграфічнага статута. «Мы імкнёмся, — гаворыць кіраўнік «Радасці», заслужаны работнік культуры БССР А. Вараб'ёў, — каб у нас юнакі і дзяўчаты вучыліся не толькі танцу». І яны вучацца, пазнаюць новае, пашыраюць свае гарызонты.

У ансамблі папулярны паходы ў тэатр і кіно, экскурсіі, абмеркаванні прачытанага і ўбачанага. Тэкстыльшчыкі, настаўнікі, слесары, студэнты, інжынеры пабывалі ў многіх кутках Савецкага Саюза, убачылі не адну еўрапейскую краіну, пазнаёміліся і пасябравалі з многімі дзесяткамі і сотнямі людзей.

За гады свайго існавання ансамбль даў каля васьмісот канцэртаў, на якіх пабывала больш чым паўмільёна гледачоў. І ўсюды выступленні самадзейных танцораў з Брэста суправаджаліся шчырай радасцю і ўдзячнасцю гледачоў. Вось што расказваў, напрыклад, пра адну з апошніх паездак ансамбля А. Вараб'ёў: «Адным з этапаў нашага турнэ па Італіі быў горад Турын—цэнтр аўтамабільнай прамысловасці Італіі. Тут мы выступалі ў праграме фестывалю газеты «Уніта». У вялікім Палацы спорту сабралася да чатырох тысяч гледачоў, галоўным чынам рабочых аўтамабільных заводаў фірмы «Фіат». Кожны танец выклікаўся на «бис». А ў фінале канцэрта артысты вакальнага трыо заспявалі «Інтэрнацыянал». Яго падхапіла ўся зала. Канцэрт выліўся ў хвалюючую дэманстрацыю дружбы, пралетарскай салідарнасці. Мы былі ўзрушаны цікаўнасцю, клопатамі і ўвагай да нас італьянскай моладзі. Пасля канцэрта хлопцы і дзяўчаты дапамагалі нам грузіць касцюмы, праводзілі да аўтобуса і доўга не хацелі развітвацца».

Пра вялікі поспех беларускага ансамбля пісалі газеты і іншых краін, дзе ён выступаў. «Ніколі яшчэ публіка і крытыкі не былі так зачараваны і пакораны, як у гэты вечар, праведзены з савецкімі танцорамі з Брэста. Без сумнення, тое, што зачароўвала французскую публіку, — гэта чысты характар Расіі... Ансамбль «Радасць» з Брэста быў, без усялякага сумнення, лепшым калектывам фестывалю», — сведчаць французскія рэцэнзенты. «Кожнае выступленне «Радасці» суправаджалася авацыяй,— пісалі польскія крытыкі.—Сэрца выскоквала з грудзей, а рукі балелі ад апладысментаў. Танцавальная фантазія «Валёнкі», танец «Рускі сувенір», цудоўная балада «За ваколіцай» — гэта своеасаблівыя шэдэўры харэаграфіі і адначасова выдатнае выкананне, поўнае агню і тэмпераменту».

Да гэтых захапляючых ацэнак удзельнікі ансамбля прыйшлі нялёгкім шляхам. Вось ужо шаснаццаць гадоў, нягледзячы на стомленасць пасля працоўнага дня, артысты-аматары тры разы ў тыдзень, а перад адказнымі выступленнямі ледзь не кожны дзень збіраюцца для таго, каб зрабіць сваё цела паслухмяным і выразным, каб здолець данесці да гледачоў усю прыгажосць і нацыянальную своеасаблівасць народнага танца, які з'яўляецца асновай рэпертуару ансамбля.

Сваю работу ўдзельнікі калектыву пачалі з выканання шырока вядомых традыцыйных танцаў: беларускай полькі, «Крыжачка», «Лявоніхі», «Рускага танца», украінскага «Гапака». Іх навучыліся танцаваць зладжана, з дакладным захаваннем характэрных асаблівасцей, з натхненнем і тэмпераментам. Але ўжо неўзабаве стала ясна, што трэба ствараць свае арыгінальныя пастаноўкі, шукаць сваю праграму, свой стыль. Самадзейным артыстам хацелася сродкамі свайго мастацтва расказаць пра свой час, пра тое, што іх хвалюе, і перш за ўсё пра подзвіг сваіх суайчыннікаў, пра тых, хто адстаяў ад ворагаў родную зямлю. Так з'явілася ў рэпертуары ансамбля харэаграфічная кампазіцыя «Сімфонія мужнасці» — пра гераічную абарону Брэсцкай крэпасці (пастаноўшчык народны артыст БССР С. Дрэчын). Танцоры расказалі пра подзвіг сваіх бацькоў усхвалявана і моцна. А затым А. Вараб'ёвым былі пастаўлены канцэртныя нумары «Радасць працы» і «Свята ўраджаю», прысвечаныя мірнаму і шчасліваму жыццю савецкіх людзей.

Большасць твораў, створаных у ансамблі, абапіраецца на выразныя сродкі беларускага народнага танца. Артысты-аматары вывучаюць харэаграфічны фальклор, народныя абрады, звычаі, гульні. Работа гэтая, праўда, па-сапраўднаму ў калектыве толькі яшчэ разгортваецца. У самадзейных танцораў вялікія планы ў гэтай галіне — тут і арганізацыя этнаграфічных экспедыцый, і фіксацыя харэаграфічных узораў на плёнку.

Стараннае вывучэнне багаццяў нацыянальнага фальклору не з'яўляецца для калектыву самамэтай. У ансамблі не імкнуцца да літаральнага ўзнаўлення на сцэне ўзораў традыцыйнай харэаграфіі, пастаноўкі, якія ствараюцца ў ім, як правіла, не з'яўляюцца этнаграфічна дакладным аднаўленнем мінулага. У іх б'ецца пульс сённяшняга дня. Сучаснае прачытанне традыцый, выкарыстанне фальклору як асновы для стварэння твораў, якія расказваюць пра сучаснасць, — прынцыповы напрамак харэаграфічных пошукаў «Радасці».

Калектыў пастаянна папаўняе свой склад новымі сіламі. На змену «першаму пакаленню» прыйшлі новыя ўдзельнікі, а ў адной са школ Брэста пад кіраўніцтвам артыстаў ансамбля танцам займаюцца больш чым пяцьдзесят хлопчыкаў і дзяўчынак, — гэта будучыня «Радасці». І можна быць упэўненым, што гэтая будучыня будзе радаснай.

Юлія ЧУРКО,
доктар мастацтвазнаўства.

ТАМ, ДЗЕ ЦВІЦЕ БАГУН

Пішу пісьмо сягоння маме,
А за акном — бялюткі снег.
Цяпер у нас зіма на БАМе
Са старта узяла разбег...

Так у пачатку верасня ў адным са сваіх вершаў напісала беларуская дзяўчына нарміроўшчыца Надзея Лушчык. Сапраўды, у пачатку верасня на якуцкую зямлю, туды, дзе ў сакавіку 1975 года высадзіўся першы беларускі камсамольска-маладзёжны атрад імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі, каб пабудаваць матэрыяльна-тэхнічную базу для штурму тайгі і пракладкі чыгуначнай магістралі, так званага Малога БАМа, прыходзіць зіма. Прыходзіць не госцяй, а сапраўднай гаспадыняй. І ўжо не адступаецца, а гаспадарыць на працягу доўгіх дзевяці месяцаў. Насыпае да пояса снегу, страляе сарака- і пяцідзесяціградуснымі маразамі. Нязвыкла і няўтульна. Не тое, што ў родных мясцінах, каля Прыпяці ці каля Нёмана, дзе і ў студзені надараюцца дні з плюсавой тэмпературай, а вакол стаяць вечназялёныя бары. Тут жа, каля Станавога хрыбта, каля самай халоднай шасцідзесятай паралелі, нават лістоўніцы скідаюць на зіму свой зялёны ўбор. Учапіўшыся за камяністыя сопкі карэннем, яны асірацела стаяць, нацэліўшы ў неба свае вострыя пікі-вяршаліны.

Але, нягледзячы на снег і маразы, на самотны краявід тайгі, у вызначаны час прачынаецца пасёлак Залацінка, што асядлаў сопку непадалёк ад горнай рачулкі Халаднікан. Прачынаецца, каб прыступіць да працы, як гэта было і тры з паловай гады назад, калі яшчэ не існавала ні гэтага пасёлка з шасцітысячным насельніцтвам, ні вунь таго чыгуначнага палатна, што бярэ пачатак ад Транссібірскай магістралі на станцыі БАМ і, праразаючы тайгу, перескокваючы праз бурлівыя горныя рэчкі, нырнуўшы ў тунель пад Станавы хрыбет, бяжыць далей на поўнач, да Беркакіта, а адтуль—да вугальнага разрэзу за горадам Нерунгры і да электрастанцыі, што будуецца ў пасёлку Сярэбраны Бор. На 450 кіламетраў працягнулася гэтая стальная магістраль. І на ўсім працягу яе працавалі юнакі і дзяўчаты з першага камсамольска-маладзёжнага атрада імя Мікалая Кедышкі. Бо чыгунка —гэта не толькі палатно, гэта і пасёлкі для будаўнікоў, і станцыі, і раз'езды, і разнастайныя камунікацыйныя збудаванні. Працавалі ў трыццаціградусную летнюю спёку, калі вочы выядалі пот і надакучлівы гнус, і ў пяцідзесяціградусныя маразы, калі перахоплівала дыханне, а паплечнік сачыў, каб ты не абмарозіў твар, як і ты, у сваю чаргу, сачыў за яго тварам. І ўсё дзеля адной мэты: каб хутчэй пабудаваць чыгунку, якая б абудзіла да новага жыцця гэты суровы і неабжыты край, у нетрах якога, нібы ў кладоўцы, ляжаць разнастайныя выкапні.

Знімаюцца юнакі і дзяўчаты з наседжаных месц і едуць будаваць, тварыць, перамагаць, як некалі ў трыццатыя гады ехалі ў Камсамольск, на Турксіб, на Магнітку. Вось гэтак жа паехала на БАМ і карэнная мінчанка Вера Агафонава, каб спазнаць сябе, паспрабаваць свае сілы, пераканацца, на што на самой справе здатна. А магла ж і не ехаць. Больш таго, яе адгаворвалі не рабіць гэты крок у невядомае, ёй прарочылі бліскучую перспектыву ў будучым. Займаючыся на другім курсе стацыянара планава-эканамічнага факультэта Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава, яна была камсоргам групы, рэдактарам насценнай газеты, членам Заводскага райкома ЛКСМБ. Вучылася толькі на чатыры і пяць. І калі Вера падала заяву з просьбай перавесці яе на завочнае аддзяленне з прычыны свайго ад'езду на будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі, многія ў інстытуце здзівіліся з такога, на іх думку, неабдуманага ўчынку.

— Яно ўсё, магчыма, і так,—спакойна адказвала на гэта Вера Агафонава. — Але ж інстытут усё ж можна закончыць і завочна, а БАМ завочна не пабудуеш.

Так, ёй самой захацелася ўдзельнічаць у будоўлі веку, унесці, як у нас прынята гаварыць, у гэтую справу свой пасільны ўклад. А яшчэ ёй вельмі хацелася паглядзець, як цвіце на сопках багун, пра які гаворыцца ў песнях, як спявае зялёнае мора тайгі.

Праўда, у той сакавіцкі дзень 1975 года, калі іх атрад высадзіўся на беразе ракі Іенгры, у якую ўпадае Халаднікан, яшчэ не цвіў багун, а навокал ляжаў некрануты снег, і мароз падціскаў такі, які бывае ў родных мясцінах хіба што ў Піліпаўку. І трэба было наладжваць жытло ў вагончыках, што ў рад выстраіліся на схіле сопкі, абжыцца, агледзецца. Але аглядвацца доўга не было часу: трэба было пачынаць будаўніцтва пасёлка, ствараць матэрыяльна-тэхнічную базу будаўніча-мантажнага поезда № 578, што быў арганізаваны на базе іх камсамольска-маладзёжнага атрада імя Мікалая Кедышкі. І трэба было ўжо назаўтра пасля прыезду рашаць: заставацца тут, у будучай Залацінцы, ці ехаць у сталіцу БАМа—Тынду ў вучэбны камбінат, каб набыць будаўнічую спецыяльнасць. Яна выбрала першае і пайшла працаваць у сталовую, што часова размясцілася ў палатцы. Катлапункт быў разлічаны на дзвесце чалавек, а карміліся ўсе семсот. Усе разумелі: так трэба! Разумела гэта Вера Агафонава, разумелі яе сяброўкі Вера Варакцова, Аня Сабаткоўская, Раіса Саланевіч, Броня Зіньковіч і іншыя дзяўчаты, што ўзялі на сябе такі цяжар. Бо прыехалі сюды не толькі для таго, каб паглядзець, як цвіце багун, а прыехалі па закліку партыі, па загаду ўласных сэрцаў, каб абудзіць гэты край, выклікаць яго да новага жыцця.

На золку ішлі ў тайгу разведвальныя партыі, каб вызначыць будову грунту і напрамак, у якім пойдзе будучая сталёвая магістраль. А ўслед за імі крочылі геадэзісты на чале з мазырскай дзяўчынай Валянцінай Макеевай, каб абазначыць контуры прасекі, на якой неўзабаве ўзвысіцца насып і пралягуць рэйкі. І трэба было не толькі ісці наперад, але і вярнуцца вечарам назад, хоць на гэта часам і неставала сіл. Але вярталіся, пераадольваючы зморанасць і часовую слабасць, бо тайга і зімой, і летам не даруе тым, хто абыходзіцца з ёю па-панібрацку.

Непрыступнай крэпасцю здавалася тайга і для брыгады лесарубаў, якую ўзначаліў Аляксандр Дзідзенка. Яна, тайга, была панурай і пагражальна таямнічай. Пад ціхім подыхам ветрыку ледзь варушыліся вяршаліны лістоўніц. Адсюль, ад Партала, што ляжыць ля падножжа Станавога хрыбта, трэба было пачынаць прасеку і весці яе далей на поўнач. А з глыбіні самога Станавога хрыбта даносіліся ледзь чутныя глухія выбухі, натужны гул матораў. Гэта ўзрыўнікі і тунелебудаўнікі ламалі «карак» Станавому хрыбту, прабівалі пад ім тунель даўжынёю больш чым тысяча дзвесце метраў, праз які неўзабаве павінен будзе прайсці поезд. І каб ён мог ісці далей, неабходна і гэтая прасека, што праляжа праз тайгу, і гэты тунель, што злучыць раз'езд Партал з наступнымі будучымі станцыямі.

Яны стаялі, нібы зачараваныя суровай прыгажосцю тайгі, і не ведалі, з чаго пачынаць. Чатырнаццаць юнакоў, з якіх толькі Аляксандр Герман і Пётр Саўлевіч крыху знаёмы былі з лесараспрацоўкамі, — упершыню ўзялі ў рукі бензапілы і сякеры, каб пайсці ў наступ на тайгу. Яўген Шыран па спецыяльнасці шафёр і прыехаў сюды з Івацэвіцкага раёна. Суровая неабходнасць БАМа, дзе спецыяльнасць не выбіраюць, а набываюць, прымусіла і брастаўчаніна Валерыя Аляксеева змяніць руль машыны на сякеру. Не ўяўляў, што такое лесапавал, і Мікалай Крук. Ды і сам брыгадзір Аляксандр Дзідзенка таксама ніколі не працаваў у лесе. Сын кадравага ваеннага, ён пасля дзесяцігодкі пайшоў на мінскі завод «Калібр», а апошнія гады перад прыездам на БАМ працаваў у другім домабудаўнічым камбінаце мантажнікам і бетоншчыкам. А тут давялося пазнаваць сакрэты лесаруба.

— Пачнём, хлопцы! — падаў каманду брыгадзір.

З сякерамі ў руках наперад пайшлі Яўген Шыран і Валерый Аляксееў. Яны рабілі насечкі на дрэвах, памячалі контуры будучай прасекі. Шырыня яе раўнялася сарака метрам, а даўжыня — яны і самі не ведалі, якой яна будзе. Гэта пазней брыгада падлічыла, што прайшла больш чым сто кіламетраў, высекла чатырыста гектараў тайгі.

Ішлі наперад лесарубы, пакідаючы за сабой прасеку, шырокую і роўную, агароджаную з двух бакоў сцяной некранутай тайгі. І прасека з кожным днём пасоўвалася ўсё далей на поўнач. Менавіта тут, на прасецы, і нарадзілася ў юнакоў думка залічыць у сваю брыгаду на правах паўнапраўнага працаўніка і члена калектыву якуцкага хлопца Героя Савецкага Саюза Фёдара Папова, які аддаў сваё жыццё за вызваленне Беларусі. Ужо не чатырнаццаць, а пятнаццаць чалавек працавала ў брыгадзе, і заробак паміж імі размяркоўваўся пароўну.

А ў гэты час у другой брыгадзе, што будавала непасрэдна пасёлак Залацінку, паўнапраўным будаўнікам стаў беларускі хлопец Герой Савецкага Саюза Мікалай Кедышка.

— Гэта вельмі сімвалічна, — гаварыў з такой нагоды брыгадзір будаўнікоў Віктар Марчанка, — што два нашы аднагодкі — беларус і якут, якія аддалі сваё жыццё за вызваленне Беларусі—цяпер сустрэліся на якуцкай зямлі і разам з намі будуюць БАМ.

Так, сапраўды сімвалічна. Як сімвалічна і тое, што чыгунку, якая пракладваецца па вечнай мерзлаце якуцкай зямлі, разам з усімі прадстаўнікамі нацыянальнасцей і народнасцей нашай Радзімы, будуюць і беларускія юнакі і дзяўчаты. На працягу тых дваццаці дзён, якія мне пашчасціла правесці на БАМе, я сустракаўся і гутарыў з многімі землякамі. І неяк асабліва добра рабілася на сэрцы пасля кожнай такой сустрэчы, пасля кожнай такой гутаркі. Бо ні з адных вуснаў я не пачуў скаргі на цяжкасці, нягоды, якія, бясспрэчна, сустракаюцца на трасе.

Асабліва запомнілася гутарка з камісарам атрада імя Мікалая Кедышкі Васілём Жураўскім. Каржакаваты, з адкрытым, абветраным да чырвані тварам, ён і тут падобны на разважлівага палешука. Гаворку вядзе нетаропка, нібы ўзважваючы кожнае слова. Ён з Нараўлянскага раёна, па спецыяльнасці — тэхнікбудаўнік. Адслужыў у арміі (быў камандзірам танка), сюды прыехаў з Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода (там працаваў майстрам у арматурным цэху). Чаму пацягнула на БАМ? Вось яшчэ пытанне! Дык жа гэта ўдарная камсамольска-маладзёжная будоўля. І неяк няёмка было быць пабочным сузіральнікам, хацелася самому прайсці па некранутай тайзе, удыхнуць яе свежы водар, гукнуць ды так, каб яна ажно захісталася, расступілася і дала дарогу.

Толькі вельмі неахвотна расступалася тайга, каб даць дарогу першапраходцам. Кожны крок наперад даваўся з боем, але не адступалі хлопцы з брыгады будаўнікоў Васіля Жураўскага. Сам брыгадзір ішоў наперадзе і вёў за сабой астатніх. І калі брыгада выканала заданне на дзвесце працэнтаў, на ўвесь будаўніча-мантажны поезд тады прагучаў яе заклік:

— Даеш дзвесце пяцьдзесят працэнтаў дзённай выпрацоўкі!

Гэты заклік быў падхоплены іншымі брыгадамі поезда. І расступалася тайга, а на месцы яе вырастаў пасёлак з прыгожай назвай Залацінка. І вельмі сімвалічны той факт, што першымі паўсталі тут сад-яслі і сярэдняя школа. Пасля паявіліся сталовая, клуб «Маладосць», магазіны, жыллёвыя і адміністрацыйныя дамы.

Адсюль, з пасёлка Залацінка, адпраўляліся першыя дэсанты на трасу будучай чыгункі. Яны высаджваліся на станцыях БАМ і Тында, на раз'ездах Партал і Янкан. Тут, у Залацінцы, пазнаёмілася Зіна Кулікіна з Іванам Аляхновічам. Але здарылася так, што Зіну накіравалі на новую станцыю Беркакіт, якая знаходзіцца ад Залацінкі за 65 кіламетраў. Здавалася, сцежкі-дарожкі іх разышліся і на доўга, але не, сышліся зноў на раз'ездзе Янкан, куды яна таксама прыехала з дэсантам. Ад Янкана да Залацінкі—больш чым дзвесце кіламетраў. А менавіта там трэба было афармляць шлюб, гуляць вяселле. Над трасаю стаяла летняя якуцкая гарачыня. Таму вырашылі ехаць ноччу. Аўтобусы, увешаныя гірляндамі і галінкамі, павольна рухаліся па Амурска-Якуцкай магістралі. Сустрэчныя машыны сігналілі ім, вітаючы такім чынам вясельны картэж. Каля рэчкі Цыганкі, што працякае амаль на граніцы Амурскай вобласці і Якуцкай АССР, спынілі-ся, распалілі кастры, віталі і віншавалі маладых.

— Вось мы амаль што і дома, — сказалі яны, маючы на ўвазе сваю Залацінку, да якой заставалася каля ста кіламетраў і куды прыехалі на світанні наступнага дня. Шлюб афармлялі ўрачыста ў клубе «Маладосць», які будавалі самі ў першы год свайго прыезду. Адначасова з пасведчаннем аб шлюбе маладым уручылі ключы ад кватэры ў тым доме, які яны таксама ўзводзілі сваімі рукамі. І вяселле гулялі ў той сталовай, на будаўніцтве якой яны працавалі. І іграў на вяселлі свой, беларускі ансамбль «Спадчына», створаны тут, на БАМе. І ад усяго гэтага хораша і светла было на душы ва ўсіх, хто прыйшоў павіншаваць маладых ў гэты ўрачысты для іх дзень.

Так, на будаўніцтве магістралі веку ў асноўным працуе моладзь. І там жэняцца і выходзяць замуж. Там ствараюцца нашы новыя савецкія сем'і. Толькі ў пасёлку Залацінка, паводле падлікаў старшыні пасялковага Савета народных дэпутатаў Міхаіла Яфрэмавіча Усянкова, штогод заключаецца больш чым восемдзесят шлюбаў і нараджаецца каля ста шасцідзесяці дзяцей. І гэта вельмі радасны і абнадзейваючы факт. Бо маладыя людзі, што прыехалі сюды, не лічаць сябе часовымі, а глыбока пускаюць карэнне ў якуцкую зямлю, якая для іх становіцца блізкай і роднай.

Будуецца чыгунка Малога БАМа. Мужнеюць, загартоўваюцца на ёй юнакі і дзяўчаты, становяцца сапраўднымі будаўнікамі, сапраўднымі людзьмі. І хоць на якуцкую зямлю «ўпэўнена і смела прыйшла якуцкая зіма», як зазначае ў сваім вершы Надзея Лушчык, наступ на тайгу не прыпыняецца ні на адзін дзень.

Уладзімір ПРАВАСУД.

Будаўнікі.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ТУДЭМА — СЮДЭМА...

Георгій ЮРЧАНКА

ПАРОДЫІ

КУЗЬМА І ШТАНЫ

БАЙКА

Эдуард ВАЛАСЕВІЧ.

Кузьма Кузьміч, памначканторы,
На ранку спора ўстаў бадзёры,
Як след памыўся,
Пагаліўся,
Паснедаў згодна
з распараднам
І ў пуць пусціўся
Сцежкай гладкай.
Мінае спрытна паўдарогі.
Ды раптам зірк на ногі,—
Аслупянеў і не шманае:
То ж ён штаны забыў надзець.
А следам гурт дзяўчат ідзе,
Насустрач шмат жанок спяшае.
Кузьміч за куст сігнуў
маланкай.
Прысеў, суціўшыся, як цень.
А сцежкай той бесперастанку
Народ снаваў цалюткі дзень.
Кузьма да зор, як вінаваты,
У кусце праседзеў бузіны.

Мараль?

Калі выходзіш з хаты,
Не забывай надзець штаны.

ПОЎНАЯ ГАТОЎНАСЦЬ

«Пражыгулілі» пад сонцам
З форсам.
. . . . . .
Першы хтось нястрымна
зацымбаліў.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ.

Я жыгулюю вобак з часам,
І, прэч адкінуўшы журбу,
Я слаўлю выкасы, папасы
І пульхнай глебы харашбу.

Мне прыкры той, хто хоча
ўкрыцца,
Хто сцяўся ў суцемку, як крот;
Я ганю брыцу і макрыцу,
Пырэц, свірэпу і асот.

Агністасць дзей мяне палоніць,
І я гатовы дзень-у-дзень
Цымбаліць, гусліць і гармоніць,
Баяніць, флейціць і дудзець!

НАДЗЕЙНАЯ ЗАМЕНА

Ах, мілы конь, ах, мілы косю,
Прабач за даўні здзек. Даруй,
Што запрагаў цябе ў калёсы,
Што й сёння на табе ару.

Янка СІПАКОЎ.

Мой любы косю, мой Буланы!
Праз столькі доўгіх лет і зім
Нарэшце здзейсніліся планы:
Я замяню цябе ва ўсім.

Пачну са сціпласцю бязгрэшнай
Хадзіць зацугленым заўжды.
І будзеш ты мяне няспешна
Вадзіць у поўдзень, да вады

Падпуззе цяж не будзе церці,
Шляю дакладна падганю,
Перараблю да плеч па мерцы
Хамут не ўдоўж, а ў шырыню.

Нідзе ў мажары не прыстану,
Паўнютні кніжны воз скрану:
Не горш цябе цягаць я стану
Акучнік, плуг і барану.

Даўно люляю меркаванне,
Як наймацней сцягнуць дугу...
З адным бяда:
Твайго іржання
Ніяк спасцігнуць не магу.

«ПАКРЫТЫКАВАЎ»

Піліп яшчэ да сходу
Прапанову ўнёс такую:
— За чэрствасць,
Я дырэктара пакрытыкую.
— А вы таксама
Ў кулакі не пазяхайце.
Мяне ўсім аддзелам
Падтрымайце.
На сходзе
Як вады набраў у рот Піліп.
— Ты, што ж, Піліп, маўчаў?
— Ды я, сябры, ...ахрып,

У. МАЦВЕЕНКА.

КАБ НЕ ПАЗНАЛІ

— Чаму гэта ты, Сямён, стаў па вуліцы без шапкі хадзіць?

— А каб людзі не пазналі, што я злодзей: на мне ж шапка будзе гарэць.

Пятро ПЕРАЦ.

Аляксей КУР'ЯН

АГНЯВАЯ ПАЭМА

Раннія птушкі бываюць і ў літаратуры. Як сведчаць уніклівыя крытыкі, адзін беларускі паэт напісаў сваю першую паэму ў дваццацігадовым узросце. Другі зрабіў тое ж самае ў васемнаццаць год. А я нават побач з імі выглядаю скараспелкаю: мне ўдалося напісаць паэму на адзінаццатым годзе майго жыцця.

Было гэта так. Аднойчы нам, вучням чацвёртага класа, настаўнік загадаў напісаць сачыненне на тэму: «Наш родны край». Праз некалькі дзён мае аднакласнікі прынеслі ў школу па дзве-тры старонкі худасочнай прозы, а я нашпарыў цэлую паэму, якая ледзь умясцілася ў вучнёўскім сшытку.

Праўда, гэты твор мне даўся нялёгка. Пісаў я сваю паэму па начах, калі ўсе клаліся спаць. Падбольшыўшы ў лямпе агонь, я браўся за пяро і, бывала, заседжваўся да першых пеўняў. А ўжо раніцай праз сон чуў, як мой бацька скардзіўся на мяне суседу:

— Ведаеш, Анцік, проста бяда мне з гэтым смаркатым паэтам. Вайна толькі што скончылася, газы нідзе не дастаць, а ён цэлую ноч сядзіць, лямпу не тушыць. Усё вершыкі складае. Пнецца нават нейкую паэму напісаць... А газа, як ні круці, патрэбна. І не толькі ў лямпу. Дровы ў мяне сырыя, дык і ў печ газы пырснуць трэба сядытады.

Нельга аднак думаць, што мой бацька поўнасцю адмаўляў народнагаспадарчае значэнне маёй ранняй паэзіі. Пабедаваўшы трохі, ён, помніцца, сказаў таму самаму суседу Анціку:

— Але ж нічога: ліха перамелецца — дабро наступіць. От скрэмзае мой паэт увесь сшытак, то хоць будзе чым дровы ў печы падпаліць.

А ў школе маю паэму прызналі шэдэўрам. Асабліва спадабаліся ўсім аднакласнікам заключныя радкі гэтага самабытнага твора, адрасаваныя падпальшчыкам вайны:

Не храбрыся злы агрэсар,
А то схопіш гуза!
Суньсь толькі, дык улупім
Гарбузом у пуза!

Настаўнік паставіў мне за паэму пяцёрку. Дачуўшыся пра гэта, пахваліў мяне і бацька. П'яны ад шчасця, я доўга не знаходзіў сабе месца, але нарэшце набегаўся, нарадаваўся, стаміўся і лёг спаць.

А назаўтра раніцай мяне разбудзілі стрэлы. Ад зыркага агню стралялі дровы ў печы. Я здзівіўся, бо ведаў, што газы на распалку ў нас не было. І тут мне цюкнула нешта ў галаву. Я саскочыў з ложка і кінуўся да стала. Перавярнуў усе кніжкі і сшыткі, але паэмы нідзе не знайшоў. Тады я ў адчаі рынуўся да печы і ўбачыў на прыпеку толькі апошнюю старонку свайго выдатнага твора. А неўзабаве бясследна знікла і яна.

І усё ж, можна смела сцвярджаць, што мая агнявая паэма (агнявая і ў прамым, і ў пераносным сэнсе) мела не толькі народнагаспадарчае, але і выхаваўчае значэнне. Я стаў кавалём.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК

. . . . . .

— Пакуль гатуюць шніцэль, паглядзіце, калі ласка, «У свеце жывёл».

Апошнія кроплі натхнення.

Асенні матыў.

Мал. А. ЧУРКІНА.

Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ

МЕТАМАРФОЗЫ

●

Як жаніўся,
не схлушу
І напалавіну я —
Ты ўсялілася ў душу
Песняй салаўінаю.

Закранула ты спярша
Струны сама тонкія,
І азвалася душа
Песняй дзіўнай, звонкаю.

Час мінуў —
ты салаўя
Заглушыла сваркамі:
І цяпер душа мая
Не пяе, а каркае.

●

Свету бачачы канец,
Піў віно святы айцец.
Раз, махаючы кадзілам,
Поп трымаў прамову:
— П'ю я, людзі, не «чарніла»,
П'ю я кроў Хрыстову.
Хтосьці крыкнуў:
— Небарака,
Быў папом
стаў вурдалакам.

●

Гаварыла баба дзеду:
— Ад цябе у пекла з'еду...
Дзед як скокне ўвішна:
— Ёсць білецік лішні!

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

АВАНТУРЫСТ — турыст з авансам у кішэні.
БАРАДАЧ — аматар бара і дачы.
ВІКТАРЫНА — Віктарава жонка.
ГАРЛАЧ — оперны артыст.
ЗЛОДЗЕЙ — тварэц зла.
ЛЯЖАК — гультай.
ФАСОН — фальшывы сон.

М. ШУЛЬГА.

ФРАЗЫ

На шляху найменшага супраціўлення буксуе і кола фартуны.

●

Сапраўдны настаўнік — усё жыццё старанны вучань.

●

Рака часу бяздонная. Ёй не суджана абмялець.

●

У школе жыцця экзамены здаюць кожны дзень.

Р. РУМКО.

НЯМА ЧАСУ

—Пецечка, паганяў бы мяч хоць з гадзінку, — завіхаючыся на кухні, паспачувала маці свайму сямігадоваму сыну.

— Няма часу, мамачка, — запратэставаў той і зноў схіліўся над кніжкай «Займальная матэматыка».

...Мінула дзесяць гадоў. У новай трохпакаёвай кватэры сядзіць задуменны Пеця. Да яго падыходзіць малодшы брат і заклапочана пытае:

— Табе падабаюцца апавяданні Міколы Пагарэльскага?

— Няма часу чытаць мне. З татам парайся.

...Да Пеці звяртаюцца па бацьку. І наогул, ён паважаны чалавек, працуе ў лабараторыі.

— Пётр Сямёнавіч, ёсць пуцёўка ў Прыбалтыку. Пападарожнічаеце?

— Калі-небудзь потым. Цяпер няма часу.

...Сівізна пакрывае галаву Пятра Сямёнавіча. Але і цяпер ён не можа ніяк адарвацца ад лагарыфмічнай лінейкі. Надзея Сяргееўна, яго жонка, нясмела звяртаецца:

— Білеты ёсць у цырк. Можа, пойдзем?

— У другі раз. Сёння няма часу.

...Пётр Сямёнавіч ужо на заслужаным адпачынку. Можна, нарэшце, спакойна на ўсё паглядзець сваімі вачамі. Вось ён сядзіць непадалёку ад дзесяцігадовага ўнука, які з пялёнак вырашыў стаць біёлагам.

— Васілёк, завадзіў бы ты мяне ў бліжэйшы кінатэатр.

— Няма часу займацца непатрэбнымі справамі, дзядуля.

Акуляры, якія ўсё больш спаўзалі на нос Пятра Сямёнавіча, раптам сарваліся, упалі на зямлю і разбіліся.

Г. СІДАРОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 12345678910 12345678910 АТ 23527

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.